Беларускае гістарычнае таварыства

48

Беларускі гістарычны зборнік

Беласток 2017

Białoruskie Towarzystwo Historyczne



Skład: Adam Pawłowski
Korekta: Witalis Łuba
Wydawca: Białoruskie Towarzystwo Historyczne
Adres redakcji: 15-449 Białystok, ul. Proletariacka 11, tel. 85 744 61 11
E-mail: ebma@interia.pl
Strona internetowa: http://bzh.kamunikat.org
Nakład: 500 egz.

Zrealizowano:
- dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji,
- przy wsparciu finansowym Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego w Białymstoku,
- przy pomocy finansowej Prezydenta Miasta Biełegostoku







Na okładce (I strona): Fragment kufra hetmana Wielkiego Księstwa Litewskiego Michała Kazimierza Paca, (IV strona): Herb rodu Radziwiłów

Spis treści

artykuły

materiały źródłowe

artykuły recenzyjne

Contents

reviews

(see table of contents in Polish)

Зміцер Дрозд
(Мінск)

Цяжар канчатковай вывучанасці альбо Новыя факты да 210-годдзя самага вывучанага беларускага класіка

4 лютага 2018 года споўніцца 210 гадоў з дня нараджэння чалавека, чый уплыў на фармаванне беларускай нацыі складана пераацаніць. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч — асоба, шчодра ўзнагароджаная талентамі: ён і першы прафесійны беларускі паэт, і перакладчык, і драматург, і актор... Ёсць згадкі яго музычных і нават кампазітарскіх здольнасцей. А таксама ў нас ёсць усе падставы казаць аб яго пэўных мастацкіх навыках. Праўда, звязаныя яны з яшчэ адным талентам нашага генія — крымінальным.

Шмат гадоў доўжыліся справы па абвінавачванні Вінцэнта Марцінкевіча ў падробцы дакументаў, неабходных для доказу дваранскага паходжання розных прозвішчаў[1]. Трэба адзначыць, што пераважная большасць з тых, хто звяртаўся за падобнымі паслугамі, мелі гэтае званне ў часы Вялікага Княства Літоўскага, карысталіся правамі і свабодамі, але не маглі з-за розных прычын — у тым ліку і неразвітасці архіўнай справы, гібелі падчас войнаў і пажараў цэлых архіўных фондаў (напрыклад, архіваў Галоўнага Трыбунала ВКЛ Мінскай кадэнцыі, Браслаўскага і Ашмянскага павятовых судоў) знайсці патрэбныя паперы. Падобная гісторыя была і ў самога Вінцэнта, дваранскае паходжанне чыіх продкаў не выклікае ніякага сумневу, але для большай самавітасці, ён, падобна, усё ж такі, сфальсіфікаваў свой сямейны радавод, прыдумаўшы для свайго прозвішча прыдомак «Дунін-», які надаваў большае гучанне і старажытнасць. Таксама гэтая паслуга была патрэбна тым сялянам, што валодалі пэўнымі матэрыяльнымі магчымасцямі, і хто карыстаўся ў часы ВКЛ пэўнымі свабодамі, а пасля далучэння да Расійскай імперыі былі запісаны ў прыгонныя, стаўшы ўласнасцю памешчыкаў. Складанне падобных радаводаў патрабавала

[1] Падрабязней глядзі: З. Дрозд, *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і падробка пячатак*, «Наша Ніва», № 44 (881), 26.11.2014, с. 14; ён жа, *Навошта Марцінкевічу спатрэбіўся Дунін*, «Наша Ніва», № 16 (949), 27.04.2016, с. 12, 13; ён жа, «*Марцінкевіч ходзіць, а па ім звон звоніць»: гісторыя з прыжыццёвым пахаваннем пісьменніка — не анекдот*, «Наша Ніва», 07.06. 2015, электроны рэсурс: http://nn.by/?c=ar&i=150266.

не толькі гістарычных ведаў, уменне пісаць розныя дакументы розных часоў рознымі почыркамі і мовамі на адпаведнай эпосе паперы, але і пэўнай фантазіі. Асаблівай цікавасцю для нас можа быць і тое, што, па сцвярджэнні некаторых сведак, малады Вінцэнт Марцінкевіч сам вырабляў пячаткі розных установаў і нават каралеўскія. Вядома, без пэўных навыкаў малявання і нават разьбы гэта наўрад ці было б магчыма.

Трэба аддаць належнае і своеасабліваму юрыдычнаму таленту Марцінкевіча, бо, нягледзячы на шматлікія спробы асудзіць яго, і нават знаходжанне яго пад арыштамі: хатнім, на гарадской гаўптвахце і нават у Мінскім турэмным замку, а нейкі час яму давялося правесці «ў бегах», усе спробы асудзіць яго на нейкі сур'ёзны тэрмін, скончыліся нічым. Максімум чаго ўдалося дамагчыся ўладам, гэта «пакінуць яго ў вялікім падазрэнні» і ўсталяваць за ім паліцэйскі нагляд. Для часу, калі па этапах у Сібір адпраўляліся тысячы чалавек (у тым ліку і яго дачка Каміла), гэта не так ужо і дрэнна.

Падрабязна пра крымінальныя прыгоды будучага класіка аўтар плануе напісаць у асобнай кнізе «Падроблена Марцінкевічам», выхад якой запланаваны ў юбілейным 2018 годзе. Але ўжо зараз можна сцвярджаць, што першыя праблемы з законам у маладога Вінцэнта Марцінкевіча, тады яшчэ не ўжываючага прыдомак «Дунін-», паўсталі яшчэ ў 1829 годзе, праўда, тады толькі як у сведкі ў крымінальнай справе аб падробцы тастамента. А аднымі з апошніх вядомых нам дакументаў аб ужо вядомым паэце Дуніне-Марцінкевічы з'яўляюцца яго прашэнні ў 1870-х гадах, калі ўжо „дряхлый 63-летний старец[2]" (як пісаў ён сам), спрабаваў вызваліцца ад устаноўленага за ім па палітычных матывах паліцэйскага нагляду і атрымаць дазвол на патрэбныя па асабістых справах перасоўванні па імперыі. Аднак такія былі часы, што з усімі гэтымі прыгодамі і непрыемнасцямі наш класік толькі ўпісваецца ў нейкую агульную тэндэнцыю, бо праблемы з імперскімі ўладамі па тых ці іншых прычынах мелі і Адам Міцкевіч, і Аляксандр Пушкін, а таксама дзясяткі іншых вядомых творцаў, што больш шырока разумелі свабоду, чым гэта дазваляла кіраўніцтва Расійскай імперыі.

Надыходзячы юбілей нашай знакамітасці — гэта не толькі падстава для ўрачыстасці, але і выдатная прычына правесці інвентарызацыю нашых старых ведаў, нават тых, што ўжо сталі энцыклапедыч-

[2] *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы пра класіка беларускай літаратуры XIX ст. Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*, уклад., падрыхт. тэкстаў, пер. і камент. Г. Кісялёва; навук. рэд. А. І. Мальдзіс, В. А. Чамярыцкі, Мінск 2010, с. 276.

нымі, бо частку з іх прыйдзецца раз і назаўжды спісаць на „сметнік гісторыі”. Гэта таксама магчымасць увесці ў навуковы абарот новыя веды, заснаваныя на апошніх архіўных адкрыццях.

1

На фоне імклівага развіцця нашых ведаў у галінах фізікі, хіміі, электронікі, генетыкі і іншых навук гісторыя літаратуры, падчас, уяўляецца некалькі замарожанай, амаль такой жа, як матэматыка, дзе ўжо нічога новага адкрыць практычна немагчыма. І большасць звестак, якія трапілі ў энцыклапедыі ці падручнікі беларускай літаратуры, застаюцца там надоўга, калі не назаўсёды. Змены апошніх дзесяцігоддзяў больш звязаны з пераменамі ў палітычным жыцці краіны (напрыклад, з крушэннем савецкай ідэалогіі), чым з нейкімі новымі адкрыццямі. Безумоўна, даследчы працэс не стаіць на месцы: дзясяткі літаратуразнаўчых артыкулаў пішуцца кожны месяц. Але, калі мы паглядзім, напрыклад, зборнік артыкулаў па матэрыялах канферэнцыі, прысвечанай 200-годдзю нашага першага прафесійнага літаратара Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча[3], то мы ўбачым, што практычна сто працэнтаў артыкулаў — гэта даследаванні саміх тэкстаў (усе амаль 50 артыкулаў гэта „духоўны ідэал і мастацкая культура”, „ідэя братэрства”, „філасофія сацыяльнай гармоніі ў творчасці”, „паэтыка”, „паэтычны эпас”, „вобразны змест” і т.п.), але не новыя даследаванні біяграфіі класіка. Няўжо, у самім жыцці Дуніна-Марцінкевіча не засталося ніякіх загадак? Чаму даследчыкі не бяруцца за такія тэмы?

У нейкай ступені, як гэта нам уяўляецца, гэта вынік некаторай устаноўкі, што ў пытаннях біяграфій падобных зорак беларускага літаратурнага небасхілу (натуральна, тут гаворка не толькі пра Дуніна-Марцінкевіча, але няўжо хтосьці рызыкне шукаць нешта новае ў біяграфіях такіх сусветных зорак, як, напрыклад, нашы суайчыннікі Адам Міцкевіч альбо Станіслаў Манюшка?) пасля дзесяцігоддзяў дзейнасці аўтарытэтных беларускіх гісторыкаў літаратуры ўсе адказы ўжо знойдзеныя, а тыя, што не знойдзеныя, шукаць бессэнсоўна — іх няма. І, на самой справе, спіс беларускіх даследчыкаў толькі першай зорнай велічыні, хто з рознай ступенню пагружэння ў тэму вывучаў біяграфію Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ўражвае: Генадзь Кісялёў, Язэп Янушкевіч, Уладзімір Дзянісаў, Валерый Пазднякоў,

[3] *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у еўрапейскім кантэксце. Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 200-годдзю Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (Мінск, 5—6 лютага 2008 г.),* нав. рэд. В. А. Максімовіч, Мінск 2008, 295 с.

Уладзімір Ліпскі, Адам Мальдзіс, Уладзімір Содаль, Іван Навуменка і інш. Але і зараз гэта справа робіцца на самым высокім узроўні. Так, значнымі падзеямі апошніх гадоў акрамя святкавання 200-годдзя Дуніна-Марцінкевіча сталі выхады зборнікаў дакументаў: выдадзеныя Беларускім навукова-даследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы (абрэвіятура: БелНДІДАС) *Невядомы Дунін-Марцінкевіч: дакументы да біяграфіі з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі*[4], *Марцінкевіч герба Лебедзь: дакументы і матэрыялы пра класіка беларускай літаратуры XIX ст. Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*[5], у якіх упершыню апублікаваны многія дакументы, а таксама выпуск DVD-дыска *Жыве паміж намі дудар наш ...*[6]. Зрэдку з'яўляюцца і абсалютна новыя даныя, заснаваныя на архіўных знаходках[7], у тым ліку і аўтара гэтага артыкула[8].

Між тым, у біяграфіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, асабліва ранняй, застаецца нямала белых плям. У першую чаргу гэта тычыцца жыцця яго бацькоў: невядомы ні час нараджэння, ні час смерці ні бацькі, ні маці (ёсць дзве здагадкі Я. Янушкевіча, але абедзве, як сёння можа сцвярджаць аўтар, няслушныя), тое ж самае з месцамі іх

4 *Невядомы Дунін-Марцінкевіч: дакументы да біяграфіі з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі*, складальнікі: У. М. Дзянісаў, В. С. Пазднякоў, Я. Я. Янушкевіч; рэдкалегія: У. І. Адамушка, А. К. Галубовіч, А. Я. Рыбакоў, Мінск 2011, 203 с.

5 *Марцінкевіч герба Лебедзь: дакументы і матэрыялы пра класіка беларускай літаратуры XIX ст. Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*, укладанне, прадмова, падрыхтоўка тэкстаў, пераклады і каментарыі Г. Кісялёва; навуковыя рэдактары: А. І. Мальдзіс, В. А. Чамярыцкі, Мінск 2010, 471 с.

6 «*Жыве паміж намі дудар наш...»: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808—1884)*, складальнікі: В. А. Грынкевіч [і інш.]; рэдактар Л. В. Гарбачова, Мінск 2008-1 электронны аптычны дыск (DVD-ROM).

7 Напрыклад, В. С. Пазднякоў, „Вікенцій Дунін-Марцінкевіч супраць жандара Ламачэўскага (старонка з гісторыі беларускага справаводства і архіўнай справы)” — даклад на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения: ретроспектива и современность», якая адбылася ў Мінску 2-3 снежня 2015 г.

8 З. Дрозд, *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і падробка пячатак*, «Наша Ніва», № 44 (881), 26.11.2014, с. 14; ён жа, *Неверагодная гісторыя шлюбу Вінцэнта Марцінкевіча*, «Наша Ніва», № 26 (911), 15.07.2015, с. 13; ён жа, *Навошта Марцінкевічу спатрэбіўся Дунін*, «Наша Ніва», № 16 (949), 27.04.2016, с. 12, 13; ён жа, «*Марцінкевіч ходзіць, а па ім звон звоніць»: гісторыя з прыжыццёвым пахаваннем пісьменніка — не анекдот*, «Наша Ніва», 07.06. 2015, электронны рэсурс: http://nn.by/?c=ar&i=150266; ён жа, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Лёсы сясцёр класіка літаратуры*, «Культура», № 46, 12.11.2016, с. 14, працяг: № 47, 19.11.2016, с. 15.

нараджэння і смерці. Вельмі мала вядома аб іх жыцці да нараджэння сына Вінцэнта і пасля. Невядомы лёс яго сясцёр Алены і Юліі[9], а пра Францішку так увогуле ніхто не пісаў. Невядомыя падрабязнасці знаходжання будучага класіка ў Санкт-Пецярбургу і месца яго навучання. Невядомыя прычыны яго прыезду на пастаяннае месца жыхарства менавіта ў Мінск. Слаба вывучана яго службовая кар'ера. Не да канца вывучана ягоная крымінальная гісторыя са шматлікімі абвінавачваннямі ў падробцы дваранскіх дакументаў. Ніхто не правёў навуковага аналізу прадстаўленага самім Вінцэнтам дваранскага вываду роду Дуніных-Марцінкевічаў (хоць ні ў адным з вядомых даследчыкам ранніх дакументаў аж да самага 1832 года ніводны раз ні сам Вінцэнт і ніхто з яго радні не выкарыстоўваў прыдомак «Дунін-»).

Яшчэ горш справа выглядае са звесткамі, якія ўжо трапілі ў кнігі, энцыклапедыі або падручнікі — яны наогул не падвяргаюцца ніякай рэвізіі або нават крытычнай ацэнцы. Сёння мы ўжо можам сцвярджаць, што многія з тых фактаў, што сталі аксіёмамі, хутка будуць перапісаныя. Тычыцца гэта і такіх асноватворных энцыклапедычных догм, што «радавод роду Дуніна-Марцінкевіча добра вывучаны», «бацькі — бедныя арандатары маёнтка Панюшкавічы» (чамусьці ніхто нават не запытаўся: як можа быць арандатар цэлага маёнтка, які складаўся з некалькіх вёсак, якія налічвалі 160 двароў і больш за 1000 прыгонных душ абодвух полаў, быць бедным?), «Вінцэнт з дзяцінства стаў сіратой»... Побач з імі мы паставім і сцвярджэнне сучаснага падручніка беларускай літаратуры: „...у 1826 годзе памёр **дзядзька** С. Богуш-Сестранцэвіч, мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх касцёлаў Расійскай імперыі, які апекаваў Вінцэнта"[10]. А сапраўды, ці быў Сестранцэвіч дзядзькам Вінцэнту?

Для прыкладу разгледзім падрабязна фарміраванне нашых ведаў у адказе на гэтае пытанне, якое да сённяшняга часу так і не мела адказу, а потым тэзісна (так як поўны выклад новых фактаў з новымі арыгінальнымі архіўнымі дакументамі зойме не адну кнігу) выкажам новыя факты да біяграфіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

[9] Пытанне вырашана толькі зараз, глядзі: З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Лёсы сясцёр класіка літаратуры*, «Культура», № 46, 12.11.2016, с. 14, працяг: № 47, 19.11.2016, с. 15.

[10] *Беларуская літаратура. Вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларуская і рускай мовамі навучання*, рэд. В. П. Рагойша, Мінск 2011, с. 125-126.

2

Адказ на гэта пытанне можа праліць святло на раннюю біяграфію сям'і Марцінкевічаў, бо менавіта Станіславу Богушу-Сестранцэвічу (з польскай мовы было б правільней прамаўляць прозвішча Siestrzeńcewicz як Сестжаньцэвіч, але звычайна выкарыстоўваецца варыянт Сестранцэвіч) пажыццёва належаў маёнтак Панюшкавічы Бабруйскага павета Мінскай губерні, у якім Ян Марцінкевіч са сваёй другой жонкай Марцыянай апынуўся ў 1808 годзе, і дзе нарадзіўся іх сын Вінцэнт. Аб беларускім біскупе, мітрапаліце напісана шмат, і часта пісалі пра яго менавіта ў сувязі з Вінцэнтам Марцінкевічам. Так, у эсэ «На свой хлеб» адзін з самых верных і пладавітых даследчыкаў біяграфіі і творчасці першага беларускага прафесійнага літаратара Язэп Янушкевіч прысвяціў мітрапаліту некалькі раздзелаў: «На ласкавым хлебе», «Кардынал і мітрапаліт» і «Шчаслівыя ўспаміны». Згадка гэтай роднаснай сувязі мае даўнюю традыцыю і з'явілася ў самых першых біяграфіях Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, але да гэтага дня яна так і не знайшла рэальных адказаў: кім жа прыходзіўся мітрапаліт беларускаму класіку?

Першы мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх цэркваў у Расіі Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч (3.09.1731—1.12.1826) — адна з самых значных і неардынарных асоб свайго часу. Яго біяграфія ўжо даволі добра вядома гісторыкам, некаторыя з якіх ацэньваюць яго ролю з цалкам супрацьлеглымі знакамі. Але, безумоўна, даследчыкі яшчэ не раз будуць вяртацца да вывучэння гэтай шматграннай і супярэчлівай асобы. Доказам таго можа быць тое, што і зараз даследаванні жыцця і дзейнасці Станіслава Богуша-Сестранцэвіча працягваюцца беларускімі навукоўцамі[11], а адначасова да гэтай асобы звяртаюцца і ў папулярных артыкулах беларускія пісьменнікі[12].

Са свайго даволі працяглага жыцця больш за 50 год Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч стаяў на чале адной з самых вялікіх па тэрыторыі цэркваў у свеце, што сведчыць аб яго незвычайным розуме, здольным тонка адчуваць усе падводныя плыні на самых вярхах улады велізарнай імперыі. Да таго ж, як ён канчаткова знайшоў свой шлях,

[11] Напрыклад, зусім нядаўна ў Гродне пабачыла свет манаграфія М. А. Папова і А. І. Ганчара, *Митрополит С. Богуш-Сестренцевич: формирование правительственной политики по отношению к Римско-католической церкви на белорусских землях (конец XVIII — первая четверть XIX в.)*, Гродно 2012, 278 с.

[12] Л. Рублевская, *Сюжет, достойный Дюма*, „Советская Белоруссия", № 167 (25049), 1.09.2016, электронны рэсурс: http://www.sb.by/kultura/article/syuzhet-dostoynyy-dyuma.html.

яго жыццё было напоўнена мноствам нечаканых паваротаў: ён быў ахрышчаны як кальвініст, а потым перайшоў у каталіцтва, вучыўся ў лепшых універсітэтах Еўропы, потым — прысвяціў жыццё ваеннай службе, а пасля — стаў святаром. Сваімі талентамі Сестранцэвіч звярнуў на сябе ўвагу імператрыцы Кацярыны II і выслужыў вышэйшую пасаду ў Каталіцкай царкве Расійскай імперыі. Але, нават займаючы гэты духоўны пост, ён заставаўся чалавекам вельмі шырокіх інтарэсаў: займаўся літаратурнай і навукова-даследчай дзейнасцю, і ў яго тастаменце названыя такія неўласцівыя для святара прадметы як компас, мікраскоп, глобусы, астралябія, камера-абскура і бібліятэка з 3 тысяч кніг[13]. Але, вядома, галоўнай яго мэтай была спроба хоць неяк захаваць інтарэсы каталікоў, якія ў Расійскай імперыі, у асноўным праваслаўнай, мусульманскай і іудзейскай, у шматлікіх рэгіёнах заставаліся ў меншасці. Свой высокі пост, а паралельна і некаторыя іншыя высокія пасады Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч займаў да самой сваёй смерці 1 снежня 1826 года.

Першыя біёграфы Вікенція Дуніна-Марцінкевіча (Аляксандр Ельскі[14], Рамуальд Зямкевіч[15]), а за імі і сучасныя даследчыкі (Г. Кісялёў[16], Я. Янушкевіч[17], А. Мальдзіс[18], У. Ліпскі[19] і інш.) прыводзяць розныя яго ступені сваяцтва з Богушам-Сестранцэвічам: „дзядзька", „сваяк", „блізкі сваяк Марцыяны Нядзвецкай", „дваюрадны дзед", „дзядзька-біскуп", „сваяк па маці", „сваяцтва ішло «па мячу»" і г.д. Упершыню ж пра сувязь Марцінкевіча з Санкт-Пецярбургам, дзе знаходзілася рэзідэнцыя мітрапаліта, і непасрэдна пра сваяцтва з самім Сестранцэвічам згадаў ужо адразу пасля смерці Вінцэнта ў некралогу, надрукаваным 10 (22).03.1885 г. у нумары 10 польскай газеты

13 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: НГАБ), фонд 1781, вопіс 2, справа 338: «Аб духоўным тастаменце Мітрапаліта Сестранцэвіча», арк. 5-8 ад.

14 *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы*, с. 316.

15 Г. В. Кісялёў, *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў*, Мінск 1988, с. 95.

16 Г. В. Кісялёў, *Ад Чачота да Багушэвіча: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст.*, навук. рэд. В. А. Чамярыцкі, 2-е выд, Мінск 2003, с. 242; *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы*, с. 4.

17 Я. Я. Янушкевіч, *Зямля кенатафаў. Апавяданні, артыкулы, эсэ*, Мінск 2009, с. 25, 26, 29; ён жа, *Жыццяпіс Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў кантэксце нацыянальнай гісторыі XIX стагоддзя*, [у:] В. Дунін-Марцінкевіч, *Збор твораў. У 2 тамах*, т. 2: *Вершаваныя аповесці і апавяданні, вершы, публіцыстыка, лісты і пасланні, пераклады, dubia*, Мінск 2008, с. 556.

18 А. І. Мальдзіс, *На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII — XVIII ст.)*, Мінск 1980, с. 259.

19 У. Я. Ліпскі, *Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод*, Мінск 1998, с. 75, 76.

«Kraj», асабіста ведаўшы яго аўтарытэтны беларускі энцыклапедыст і першы біёграф Марцінкевіча Аляксандр Ельскі:

«Нарадзіўшыся ў 1807 г. у Бабруйскім павеце, у фальварку Панюшкавічы над Бярэзінай, Марцінкевіч наведваў школу ў Бабруйску, якую скончыў у 1826 г. У Пецярбургскім універсітэце, на медыцынскім факультэце, заставаўся толькі да 1828 г.; вярнуўся адтуль у родную старонку і атрымаў урадавую пасаду ў рымска-каталіцкай кансісторыі ў Мінску. Блізкія яго (бацька Ян і матка з роду Валчацкіх) зямельнай уласнасці не мелі, кіравалі маёнткам **сваяка** (у арыгінале: **krewnego swego**[20]), мітрапаліта Сестранцэвіча. Рэдкі ва ўмовах тагачаснага нашага грамадства прыклад працавітасці і нават самаахвярнасці паказаў юнак, звязаны **сваяцтвам** (у арыгінале: «skoligacony»[21], што можна перакласці як «звязаны сямейнымі адносінамі праз шлюб») з такімі высокімі асобамі, калі, застаючыся на ўрадавай службе, выступіў адначасова на сцэне мінскага тэатра»[22].

Многія звесткі (год нараджэння, зрэшты, як і ўсе прыведзеныя ў гэтай цытаце даты, прозвішча маці...) з гэтай біяграфіі на сённяшні дзень страцілі сваю актуальнасць, што толькі падкрэслівае неабходнасць крытычнага падыходу да крыніц, у тым ліку такіх, здавалася б, надзейных, як успаміны блізкіх і сяброў. І, хоць аўтарытэт Ельскага быў высокі, але менавіта пошук новай інфармацыі (як самім Ельскім, так і іншымі даследчыкамі) дазволіў выправіць шматлікія памылкі. І хоць гэтая біяграфія, а таксама тая, што не дайшла да нас, але якой шырока карысталіся паслядоўнікі Ельскага, Рамуальд Зямкевіч і Юзаф Галомбак, біяграфія 1909 года „Успамінак аб Вінцэнтым Дуніне-Марцінкевічу, беларускам пісацеле і аўтаре" на 24 старонках, ляглі ў аснову будучых біяграфій Вінцэнта Марцінкевіча, шматлікія падрабязнасці з яго жыцця ўдакладняліся (ці, наадварот, заблытваліся) новымі біёграфамі.

Так, у № 35 за 1895 год газеты „Мінскі лісток" з'явіўся артыкул Аляксандра Слупскага *Стары Менск*, дзе былі каштоўныя новыя даныя, якія паводле яго слоў ён атрымаў ад дачок Марцінкевіча: „Нарадзіўся ён у 1807 годзе ў фальварку Панюшкавічах, ранняе дзяцінства правёў у маёнтку бацькоў пад наглядам сваёй маці Марыяны родам Нядзвецкай. Затым аддадзены ў Віленскую Калегію базыльянаў, дзе выхоўваўся пад пільным наглядам і кіраўніцтвам Віленскага біску-

[20] Цытуецца па: *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы*, с. 316.
[21] Там жа.
[22] Там жа, с. 319.

па, свайго сваяка”[23]. Адзначым тут важныя адрозненні: названы імя і прозвішча маці Вінцэнта: Марыяна з Нядзвецкіх, а таксама зусім іншая навучальная ўстанова. Але Слупскі называе Панюшкавічы маёнткам Марцінкевічаў, што не так.

Найбольш блізкая версія ў гэтым пытанні была як раз у Ельскага: бацькі Вінцэнта не валодалі і не арандавалі, а менавіта ўпраўлялі нейкі час, а яшчэ дакладней, Ян Марцінкевіч па даверанасці ад мітрапаліта вырашаў некаторыя фінансавыя пытанні пасля апошняга арандатара гэтага маёнтка[24], але менавіта варыянт „арандатар” трапіў у энцыклапедыі і падручнікі[25], значна ўскладніўшы пошук новай інфармацыі, бо ўсё папярэдняе жыццё Марцінкевічаў ніяк не было звязана ні з Панюшкавічамі, ні нават з Бабруйскім паветам. Зараз мы можам дакладна сцвярджаць, што яшчэ 9 лютага 1806 года сям'я Марцінкевічаў ахрысціла сваю дачку Гелену-Анну ў касцёле[26] ў Слуцку, і папярэдняе іх жыццё было працяглы час звязана менавіта са Случчынай. Менавіта там брат Яна, Ігнат, з 23 красавіка 1793 года арандаваў вялікі радзівілаўскі маёнтак Старчыцы ў застаўнага гаспадара Міхала Лопата — былога мечніка Вялікага Княства Літоўскага[27]. Арэнда маёнтка з некалькіх вёсак і больш чым 300 мужчынскімі рэвізскімі душамі каштавала некалькі дзясяткаў польскіх злотых, што наўрад ці можна назваць „збяднелай шляхтай”.

Практычна без змен гэтая інфармацыя перавандравала ў біяграфіі XX стагоддзя. Так у 1920-х гадах Рамуальд Зямкевіч у газеце «Беларусь» у артыкуле *Стары Менск у беларускіх успамінах* пісаў: «Радзіўся ён у 1807 годзе ў фальварку Панюшкевічах; маладыя гады пражыў пад пільным даглядам сваёй маткі Марыянны родам Нядзведскай. Затым быў аддадзены ў Віленскую калегію базыльянаў, гдзе і выхоўваўся пад старанным даглядам віленскага біскупа, які, будучы **сваяком** Марцінкевіча, горача займаўся яго выхаваннем»[28]. Як адзначыў

23 Цытуецца па: Г. В. Кісялёў, *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча*, с. 89-90.

24 З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча: Ян Марцінкевіч: загадкі пра бацьку класіка*, «Культура», № 5, 5.02.2017, с. 14; № 7, 18.02.2017, с. 15.

25 „Нарадзіўшыся 4 лютага 1808 года ў фальварку Панюшкавічы Бабруйскага павета ў сям'і збяднелага шляхціца-арандатара...”, *Беларуская літаратура. Вучэбны дапаможнік для 9 класа*, с. 125.

26 Метрыка гэтага хросту, як і іншыя, надрукаваны: З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Лёсы сясцёр класіка літаратуры*, «Культура», № 46, 12.11.2016, с. 14 і працяг: № 47, 19.11.2016, с. 15.

27 Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłowskie, dz. XXV, sygn. 4026, 4027 (mf 16641, 16642).

28 Цытуецца па: Г. В. Кісялёў, *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча*, с. 89-90.

Генадзь Кісялёў, «першая частка гэтага артыкула з'яўляецца амаль даслоўным паўтарэннем артыкула А. Слупскага»[29].

Для нас жа важна, што ў двух гэтых біяграфіях сваяком Вінцэнта Марцінкевіча называецца ў адрозненне ад артыкула Ельскага не мітрапаліт, а віленскі біскуп, і ў залежнасці ад месцажыхарства гэтага сваяка называецца і навучальная ўстанова, у якой вучыўся будучы класік. Таму Зямкевіч далей піша: «Пасля сканчэння калегіі Марцінкевіч паступіў у Віленскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт, але пры першым рэзанні трупа абамлеў, а затым, кінуўшы ўніверсітэт, паступіў на месца сакратара да нейкага Бараноўскага, які ў Вільні меў нейкае выдатнае бюро. Незабавам Марцінкевіч пазнаёміўся з дачкой свайго працадаўцы, каторая не дайшла яшчэ поўных 16 гадоў і з погляду была яшчэ дзіцяткам, Юзэфай, улюбіўся ў яе і, не атрымаўшы ад Бараноўскага згоды на жаніцьбу, уночы 18 снежня 1831 года ўвёз сваю палюбоўніцу і тайна ад бацькі ажаніўся. Ясна, што служыць далей у разгневанага цесця было ўжо немагчыма, і ён перайшоў праз колькі часу ў дваранскае (шляхецкае) дэпутацкае сабранне»[30].

Зрэшты, у больш ранняй біяграфіі, апублікаванай у «Нашай Ніве» № 48 за 1910 год Зямкевіч выкарыстаў і згадваны вышэй «Успамінак» Ельскага. І тут мы сустракаем крыху іншую паслядоўнасць падзей і геаграфію, паказваецца таксама і вельмі важная для нас ступень сваяцтва Марцінкевіча і Сестранцэвіча: «Там і пражыў малады Вінцук сваё дзяцінства і школьныя гады, пакуль не скончыў сярэдняй школы ў Бабруйску ў 1824 гаду. Скончыўшы сярэднюю школу, Вінцук паехаў у Вільню для далейшай навукі, у калегію айцоў базыльянаў, куды яго аддаў **дзядзька**, мітрапаліт літоўскі і беларускі, ксёндз Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч. У Вільні Марцінкевіч прабыў нядоўга і паехаў у Пецярбург да ўніверсітэту вучыцца за доктара. Але медыцына скора яму абрыдла; ён пакінуў яе і вярнуўся дахаты, дзе прабыў крыху часу. У 1827 годзе Марцінкевіч дастаў службу»[31].

З вышэйпрыведзеных цытат відаць, што не толькі розныя біёграфы прыводзілі няслушныя даныя і супярэчылі адзін аднаму, але, напрыклад, Ельскі і Зямкевіч у сваіх працах розных гадоў прыводзілі розныя звесткі. Для паўнаты карціны прывядзем і вялікую цытату з Галомбака, дзе ён абвяргае некаторыя даныя ранніх даследчыкаў: «Пасля заканчэння гэтай школы, — працягвае даследчык, — паводле

29 Г. В. Кісялёў, *Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст.*, рэд. В. В. Барысенка, А. І. Мальдзіс, Мінск 1977, с. 35.

30 Цытуецца па: Г. В. Кісялёў, *Пачынальнікі*, с. 23.

31 Цытуецца па: Г. В. Кісялёў, *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча*, с. 95.

парады свайго **сваяка**, ксяндза-мітрапаліта Станіслава Богуш-Сестранцэвіча ён накіроўваецца ў Вільню, дзе быў змешчаны ў базыльянскім канквікце... Марцінкевіч насуперак сцвярджэнням ранейшых яго біёграфаў наведваў не базыльянскую калегію, паколькі такой калегіі ў Вільні ў той час не было, а сярэднюю школу, закладзеную на месцы колішняй езуіцкай калегіі. У базыльянскім манастыры, памятным тым, што незадоўга да прыбыцця Марцінкевіча ў Вільню ў яго мурах трымалі ў зняволенні Міцкевіча разам з іншымі філаматамі і філарэтамі, прабыў паэт да часу заканчэння сярэдняй школы. Потым ён запісаўся на медыцыну ў Вільні, а не ў Пецярбургу, як сцвярджалі дагэтуль. Марцінкевіч не меў прычыны ехаць у Пецярбург, паколькі ў тыя часы Віленскі ўніверсітэт меў яшчэ вельмі высокую рэпутацыю, а па-другое, мы ведаем, што Марцінкевіч пасля хуткай адмовы ад медыцынскіх навук, якія відавочна не адпавядалі яго характару, жыве ў Вільні, дзе з'яўляецца сакратаром у бюро нейкага Бараноўскага»[32].

Як бачым, многія біяграфічныя звесткі з жыцця Вінцэнта Марцінкевіча, першапачаткова недакладныя і няпоўныя, паступова ўдакладняліся і дапаўняліся, многія даныя былі цалкам перагледжаны, многія пытанні вырашаны, але, што тычыцца галоўнага для нас пытання, большасць першых даследчыкаў так і не пайшла далей паняцця „сваяк". Трохі больш за іншых паведаміў Рамуальд Зямкевіч, назваўшы Станіслава Богуша-Сестранцэвіча «дзядзькам» Вікенція, але ніякіх іншых падрабязнасцей гэтага сваяцтва ён не прывёў. Нейкі прагрэс у гэтым накірунку адзначыў ва ўжо неаднаразова цытаванай намі кнізе *Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча* Г. В. Кісялёў: «Перш за ўсё бачым, што Галомбак пакідае без увагі версію Слупскага, што ўплывовым сваяком Дуніна-Марцінкевіча быў нейкі безыменны «віленскі біскуп». Ён пагаджаецца з некралогам (і, відаць, «Успамінкам»), што гэты **сваяк** — ніхто іншы, як знакаміты дзеяч перыяду Асветніцтва Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, літаратар і вучоны і адначасова царкоўны дзеяч — магілёўскі каталіцкі мітрапаліт. Рашэнне Галомбака ў гэтым выпадку, відаць, слушнае. У наш час А. Мальдзіс прывёў дадатковыя звесткі пра сваяцкія сувязі Сестранцэвіча з Марцінкевічам»[33].

Аднак, на жаль, большасць сучасных даследчыкаў ці не ставілі задачы ўстанаўлення сваяцтва Вінцэнта Марцінкевіча з Богушам-Сестранцэвічам, ці не змаглі нічога дадаць да ўжо існуючых варыян-

[32] Там жа, с. 96.
[33] Там жа.

таў: «сваяк», «дзядзька», «дзядзька па матчынай лініі», «брат маці»... Хоць, зыходзячы з самага вызначэння слова «дзядзька» — брат бацькі або маці (крэўнае сваяцтва), муж цёткі (някроўнае), можна было падставіць пад сумнеў некаторыя варыянты. Так, Сестранцэвіч ніяк не мог быць родным братам маці Марцінкевіча ў дзявоцтве Нядзвецкай. Нават, калі выказаць здагадку, «муж цёткі», то і тут сувязі не атрымліваецца, бо мітрапаліт не быў жанаты. Таксама не мог ён быць ні братам, ні мужам сястры Івана Марцінкевіча, г.зн. Станіслаў Сестранцэвіч не мог быць родным дзядзькам Вінцэнта Марцінкевіча. Чыста тэарэтычна адзінымі варыянтамі сваяцтва на гэтым узроўні застаецца варыянт з некалькімі шлюбамі магчымай агульнай мацеры Марыяны Нядзвецкай і яе «брата» Станіслава Сестранцэвіча, і тады як дзеці ад розных бацькоў яны могуць мець розныя прозвішчы. Але, калі пра бацькоў Нядзвецкай мы пакуль не ведаем нічога, то бацькі мітрапаліта добра вядомыя, і ў гэтай сям'і быў усяго адзін шлюб. Але пра гэта трохі ніжэй.

Трэба меркаваць, што з падачы Р. Зямкевіча варыянт з «дзядзькам» патрапіў у некаторыя кнігі да такіх аўтарытэтных даследчыкаў творчасці Марцінкевіча, як Г. В. Кісялёў: «Яго сувязі з **дзядзькам** мітрапалітам С. Богушам-Сестранцэвічам, які жыў стала ў Пецярбургу...»[34] (у больш позняй кнізе *Марцінкевіч герба Лебедзь* ён піша больш асцярожна: «Некаторую падтрымку аказаў яму ўплывовы **сваяк (дзядзька?)** С. Богуш-Сестранцэвіч»[35]) і А. І. Мальдзіс: «З Магілёвам звязана жыццё і творчасць пладавітага пісьменніка і вучонага-славіста, **дзядзькі** В. Дуніна-Марцінкевіча Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1731-1826)»[36].

Асцярожным у сваёй кнізе быў і Уладзімір Ліпскі: «Сестранцэвіч — **блізкі сваяк Марцыяны Нядзведскай, кажуць, родны дзядзька**. І калі яна выйшла замуж за Яна Марцінкевіча, даў прытулак ім у маёнтку Панюшкавічы»[37]. Хоць тут ёсць канкрэтнае ўказанне на блізкае сваяцтва менавіта з маці Вінцэнта, але з агаворкай «кажуць». І далей: «Вядома, што з 1817 года адміністратарам у маёнтку Панюшкавічы быў тытулярны саветнік Станіслаў Сестранцэвіч, пляменнік архібіскупа. У той час Вінцэнту споўнілася дзевяць гадоў. Пазней ён сам напіша пра сабе: «з маленства асірацелы...». Дык вось, той адміністратар Панюшкавіч Сестранцэвіч, якога дзядзька архібіскуп «снабдил

[34] Г. В. Кісялёў, *Ад Чачота да Багушэвіча*, с. 242.
[35] *Марцінкевіч герба Лебедзь: Дакументы і матэрыялы*, с. 4.
[36] А. І. Мальдзіс, *На скрыжаванні славянскіх традыцый*, с. 259.
[37] У. Я. Ліпскі, *Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод*, с. 75.

полною доверенностью по управлению хозяйственными делами», і займаўся, думаецца, апекаю над асірацелым Вінцэнтам. Для пачатку ўладкаваў яго ў Бабруйскую павятовую школу. Не выключаецца апека над сіратою і састарэлага архібіскупа магілёўскага і мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх цэркваў у Расіі...»[38]. І там жа: «Хочацца верыць, што **дваюрадны дзед** Сестранцэвіч **перадаў па генах** свайму Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу багата якіх сваіх прыродных якасцей і жыццёвы вопыт. У Вінцэнта, як і ў **дзеда**, таксама здарыўся палюбоўны раман у сям'і, якой служыў... У літаратуры **ўнук** пераўзышоў свайго **дзеда**, бо яна стала для яго сэнсам жыцця»[39].

Відавочна, што ў апошніх прапановах гаворка ідзе менавіта аб крэўным, ды яшчэ прамым (раз мог перадаць гены — як? — вядома, што ў каталіцкага мітрапаліта сваіх дзяцей не магло быць) сваяцтве ў другім пакаленні. Але і ў гэтым выпадку па прыведзеных намі вышэй довадах мітрапаліт не мог быць родным дзядзькам Нядзвецкай — бо яе бацька быў Нядзвецкі, яго сястра (калі такая была) не магла быць жонкай мітрапаліта. А вось маці, ні імя, ні дзявочага прозвішча якой мы не ведаем, тэарэтычна магла быць сястрой мітрапаліта (а іх у яго было чацвёра). Але, як мы ніжэй пакажам, даследчыкі лёгка маглі б знайсці прозвішчы па мужу ўсіх гэтых сясцёр — і, забягаючы наперад, можам сцвярджаць, што сярод іх не было Нядзвецкай.

Скрупулёзней за ўсіх радаводам Вінцэнта Марцінкевіча і яго роднаснай сувяззю з мітрапалітам Сестранцэвічам займаўся Язэп Язэпавіч Янушкевіч. У сваёй ранняй працы ён піша: „...перад нараджэннем Вінцэнта яго бацькі самі арандавалі ў Бабруйскім павеце маёнтак Панюшкавічы, што належаў **іх далёкаму,** але ўплывоваму **сваяку** магілёўскаму біскупу Станіславу Богушу-Сестранцэвічу"[40].

Адносінам мітрапаліта і яго юнага сваяка прысвечана эсэ Я. Янушкевіча *На свой хлеб*, дзе пададзеныя найбольш поўныя вядомыя нам на сённяшні дзень звесткі пра сваяцтва Марцінкевіча і Сестранцэвіча, знаходжанні Вінцэнта ў Санкт-Пецярбургу, і пра старэйшага брата Ігната Іванавіча, які жыве там жа. Янушкевіч піша пра адну з найважнейшых архіўных знаходак — рэвізскай казцы 1816 года, знойдзенай ім у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Менавіта гэты дакумент стаў і, падобна, да гэтага часу з'яўляецца адзінай навукова даказанай сувяззю Вінцэнта Марцінкевіча з Санкт-Пецярбургам: «...Сей

[38] Там жа, с. 75-76.
[39] Там жа, с. 76.
[40] Я. Я. Янушкевіч, *Беларускі дудар: праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча*, рэд. А. С. Яскевіч, Мінск 1991, с. 22.

же малолетний Викентий в прошлом 1819 году отправлен матерью его из Панюшкевич в г. Санкт-Петербург на попечение римско-католических церквей бискупа Сестранцевича, оный там находится...»[41]. І далей Я. Янушкевіч са шкадаваннем піша аб тым, што ў гэты афіцыйны дакумент не патрапілі звесткі, аб тым, кім прыходзіўся мітрапаліт для Марцінкевіча: «Магчыма, Марцыяна і тлумачыла пісару, хто такі біскуп Сестранцэвіч для яе сына, ды ў рэвізскую сказку азначэнне **«дзядзька-біскуп»** не трапіла; як-ніяк афіцыйны дакумент»[42]. Сам жа аўтар эсэ, закранаючы роднасныя сувязі, піша: **«дзядзька... пляменнік»**[43], **«родны ўнук»**[44] (удакладняючы там жа: «так, па гадах Вінцэнт мог быць **дзядзьку** не толькі ўнукам, а і праўнукам. Цэлых 77 гадоў... падзяляў дні іхняга прыходу ў свет».

Аднак з часам ацэнка ступені сваяцтва Марцінкевіча і Сестранцэвіча была Я. Янушкевічам перагледжана. Найбольш поўна пра гэта сваяцтва даследчык піша ў артыкуле *Жыццяпіс Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў кантэксце нацыянальнай гісторыі XIX стагоддзя*: «У тым, што Марцінкевічы даводзіліся сваякамі Сестранцэвічам, — сумненняў няма. А дакладней — па якой лініі? «Па мячу ці па кудзелі»? Напачатку (ці не з маёй лёгкай рукі) павандравала ў свет меркаванне, што Сестранцэвічы былі **сваякамі па маці**Ваўчацкай-Нядзведскай. Ад гэтага цяпер давядзецца адмовіцца. Хутчэй за ўсё **сваяцтва ішло «па мячу»**. Паводле пэўных генеалагічных крыніц вынікае: Ян Богуш-Сестранцэвіч (1687-1771), староста Міхнеўскі, меў за жонку Карнэлію Адынцову (1701-1773), дачку Вількамірскага стражніка, герба Ліс. Дзед Карнэліі Адынцовай быў Вількамірскі чашнік Пётра, а бабка Кацярына Дунінова, дачка Віленскага падсудка, герба Лебедзь...»[45].

Некаторы сумнеў у гэтай версіі Я. Янушкевіча выклікае тое, што сваяцтва Сестранцэвіча і Марцінкевіча праводзіцца праз прозвішча Дунін. Нам пакуль невядома ніводнага дакументальнага доказу, каб Марцінкевічы ў часы Вялікага Княства Літоўскага ці пазней выкарыстоўвалі прыдомак «Дунін-», тым больш, каб карысталіся толькі варыянтам Дунін. Ва ўсіх афіцыйных дакументах яны фігуруюць толькі як Марцінкевічы. Хутчэй за ўсё, да пошукаў новых версій сваяцтва Сестранцэвіча і Марцінкевіча падштурхнула Янушкевіча ўважлівае

41 Цытуецца па: Я. Я. Янушкевіч, *Зямля кенатафаў*, с. 25.

42 Там жа.

43 Там жа, с. 26

44 Там жа, с. 29.

45 Я. Янушкевіч, *Жыццяпіс Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў кантэксце нацыянальнай гісторыі XIX стагодзя*, [у:] В. Дунін-Марцінкевіч, *Збор твораў*, т. 2, с. 556.

вывучэнне менавіта радаводу мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (у свае часы непараўнальна больш вядомага і аўтарытэтнага, чым беларускі паэт, які значна раней за Вінцэнта стаў аб'ектам біяграфічных даследаванняў). І хоць аўтар не прыводзіць спасылкі, адкуль ім узятая апошняя версія, але ў працытаванай вышэй кнізе *Беларускі дудар*, кажучы пра радавод Марцінкевіча, Я. Янушкевіч спасылаецца на «афіцыйны гербоўнік», у прыватнасці, на гербоўнік Нясецкага[46]. У другім томе гэтага гербоўніка прыведзены звесткі аб родзе Богушаў-Сестранцэвічаў (якія цалкам супадаюць з вышэйпрыведзенымі данымі Янушкевіча), а таксама падрабязная інфармацыя аб сёстрах мітрапаліта, у тым ліку даты іх нараджэння і прозвішчы пасля замужжа: «Сёстры: Дарота, нарадзілася 17.12.1722, была замужам за Мацкевічам; Ганна, нарадзілася 15.07.1724, была замужам за Рыкачэўскім; Рэгіна нарадзілася 25.02.1737, замужам за Мікулічам; Канстанцыя нарадзілася 26.02.1742, замужам за Валкавіцкім Расійскім брыгадзірам»[47]. Як тлумачыць у каментарыі ўкладальнік гербоўніка, гэты радавод быў складзены на падставе дакумента, пададзенага самім Станіславам Богушам-Сестранцэвічам пры ўступленні ім у ордэн св. Станіслава 20 кастрычніка 1773 года.

Падводзячы вынікі папярэдняга расследавання, мы можам сцвярджаць, што ў самых першых біяграфіях з'явіліся звесткі пра сваяцтва Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. Найбольш асцярожныя аўтары казалі аб далёкім сваяцтве, але былі і сцвярджэнні аб «родным дзядзьку па матчынай лініі». Як мы бачым з вышэйпрыведзеных даных з гербоўніка Нясецкага, у мітрапаліта не было сястры, якая была б замужам за Марцінкевічам. Але, калі і было сваяцтва, то трэба адкінуць і версію, выкладзеную У. Ліпскім пра тое, што Сестранцэвіч быў родным дзядзькам самой Марцыяны Нядзвецкай, г.зн. яна не была дачкой кагосьці з яго сясцёр (чые прозвішчы па мужу нам вядомыя), ні, тым больш, братоў, інакш бы яна была ад нараджэння Сестранцэвіч. Таму нам прыйдзецца шукаць роднасці на іншых узроўнях, магчыма, што ў трэцім калене. І гэтыя адказы могуць быць у даследаваным намі дакуменце — тастаменце мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. А, як вядома, тастаменты з'яўляюцца найбольш дакладнымі і карыснымі ў плане выяўлення родасных сувязей.

46 Я. Я. Янушкевіч, *Беларускі дудар*, с. 22.
47 K. Niesiecki, *Herbarz polski*, Lipsk 1859, т. 2, с. 213-214.

3

Копія тастамента знаходзіцца ў НГАБ, фонд 1781, вопіс 2, у справе 338 «Аб духоўным тастаменце Мітрапаліта Сестранцэвіча» на аркушах 5-8 адварот (ужо дзякуючы такому загалоўку, а таксама таму, што спадчына Сестранцэвіча стала прадметам доўгіх разглядаў, і копіі гэтага дакумента сустракаюцца і ў іншых справах, тастамент даўно мог быць вывучаны нашымі даследчыкамі на прадмет сваяцтва мітрапаліта і Марцінкевічаў):

„У імя Айца і Сына, і Духа Святога амін. Я, ніжэй падпісаўся, Станіслаў Сестранцэвіч Богуш Арцыбіскуп Магілёўскі, Мітрапаліт рымска-каталіцкіх цэркваў у Расіі, адміністратар Віленскай вакантнай епархіі, старшыня рымска-каталіцкай духоўнай Калегіі і ордэнаў Святога Апостала Андрэя Першазванага, Святога Аляксандра Неўскага, Святога Уладзіміра, Вялікага Крыжа і Святой Ганны першых ступеняў, Белага Арла, Святога Станіслава і Святога Іаана Іерусалімскага 1-й ступені Вялікага Крыжа Кавалер, які нарадзіўся 1731 года верасня 3-га па новым стылі падчас валадараньня польскага Караля Аўгуста II у Вялікім Княстве Літоўскім, ва ўласным маёнтку бацькі[48] **майго, званым Замкі**[49] (З. Д.: памылка перакладчыка або перапісчыка — Станіслаў нарадзіўся ў маёнтку Занкі), **у Заблудаўскай парафіі, дзе я і ахрышчаны, памру, уручаючы душу маю Богу Адкупіцеля мойму Езус Хрыстус, ад якога атрымаў яе. Цела маё пахавана будзе ў склепе пад олтарем ў Каломенскі парафіяльны царквы**[50], якая збудаваная мною па Усяміласьцівы дазвалення Васпана Імператара Аляксандра І.

Мой рухомы і нерухомы маёнтак прызначаю нашчадкам чатырох сваякоў, а менавіта: брата майго стацкага саветніка Івана Сестранцэ-

[48] «Пра бацькоў будучага мітрапаліта вядома мала. Яго бацька Ян Богуш-Сестранцэвіч (1687-1771) насіў тытулы міхнеўскага старасты і стардубскага стражніка. Ён загінуў у кастрычніку 1771 г., абараняючы ўласны дом у Ралле ад барскіх канфедэратаў. Маці Станіслава — Карнэлія Адзінец (1698-1773) была дачкой вількамірскага стражніка Міхаіла Адзінца. Яна памерла ў ліпені 1773 г. ва ўзросце 75 гадоў ад сухотаў». М. А. Попов, А. И. Ганчар, *Митрополит С. Богуш-Сестренцевич*, с. 27 (пераклад аўтара).

[49] Памылка перапісчыкаў. На самой справе, вёска Занкі (Zańki) — у той час Ваўкавыскага павета Навагарадскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага, зараз — Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь.

[50] Будынак храма ўзведзены ў 1823-1825 гадах па праекце Давіда Віскoнці на сродкі мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, асвечаны ў свята Ушэсця Гасподняга 7 мая 1825 г. Касцёл св. Станіслава і пахаванне мітрапаліта захаваліся да нашых часоў (Санкт-Пецярбург, вул. Саюза Пячатнікаў, 22 / вул. Масцерская, 9х). Падрабязней чытай: http://stan-mta.ru/03/rus301.html.

віча Богуша і трох маіх сястёр: Дароты Мацкевічавай[51]**, Ганны Рыкачэўскай[52] і Рэгіны Мікулічавай[53], якія маюць па адным нашчадку, на роўныя чатыры часткі. Частка ж брата Івана[54] павінна быць падзелена так жа паміж чацвярых яго дзяцей, а менавіта, калежскім асэсарам і ордэна Святога Ўладзіміра 4-й ступені кавалерам Станіславам Сестрженцевічам Богушам, Маршалам Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні тытулярным саветнікам Іванам Сестрженцевічам Богушам, Генерал-Майоршаю княгіняй Амаліяй Гурьялавай і капітаншаю Кацярынай Деваль[55], мінуўшы дваіх сваякоў, як якія не маюць нашчадкаў (тут сэнс смутны).**

У Санкт-Пецярбурзе 15.11.1826 года"[56].

Дзякуючы тастаменту мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, зараз мы можам адказаць на галоўнае пытанне: ці быў ён „дзядзькам" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча? Аднак значна раней даследчыкі маглі знайсці нейкія зачэпкі ў яшчэ адным дакуменце, а менавіта ў выдадзеным яшчэ ў пачатку XX стагоддзя дзённіку самога мітрапаліта,

[51] „24 чэрвеня 1745 г. Дарота выйшла замуж за калачеўскага старасту Гжэгажа Мацкевіча і нарадзіла яму чатырох дзяцей: Ганну-Катажыну (была ахрышчана 28 жніўня 1746 г.), Яраша-Міхала (10 жніўня 1747 г.), Гжэгажа-Яна (22 верасня 1748 г.) і Кшыштафа-Пятра... Пасля смерці мужа Дарота паўторна выйшла замуж за Юзафа Туханоўскага". М. А. Попов, А. И. Ганчар, *Митрополит С. Богуш-Сестренцевич*, с. 27 (пераклад аўтара).

[52] Пра яе даследчыкам было вядома мала, толькі тое, што яе імя і прозвішча сустракаюцца ў тастаменце Сестранцэвіча. Там жа, с. 28.

[53] „5 лютага 1769 г. яна выйшла замуж за каралеўскага харунжага Аляксандра Мікуліча і ў шлюбе з ім нарадзіла двух сыноў: Аляксандра-Яна (ахрышчаны 25 сакавіка 1771 г.) і Станіслава-Стэфана (9 ліпеня 1772 г.)". Там жа, с. 27-28.

[54] „На працягу ўсяго свайго жыцця мітрапаліт нястомна дапамагаў сваім шматлікім сваякам. Менавіта дзякуючы яго пратэкцыі Ян у 1775 г. быў прызначаны каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім камергерам (шамбелянам). У 1778 г. С. Богуш-Сестранцэвіч забраў брата да сябе ў Магілёў. Там яго жонка (Генрыета Нольд) стала кіруючай усёй хатняй гаспадаркай мітрапаліта. У ліпені 1799 г., дзякуючы намаганням мітрапаліта, Ян быў прызначаны маршалкам Галоўнага Літоўскага трыбунала". Там жа, с. 28.

[55] „Амалію і Кацярыну С. Богуш-Сестранцэвіч уладкаваў (7 красавіка 1799 г.) у Свята-Екацярыненскі інстытут высакародных дзяўчат, навучанне ў якім давала вялізныя магчымасці для выгаднага замужжа, што і адбылося. У 1800 г. Амалія выйшла замуж за будучага генерал-маёра (тады яшчэ палкоўніка) І. С. Гур'ялава, а Кацярына — за капітана Дзявелева". Там жа, с. 28.

[56] Цалкам тэкст тастамента надрукаваны: З. Дрозд, *Тастамент Мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў у Расіі, Архіепіскапа Магілёўскага, адміністратара Віленскай капітулы Станіслава Богуша-Сестранцэвіча*, «Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў», № 2.

якi друкаваўся ў некалькiх кнiгах альманаха *Старина и новизна*. Здаецца, што першымi да яго звярнулiся беларускiя гiсторыкi Мiхаiл Папоў i Андрэй Ганчар, якiя адзначаюць у сваёй манаграфii: „Усе бiяграфiчныя працы беларускiх даследчыкаў не абыходзяцца без згадкi ролi С. Богуша-Сестранцэвiча ў лёсе аднаго з родапачынальнiкаў сучаснай беларускай лiтаратуры — Вiнцэнта Дунiна-Марцiнкевiча... На жаль, на сённяшнi дзень цяжка дакладна ўстанавiць, кiм былi яны адзiн аднаму”[57]. Паказальна, што да гэтага дакумента першымi звярнулiся даследчыкi менавiта бiяграфii Сестранцэвiча, а не Марцiнкевiча.

Там жа яны як „зачэпку” для будучых даследчыкаў, спасылаючыся на асабiстыя лiсты мiтрапалiта, надрукаваныя ў тым жа альманаху, называюць яго пляменнiка Iгнацiя Iванавiча Марцiнкевiча i пляменнiцу Францiшку Марцiнкевiч. Аднак асоба „марскога ваўка” Iгнацiя ўжо добра вядома беларускiм даследчыкам, ён нават стаў героем асобнага артыкула Язэпа Янушкевiча *Нечаканая рэмiнiсцэнцыя, або Брат Iгнат-Мацей*[58]. I добра вядома, што Iгнацiй быў сынам Яна Марцiнкевiча i яго першай жонкi, а вось сам Вiнцэнт — сынам ужо ад другой жонкi — Марцыяны Нядзвецкай. Сам жа даследчык з жалем адзначае: „Гiсторыя не данесла iмя першай жонкi Яна Марцiнкевiча”[59].

Нескладана супаставiць некалькi фактаў: Сестранцэвiч называе Iгнацiя Марцiнкевiча сваiм пляменнiкам, але быць такiм ён мог толькi па жаночай лiнii — г.зн. зыходзiць ад адной з трох яго родных сясцёр, указаных у тастаменце: Дароты Мацкевiчавай, Анны Рыкачэўскай i Рэгiны Мiкулiчавай, у кожнай з якiх было ўсяго па адным нашчадку. Дзякуючы звесткам, прыведзеным у каментарыях, мы ўжо ведаем, што i сярод нашчадкаў Мацкевiчавай i Мiкулiчавай таксама няма нiкога з Марцiнкевiчаў. I менавiта веданне з гэтага тастамента прозвiшча па мужу другой сястры Сестранцэвiча дазволiла нам звярнуць увагу на ўжо даўно надрукаваную беларускiм гiсторыкам Яўгенам Анiшчанкам сярод тысяч iншых у спiсах ураднiкаў ВКЛ спасылку на архiўны дакумент: „Марцiнкевiч Ян, 1780, смаленскi чашнiк, жонка Людвiка Рыкачэўская (у арыгiнале „Рыкашевская”), фонд 1711 справа 62 аркуш 431”[60]. Няма сумненняў, што ў гэтай спасылцы гаворка iдзе

57 М. А. Попов, А. И. Ганчар, *Митрополит С. Богуш-Сестренцевич*, с. 28 (пераклад аўтара).

58 Я. Я. Янушкевiч, *Зямля кенатафаў*, с. 30-35.

59 Там жа, с. 21.

60 Я. К. Анiшчанка, *Збор твораў. У 6-цi тамах*, т. 4: *Ураднiкi беларускiх зямель ВКЛ пры Станiславе Панятоўскiм: Спiсы на рускай мове*, Мiнск 2008, с. 288 (пераклад i расшыфроўка аўтара).

менавіта пра бацьку Вінцэнта, Яна, і яго на той час жонку Людвіку. Такім чынам, мы маем адказ і яшчэ на адно пытанне: як жа звалі першую жонку Яна Марцінкевіча.

Змест гэтага дакумента, актыкаванага ў гродскіх кнігах Гародні 11 красавіка 1780 года, ставіць кропку ў гэтым пытанні: „Ян і Людвіка з Рыкачэўскіх Марцінкевічы чашнікі Смаленскага ваяводства, муж і жонка... робім вядома і відавочна нашым добраахвотным... вечыста прадажным правам Пятру Макржэцкаму дадзеным, на тое, што мы, Марцінкевічы... маючы дом каменны ў горадзе Вільні, які дастаўся нам у спадчыну па нябожчыцы Ганне Рыкачэўскай, маці нашай, дабрадзее, дзедзічным правам атрыманы ёю ад ксяндза Станіслава Сестранцэвіча, біскупа Беларускага”[61]. Камяніца каштавала пакупніку 2400 польскіх злотых і знаходзілася недалёка ад вуліцы Субач (зараз Subačius), у завулку, з тылу касцёла св. Казіміра, побач з палацам падстолія ВКЛ Міхала Патоцкага, дамамі падкаморыя Нарбута, ваяводы віцебскага Салагуба і іншых[62].

Такім чынам, зараз мы можам сцвярджаць: **першы мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх цэркваў у Расіі Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч не з’яўляўся крэўным ні для бацькі, ні для маці, ні самаму Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, а быў толькі для першага з іх сваяком па жонцы**. Дачка роднай сястры мітрапаліта Ганны Рыкачэўскай, Людвіка, выйшла замуж за Яна Марцінкевіча і менавіта ад іх паходзяць зводныя паэта — брат Ігнацій Марцінкевіч і сястра Францішка[63]. Менавіта яны, у адрозненні ад Вінцэнта Марцінкевіча, сталі сярод іншых патомкаў нашчадкамі багаццяў мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, атрымаўшы належныя ім часткі яго маёнткаў у Магілёўскай губерні. Аднак некаторыя недакладныя фармулёўкі ў тастаменце аб некаторых яго ўладаннях сталі прычынай працяглых судовых цяжбаў паміж спадчыннікамі.

4

Як мы бачым, загадка, якая хвалявала даследчыкаў амаль стагоддзе, мела даволі простае рашэнне, будзь гэтыя даследчыкі крышачку больш уважлівыя і цікаўныя, бо завяшчанне Мітрапаліта і яго дзённікі былі ім даступныя. Цяпер мы маем адказы і на некаторыя іншыя

[61] НГАБ, ф. 1711, воп. 1, спр. 431, арк. 431-432 адв.

[62] Там жа.

[63] *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Хто такая Францішка з Марцінкевічаў Парчэўская, і ці спагнала яна пазыкі свайго бацькі?*, «Культура», 2017, № № 12 і 15.

важныя загадкі з біяграфіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Пра іх тэзісна.

Каб не ўгразнуць у дзясятках новых фактаў, дакументаў і таму падобнага, згадаю толькі асноўныя моманты, якія павінны быць уведзеныя ў гісторыю літаратуры. Больш падрабязныя факты з самымі новымі дакументамі, іх здымкамі і спасылкамі на архіўныя крыніцы будуць апублікаваны ў некалькіх запланаваных аўтарам кнігах, першыя з якіх павінны выйсці на пачатку юбілейнага 2018 года. Магчыма, што па меры падрыхтоўкі макетаў назвы будуць мяняцца, але пакуль аўтарам яны бачацца так: 1. «Бліжэй за ўсіх да Марцінкевіча» — новыя факты сямейнай гісторыі: пра бацькоў, братоў, сясцёр, пляменнікаў і іншых родных; 2. «Падроблена Марцінкевічам» — крымінальныя гісторыі пра падробку дакументаў; 3. «Марцінкевіч не Дунін» — падрабязнае даследаванне дваранскай справы з новымі фактамі для генеалогіі, ацэнка сапраўднасці дакументаў; 4. «Марцінкевіч на службе» — фармулярныя спісы, служба ў розных мінскіх установах; 5. «Панюшкавічы — радзіма Марцінкевіча» — дакументы па гісторыі маёнтка Панюшкавічы. Калі атрымаецца ажыццявіць задуманае, то выйдзе сапраўдная пенталогія, пра якую калісьці даўно марыў даследчык Дуніна-Марцінкевіча Язэп Янушкевіч.

На жаль, калі нейкія факты сталі здабыткам энцыклапедый і падручнікаў, трапілі ў такую «аўтарытэтную» крыніцу для сучасных маладых даследчыкаў як «Вікіпедыя», вельмі складана змагацца з тэкстамі, якія кожны месяц працягваюць размнажацца: кантрольнымі, курсавымі, папулярнымі і калянавуковымі артыкуламі і нават дакументальнымі фільмамі і т.п., якія памнажаюць ужо састарэлыя звесткі. Акрамя ўжо асветленага падрабязна ў „Родным слове”[64] адказу на пытанне: кім менавіта прыходзіўся Вінцэнт Марцінкевіч мітрапаліту Станіславу Богуш-Сестранцэвічу, вылучу толькі 12 асноўных фактаў, якія павінны быць перапісаны ці папоўнены.

1. Першым і, безумоўна, найбольш важным з майго пункту гледжання, з’яўляецца тэзіс аўтара пра тое, што Вінцэнт Марцінкевіч пры выվадзе свайго дваранскага паходжання прыдумаў сабе прыдомак «Дунін-» — бо ніхто з ягоных блізкіх: ні бацька, ні дзядзька, ні брат, ні маці ніколі не выкарыстоўвалі варыянт прозвішча Дунін-Марцінкевіч. Усюды і заўсёды (а зараз аўтар мае некалькі дзясяткаў ранніх дакументаў, пачынаючы ад 1750-х

[64] З. Дрозд, *Цяжар канчатковай вывучанасці: Ці быў каталіцкі мітрапаліт Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч дзядзькам Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу?*, «Роднае слова», 2017, № 6, с. 10-14.

гадоў: дзясяткі згадак у метрычных кнігах сям'і Марцінкевічаў, дзясяткі судовых позваў, рэзалюцый, пратаколаў, допытаў, дэкрэтаў, даверанасцей, лістоў, гандлёвых здзелак, фармулярных спісаў, прашэнняў... — усюды толькі адзін варыянт, Марцінкевіч! Падрабязна пра гэта аўтар пісаў у артыкуле „Навошта Марцінкевічу спатрэбіўся Дунін" у „Нашай Ніве"[65]. Гэты, здавалася б, неверагодны тэзіс, да гэтага часу не сустрэў ніякай крытыкі сярод гісторыкаў. Непасрэдна да гэтага тэзіса дададзім і другі.

2. Нягледзячы на сцвярджэнне аднаго з самых адданых і аўтарытэтных даследчыкаў Марцінкевіча: «Радавод роду Дуніна-Марцінкевіча добра вывучаны», на самой справе, дзіўна, але ніхто не займаўся вывучэннем гэтага радаводу, хоць усе даследчыкі Марцінкевіча не маглі не згадаць сумнеўны дакумент з гэтай дваранскай справы пра Пятра Першага, які жыў у 1201 годзе. Аўтар узяў на сябе смеласць сцвярджаць, што па большай частцы гэты доказ пабудаваны на фальшывых або сумнеўных дакументах, а вялікая яго частка перапісана з існуючых на той час гербоўнікаў. У 1832 годзе Вінцэнт (хутчэй за ўсё, па падказцы старэйшых таварышаў з Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу, што праславіліся на ўсю імперыю сфальсіфікаванымі радаводамі, добра ведалі, як дакументальна даказаць нават тое, чаго ніколі не было) узвёў не толькі паходжанне свайго герба, але і самога свайго роду да Пятра Дуніна — адкуль пайшла і версія пра дацкае паходжанне Марцінкевічаў. Аднак разрыў паміж Пятром Дуніным і рэальнымі продкамі Вінцэнта больш за 500 гадоў. І нам здаецца, што гэта занадта шмат, каб гаварыць аб хоць нейкім нават тэарэтычным паходжанні ад яго нашага класіка.

3. Вядомы факт: „Вінцэнт нарадзіўся ў Панюшкавічах у сям'і беднага арандатара, які сам араў зямлю" мы таксама паставім пад сумнеў... Чамусьці ніхто нават не запытаўся: як можа быць арандатар маёнтка, які складаўся з некалькіх вёсак, якія налічвалі 160 двароў і больш за 1000 прыгонных душ абодвух полаў, быць бедным? На самой справе, Ян Марцінкевіч не быў арандатарам гэтага маёнтка, і не быў нават яго ўпраўляючым. Пасля змены арандатараў ён па даверанасці ад Сестранцэвіча павінен быў дапамагчы ўладзіць прэтэнзіі пасля ранейшага арандатара, чым і займаўся да самой сваёй смерці[66].

[65] З. Дрозд, *Навошта Марцінкевічу спатрэбіўся Дунін*, «Наша Ніва», № 16 (949), 27.04.2016, с. 12, 13.

[66] З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча: Ян Марцінкевіч: загадкі пра бацьку класіка*, «Культура», № 5, 5.02.2017, с. 14; № 7, 18.02.2017, с. 15.

4. Але на самой справе Ян і яго брат Ігнат Марцінкевічы, сапраўды, былі арандатарамі. І гэта зноў да догмы аб беднай засцянковай шляхце. Але даследчыкі змешвалі жыццё беззямельнай шляхты, якая не мела сваіх сялян, арандавала валоку, а то і паўвалокі зямлі, і самастойна яе апрацоўвала, з арандатарамі цэлых маёнткаў. Вядома, ніхто з апошніх не хадзіў з драўлянай сахой па палях і не пасвіў уласнае быдла. Яшчэ ў 1785 годзе паміж віленскім ваяводам Каралем („Пане каханку") і падкаморым ВКЛ Геронімам князямі Радзівіламі з аднаго боку і абозным ВКЛ Міхалам і Кацярынай з Мараўскіх Лапотамі з другога была складзена застаўная ўгода на маёнтак Старчыцы (цяпер вёска Акцябр, Салігорскі раён, Мінская вобласць). Пасля частку гэтага маёнтка арандаваў землямер Юзаф Вольскі, ад якога 23 красавіка 1793 года пачаў арандаваць наваградскі ротмістр Ігнат Марцінкевіч. Гэтая субарэнда абышлася яму ў 22 000 польскіх злотых. 30 сакавіка 1795 года ён запазычыў яшчэ 12 000 на арэнду радзівілаўскага маёнтка Новы Двор. Менавіта з першым з гэтых маёнткаў звязана наступнае 15-годдзе ў жыцці братоў. Агулам 34 000 польскіх злотых! Напэўна, гэтага цалкам дастаткова, каб абвергнуць тэзіс аб беднасці сям'і Марцінкевічаў[67].
5. Аб даволі высокім узроўні сям'і Марцінкевічаў нават на фоне санкт-пецярбургскіх вяльможаў сведчыць той факт, што першым шлюбам адзінакроўны брат Вінцэнта — Ігнат Марцінкевіч, быў жанаты на князёўне Соф'і Канцямір. Яе бацька — князь Дзмітры Канцямір быў апошнім прэтэндэнтам на пасад Малдаўскага княства. Ці быў першы цесць Ігната Марцінкевіча багатым? Думаю, гэтага эпітэта будзе замала, каб апісаць яго фінансавы стан. У 1803 годзе, якраз незадоўга да вяселля, стрыечны брат Дзмітрыя Канцяміра, Васіль Пасек, так ацэньваў яго маёмасць: 16 000 душ і больш за 400 000 рублёў[68]. Падрабязна пра першы шлюб Ігната і аб яго новых сваяках аўтар пісаў у газеце «Культура»[69]. Усталяваная аўтарам таксама і прычына звальнення капітан-лейтэнанта Ігната Марцінкевіча з ваеннай службы (яго нават прысудзілі да расстрэлу, але так як пака-

Упершыню надрукаваны метрычны запіс аб нараджэнні і хрышчэнні сына Яна і Людвікі з Рыкачэўскіх Марцінкевічаў — Фелікса-Станіслава-Казіміра.

67 Там жа.

68 В. В. Пасек, *Отрывок жизни Василия Пасека, им самим сочиненный*, „Русский архив", вып. 5-6. Москва 1863, с. 633.

69 З. Дрозд, *Рэвельскі Монтэ-Крыста*, «Культура», 2017, № № 34, 39—41.

ранне смерцю было адменена, толькі пазбавілі звання і ўзнагарод), а таксама лёс яго трох сыноў і ўнукаў, якія засталіся жыць у Санкт-Пецярбургу і ў маёнтках Марцінкевічаў, што знаходзіліся ў гэтай губерні.

6. Язэп Янушкевіч лічыў, што Ян Марцінкевіч не жыў з сям'ёй, і недзе пражываў аж да 1819 года. Аднак сёння мы можам сцвярджаць, што ён памёр неўзабаве пасля нараджэння Вінцэнта. І хоць метрыка аб яго смерці пакуль не знойдзена, мы можам прапанаваць варыянт дакладнай даты, калі гэта адбылося. 27 сакавіка 1809 года, маючы генеральную даверанасць ад мітрапаліта Богуша-Сестранцэвіча, мінскі біскуп Якуб-Ігнаці Дзядзерка заключыў новы кантракт на двухгадовую арэнду Панюшкавіч, пачынаючы з 30 мая, з Вінцэнтам Стэфаноўскім. У гэтым найважнейшым для нас дакуменце згадваецца, што заключаны ён „па завяршэнні года пасля смерці светлай памяці пана чашніка навагрудскага Яна Марцінкевіча". Гэта дазваляе нам выказаць здагадку, што ён памёр 30 мая 1808 года, а значыць, усяго праз 3 месяцы пасля нараджэння Вінцэнта[70].
7. „З маленства асірацелы" — гэтыя словы напісаныя самім Вінцэнтам пры вывадзе дваранства, вядомыя кожнаму, хто цікавіўся яго біяграфіяй. Аднак сірата — гэта той, хто не мае бацькоў. А сёння мы можам дакладна сцвярджаць, што маці Вінцэнта памерла амаль праз 20 год пасля яго нараджэння, калі ён ужо працаваў у Мінску. 30 студзеня 1830 года Марцыяна Марцінкевічава склала тастамент, па якім яе дзеці — Вінцэнт і Алена — у маі 1831 года падзялілі яе спадчыну, бо сама яна 20 чэрвеня 1830 года памерла ва ўзросце 62 гадоў. Больш падрабязна глядзіце артыкул „Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча: Невядомае пра лёс маці класіка"[71].
8. Дадаткова нам удалося прасачыць жыццёвы шлях ад нараджэння да смерці двух родных сясцёр Вінцэнта — Алены (па мужу Умінскай) і Юліі (па мужу Высоцкай) — знойдзены метрыкі аб іх хрышчэнні, шлюбе і смерці, а таксама метрыкі аб нараджэнні дзяцей Алены. Больш падрабязна пра гэта расказана аўтарам

[70] Там жа.

[71] З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча: Невядомае пра лёс маці класіка*, «Культура», 2016, № 51, с. 14-15. Упершыню надрукаваныя метрычныя запісы: аб смерці маці — Марцыяны Марцінкевічавай і сястры — Хелены з Марцінкевічаў Умінскай, а таксама аб нараджэнні і хрышчэнні пляменніка — Віктара-Цыпрыяна Умінскага.

у артыкуле „Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Лёсы сясцёр класіка літаратуры”[72]. А таксама ўдалося прасачыць лёс раней невядомай даследчыкам сястры — дачкі ад першага шлюбу Яна Марцінкевіча і Людвікі Рыкачэўскай — Францішкі (па мужу Парчэўскай — маці сябра Адама Міцкевіча, маладога літаратара Станіслава Парчэўскага)[73].

9. Немалаважным новым дадаткам у біяграфію Дуніна-Марцінкевіча з'яўляецца знойдзены аўтарам факт, што ўжо ў 1835 годзе ён упершыню апынуўся ў Мінскім турэмным замку па справе аб падробцы дакументаў, хоць да гэтага часу, на падставе даведкі, якую сам Вінцэнт прадставіў пасля працяглага прагулу ў 4 месяцы па месцы сваёй працы ў кансісторыю, пісалася толькі пра хатні арышт. Больш падрабязна глядзіце наш артыкул „Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і падробка пячатак” у „Нашай Ніве”[74].
10. Значна памножыліся на мапе Беларусі і мясціны, звязаныя з родам Марцінкевічаў. Да трох існуючых да сёння (Панюшкавічы, Мінск і Люцынка) мы можам дадаць і Слонім, дзе 8 жніўня 1750 года нарадзіўся дзядзька класіка Ігнат і, хутчэй за ўсё, і бацька Ян, і побач з якім знаходзіўся маёнтак Высоха (згадваецца яшчэ ў дваранскім вывадзе, але чамусьці ніхто не звяртаў на яго ўвагі). Яго мы можам лічыць гняздом Марцінкевічаў, так як пра больш раннюю гісторыю сям'і пакуль нічога невядома. Гэта і беларускія землі Богуша-Сестранцэвіча: яго асабістыя, у адрозненне ад духоўных Панюшкавіч, маёнткі Маляцічы (цяпер Крычаўскі раён) і Лапацін (зараз Лапаціна, Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці), дзе нейкі час жыла сям'я Яна Марцінкевіча. Гэта і Слуцк, дзе браты Марцінкевічы хрысцілі сваіх дзяцей, падчас арэнды Ігнатам маёнтка Старчыцы. Ян жыў па

[72] З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Лёсы сясцёр класіка літаратуры*, «Культура», 2016, № № 46 і 47. Упершыню надрукаваныя метрычныя запісы: аб нараджэнні і хрышчэнні сястры — Хелены Марцінкевічаўны, племянніц Юзэфы-Вінцэнты-Апалоніі і Яўгеніі-Сафіі Умінскіх, а таксама запіс аб вянчанні Хелены Марцінкевічаўны і Юзэфа Умінскага.

[73] З. Дрозд, *Сямейныя таямніцы Дуніна-Марцінкевіча. Хто такая Францішка з Марцінкевічаў Парчэўская, і ці спагнала яна пазыкі свайго бацькі?*, «Культура», 2017, № № 12 і 15. Упершыню надрукаваныя метрычныя запісы: аб нараджэнні і хрышчэнні пляменніцы — Канстанцыі-Феліксы-Вікторыі — дачкі Вінцэнта і Францішкі з Марцінкевічаў Парчэўскай.

[74] З. Дрозд, *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і падробка пячатак*, «Наша Ніва», № 44 (881), 26.11.2014, с. 14.

суседстве з братам, але служыў у арандатараў радзівілаўскага маёнтка Заўшыцы Масальскай або Канапацкага, бо ён згадваецца толькі ў гэтай вёсцы і вёсцы Мазалі. Гэта і маёнтак Юзафова каля Глуска, і сам Глуск, дзе пахаваныя і маці Вінцэнта, і сястра Алена Умінская[75]. Гэта і новыя адрасы на карце Мінска, дзе часова пражываў малады Марцінкевіч.

11. Думаю, што немалаважным фактам да біяграфіі перакладчыка на беларускую мову «Пана Тадэвуша» будзе той факт, што пляменнік Вінцэнта — Станіслаў Парчэўскі не проста быў сябрам Адама Міцкевіча пад час яго вандроўкі ў Рыме, але і выратаваў яго ад смерці. Таксама цікавы факт, што надпіс на надмагільным камяні рана памерлага Станіслава напісаў сам Міцкевіч. Больш падрабязна пра гэта расказана аўтарам у артыкуле „Danse macabre Станіслава Парчэўскага" апублікаваным у „Культуры"[76].
12. Дадамо ў гэтую скарбонку і тое, што аўтарам знойдзена справа аб вядомым раней толькі на аснове сямейных легенд факце — выкраданні маладым Вінцэнтам Марцінкевічам яго першай жонкі Юзэфы Бараноўскай. Аб гэтым глядзі наш артыкул «Неверагодная гісторыя шлюбу Вінцэнта Марцінкевіча»[77].

5

Безумоўна, устаноўленыя намі новыя факты з'яўляюцца важнымі для біяграфій двух вядомых нашых суайчыннікаў: Станіслава Богуша-Сестранцэвіча і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, але яны прыведзены намі толькі для прыкладу. Куды больш важным з'яўляецца вывучэнне самога механізма фарміравання нашых гістарычных ведаў і з'яўлення ў нашых энцыклапедыях недакладных звестак нават пра „зорак першай велічыні" беларускага культурнага небасхілу. Прычыны могуць быць наступныя:

— Даволі часта даследчыкі, не маючы архіўных даных, давяралі звесткам з трэціх рук, якія ўспрымалі некрытычна, выпускаючы з-пад увагі існуючыя на паверхні архіўныя дакументы і крыніцы. У нашым прыкладзе не вывучаліся нават такія важныя, як дзённік

[75] Невядомае пра лёс маці класіка...

[76] З. Дрозд, *Danse macabre Станіслава Парчэўскага*, «Культура», № № 30 і 31. Упершыню надрукаваныя метрычныя запісы: аб нараджэнні і хрышчэнні пляменніка Казіміра-Станіслава-Іаанна — сына Вінцэнта і Францішкі з Марцінкевічаў Парчэўскіх.

[77] З. Дрозд, *Неверагодная гісторыя шлюбу Вінцэнта Марцінкевіча*, «Наша Ніва», № 26 (911), 15.07.2015, с. 13.

і тастамент мітрапаліта (трэба адзначыць, што з'яўленне інтэрнэту істотна спрасціла пошук новых крыніц — і той жа дзённік Богуш-Сестранцэвіча цяпер даступны ў інтэрнэце для вывучэння[78]). Часта асновай падобных аксіём станавіліся па большай ступені мастацкія творы, якія потым некрытычна перапісваліся іншымі даследчыкамі ўжо як навуковыя факты і яны траплялі ў энцыклапедыі і падручнікі.

— Вялікай праблемай была і ідэалагічная ўстаноўка савецкіх часоў, калі было значна прасцей вывучаць героя, які быў «бедны», чым калі ён быў «прыгоннікам» і т.п. Але шмат у чым падобны ідэалагічны падыход уласцівы і для сучаснай беларускай гістарычнай навукі, хаця б на этапе вызначэння актуальнасці або неактуальнасці тэмы даследавання.

— Не меншай праблемай у фарміраванні няслушных даных была ўнутраная ўстаноўка саміх даследчыкаў — своеасаблівая закаханасць у сваіх герояў, якая прымушала іх залішне ідэалізаваць, безумоўна давяраць прадстаўленым імі самімі звесткам і абыходзіць увагай непрывабныя бакі іх жыцця.

— Безумоўна, асноўнай праблемай, якая змушала даследчыкаў больш вылучаць свае версіі ці нават фантазіраваць, стала недастатковая праца па выяўленні новых дакументаў, якіх, толькі ў выніку двухгадовай нашай працы па даследаванні біяграфіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, намі выяўлена каля сотні.

— У большай меры, падобнае стаўленне да крыніц стала вынікам таго феномена, што мы ўмоўна назвалі «цяжарам канчатковай вывучанасці» — маладыя даследчыкі проста не браліся за падобныя тэмы, лічачы іх неперспектыўнымі: нічога новага тут не знайсці, усё ўжо знойдзена, бо такія аўтарытэты ўжо працавалі над гэтай тэмай дзесяцігоддзямі.

— Феномен «цяжару канчатковай вывучанасці» ўласцівы нават цэлым даследчым інстытутам, напрыклад, такой аўтарытэтнай установе як Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы. Пра гэта піша, прысвяціўшы не адзін год «афіцыйнаму» вывучэнню біяграфіі класіка Язэп Янушкевіч у артыкуле *У архіўнай цішы*: „Па часе скеміў, што звальненне яны планавалі заўчасна, калі яшчэ перад Новым годам пазбавілі навуковай тэмы на наступны год. Замест прапанаванага мною працягу даследавання архіўнай

[78] *Дневник Сестренцевича, первого митрополита всех римско-католических церквей в России. Часть I: 1797 и 1798 гг.*, [у:] *Старина и новизна*, кн. 16, Санкт-Петербург 1913, электронны рэсурс: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Russ/XVIII/1780-1800/Sestrencevich/pred.htm.

спадчыны В. Дуніна-Марцінкевіча... аніякай не далі”[79]. Растлумачана гэта было тым, што «пра нашага класіка ўжо напісана больш, чым ён сам напісаў за сваё жыццё».

— Вялікай праблемай па-ранейшаму з'яўляецца савецкая сістэма арганізацыі даследаванняў беларускімі інстытутамі. У тым жа артыкуле Янушкевіч піша, што «дзяржаўны» даследчык па-ранейшаму залежыць ад планаў, што зацвярджаюцца начальствам, а таксама занадта шмат часу вымушаны марнаваць не на даследчую працу, а, хутчэй, бюракратычную: „Стаў радзей трапляць у архіўную чытальню — факт. Прыкры для навукоўца, што лічыць сябе архівістам... Нарады. „Дырэкцыі”. Паседжанні аддзела. Калегіі архіўнай галіны (падрыхтоўка да іх). Справаздачы. Вучоныя рады. Рэцэнзіі. Водгукі. Характарыстыкі. Планы. І ўсё тэрмінова, і ўсё адказна. І нейдзе паміж іншага „планавыя навуковыя” тэмы. З году ў год па зачараваным коле”[80].

Усе гэтыя прычыны прыводзяць да таго, што нашы сучасныя звесткі нават пра такіх выдатных суайчыннікаў як Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Адам Міцкевіч, Тадэвуш Рэйтан, Станіслаў Манюшка і іншыя, і, тым больш, аб іх продках яшчэ далёка няпоўныя ці нават памылковыя. Пры гэтым «цяжар канчатковай вывучанасці» не дазваляе маладым гісторыкам нават прыступіць да падобных тэм (хутчэй за ўсё, яны не будуць зацверджаны як тэмы навуковай працы), а аўтарытэт мінулых пакаленняў даследчыкаў — усумніцца ў некаторых фактах і падвергнуць іх рэвізіі. Таму даследаванні, якія ставяць сваёй задачай вывучэнне і праверку нават энцыклапедычных звестак, асабліва, у святле з'яўлення новых тэхналогій, такіх як інтэрнэт, які прадстаўляе доступ да вялізнага, раней невядомага масіву даных, становяцца актуальнымі і перспектыўнымі. Узрастае і роля незалежных, не звязаных з дзяржаўнымі інстытутамі даследчыкаў, іх устаноўка працаваць для сябе, а не для „галачкі”. Чаму прыкладам могуць быць і сенсацыйныя адкрыцці беларускага гісторыка Змітра Юркевіча ў біяграфіях Адама Міцкевіча, Тадэвуша Рэйтана і іншых[81]. Здаецца, што і мы можам сустрэць 210-годдзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча не з пустымі рукамі.

[79] Я. Я. Янушкевіч, *Зямля кенатафаў*, с. 8.
[80] Там жа, с. 6-7.
[81] З. Юркевіч, *Таямніца Міцкевіча „па кудзелі”*, «Культура», 2016, № № 8, 11; ён жа, *Міцкевіч — Рэйтан — Касцюшка*, «Культура», 2016, № 49; ён жа, *Таямніца Міцкевіча „па кудзелі”-2*, «Культура», 2016, № 6; ён жа, *Таямніца Міцкевіча па мячы*, «Культура», 2017, № № 14, 19.

Summary

The burden of a definitive study or new facts on a Belarusian classic author on the occasion of his 210th anniversary

Is it possible to find anything new in the biographies of such remarkable personages of world and Belarusian culture as Adam Mickiewicz, Wincenty Dunin-Marcinkiewicz, Tadeusz Rejtan, or Tadeusz Kościuszko? Has everything been discovered? And is our knowledge of these significant people, whose names are on the pages of course books and encyclopaedias, adequate? Based on the accumulated knowledge regarding the degree of kinship between Wincenty Dunin-Marcinkiewicz and Stanisław Bohusz-Siestrzencewicz, the author of this article points not only to many years' unsatisfactory search for the answer to this question but also to the dissemination of the knowledge acquired from inaccurate sources, speculations and even literary fantasy. Moreover, based on archival materials, he dispels such ingrained encyclopaedic dogmas as: "the history of the Dunin-Marcinkiewicz family has been thoroughly studied", "his parents were poor tenants of the Paniuszkowicze estate", "Wincenty was orphaned in early childhood", etc. The term "the burden of a definitive study", coined by the author, refers to the cause of abandoning the search for new facts and lack of a critical assessment of our historical knowledge.

Streszczenie

Brzemię definitywnego przestudiowania albo Nowe fakty z okazji 210 rocznicy dogłębnie zbadanego klasyka białoruskiego

Czy możliwe są nowe odkrycia w życiorysach takich znakomitych postaci światowej i białoruskiej kultury i bohaterów narodowych jak Adam Mickiewicz, Wincenty Dunin-Marcinkiewicz, Tadeusz Rejtan, czy Tadeusz Kościuszko? Czy wszystko już odkryto? I czy dostatecznie miarodajna jest lub przynajmniej słuszna nasza wiedza o tych znacznych postaciach, które trafiły na karty podręczników i encyklopedii. Na przykładzie zgromadzonej wiedzy o stopniu powinowactwa Wincentego Dunina-Marcinkiewicza i Stanisława Bohusza-Siestrzeńcewicza autor ukazuje nie tylko wieloletnie niezadowalające poszukiwania odpowiedzi na to pytanie, ale i upowszechnianie błędnej wiedzy historycznej na podstawie niedokładnych źródeł, domysłów i nawet fantazji literackiej. Oprócz tego na podstawie materiałów archiwalnych obalane są takie upowszechnione dogmaty encyklopedyczne, jak „historia rodu Dunina-Marcinkiewicza jest dobrze zbadana", „rodzice byli biednymi dzierżawcami majątku Paniuszkowicze", „Wincenty w dzieciństwie został sierotą" itp. Przyczynę zaniechania nowych poszukiwań i braku krytycznej oceny naszej wiedzy historycznej autor nazwał „brzemieniem definitywnego przestudiowania"

Zmicier Drozd — historyk archiwista, poeta, publicysta, fotograf (członek Związku Fotografików Białorusi). Absolwent Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku, ukończył kierunek: muzealnictwo i ochrona dziedzictwa historyczno-kulturalnego. Zainteresowania badawcze: własność ziemska, system sądowy i penitencjarny, Wincenty Dunin-Marcinkiewicz. Zajmuje się badaniem represji współczesnych i stalinowskich. Autor książek *Землеўладальнікі Мінскай губерні 1861-1900* (2010); *Землеўладальнікі Мінскай губерні 1900-1917; Падымныя рэестры Менскага ваяводства. Менскі павет 1775. Rejestry podymnego województwa mińskiego. Powiat miński 1775* (2014).

Олег Лицкевич
(Минск)

Русские летописные источники «Летописца великих князей литовских»

«Летописцем великих князей литовских» принято называть хроникальный текст, охватывающий период от смерти князя Гедимина (1341) до встречи великого князя литовского Витовта с московским великим князем Василием Дмитриевичем в Смоленске (1396). Вместе с целым рядом других произведений, — в том числе выборкой различных летописных статей, «Повестью о Подолье», хроникой войны 30-х гг. XV в., «Похвалой Витовта», повестью о Смоленском восстании 1440 г., — «Летописец великих князей литовских» вошел в состав древнейшего летописного свода по истории ВКЛ, доведенного до 1446 г.[1] Старейшая редакция «Летописца великих князей литовских»

[1] О первом летописном своде ВКЛ и «Летописце великих князей литовских» как его составной части см.: S. Smolka, *Najdawniejsze pomniki dziejopisarstwa rusko-litewskiego: rozbiór krytyczny*, Kraków 1889; A. Prochaska, *Latopis litewski: rozbiór krytyczny*, Lwów 1890; И. А. Тихомиров, *О составе западнорусских, так называемых литовских летописей*, «Журнал Министерства народного просвещения», ч. 334, 1901, № 3 (март), отд. II, с. 1-36; № 5 (май), с. 70-119; М. С. Грушевський, *«Похвала в. кн. Витовту», кілька уваг про склад найдавнійшої русько-литовської літописи*, «Записки Наукового товариства імени Шевченко», 1895, т. 8, кн. 4, Львів 1895, с. 1-16; J. Jakubowski, *Studia nad stosunkami narodościowymi na Litwie przed Unią Lubelską*, Warszawa 1912; Т. П. Сушицький, *Західньо-руськи літописи як пам'ятки літаратури*, упорядк. та до друку вигот. О. А. Назаревський, «Збірник історично-філологічного відділу», № 2: Праці комісії давнього українського письменства, т. 1, Київ 1930; В. А. Чамярыцкі, *Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў*, Мінск 1969; Н. Н. Улащик, *Введение в изучение белорусско-литовского летописания*, Москва 1985; M. Jučas, *Lietuvos didžiųjų kunigaikščių metraštis*, „Lietuvos TSR Mokslų akademijos darbai. Serija A", 1957, nr 2, p. 111-121; M. Jučas, *Lietuvos metraščiai*, Vilnius 1968; он же, *Lietuvos metraščiai ir kronikos*, Vilnius 2002; J. Mikulski, *Smoleński ośrodek latopisarski w latach 20-50. XV w.*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2010, nr 33, s. 17-49. Хотя в новейшей литературе можно встретить утверждения о том, что в состав «Летописца великих князей литовских» входила «Повесть о Подолье» (J. Nikodem, *Wiarygodność Latopisu wielkich książąt litewskich*, [в:] *Antyk, prawda i fałsz w Średniowieczu. Materiały Seminariów Mediewistycznych im. Alicji Karłowskiej-Kamzowej*, red. J. Kowalski i T. Ratajczak, Poznań 2011, s. 151-166), мы придерживаемся мнения, что это два разных произведения, возникших в разное время.

отражена в Супрасльском[2], Слуцком[3], Виленском[4], Академическом[5] списках, списке Дубровского[6] (и производном от него Погодинском списке[7], претерпевшем дополнительное редактирование), а также в переводе на латинский язык, сделанном в XV в. и известном под названием «Origo regis Jagyelo et Wytholdi ducum Lithuaniae»[8] (близкий к этому переводу текст также был в переработанном виде использован Яном Длугошем при создании 10-й книги истории Польши)[9].

Уже один из первых серьезных исследователей «Летописца великих князей литовских» Станислав Смолька обратил внимание на неоднородность его состава. Начальная часть этого произведения, повествующая о событиях до первого отъезда князя Витовта в Пруссию (1382), по мнению польского историка, являлась памятником официальной историографии, который был создан в кругах, близких к Витовту, еще при его жизни[10]. Этот текст на руском языке[11] пер-

[2] *Полное собрание русских летописей* (далее: ПСРЛ), т. 17: *Западнорусские летописи*, Санкт-Петербург 1907, стлб. 71-81; ПСРЛ, т. 35: *Белорусско-литовские летописи*, Москва 1980, с. 61-66.

[3] *Летопись великих князей литовских*, пригот. к изд. А. Н. Попов, «Ученые записки Второго отделения Академии наук.», кн. 1, отд. III, Санкт-Петербург 1854, с. 21-58 (и отдельный оттиск); ПСРЛ, т. 17, стлб. 85-124; ПСРЛ, т. 35, с. 68-72.

[4] *Отрывок краткой литовской летописи, находящейся в летописном сборнике, именуемом летописью Авраамки*, изд. А. Ф. Бычкова, Санкт-Петербург 1893; ПСРЛ, т. 17, стлб. 191-204; ПСРЛ, т. 35, с. 85-90.

[5] ПСРЛ, т. 17, стлб. 125-152; ПСРЛ, т. 35, с. 110-114.

[6] ПСРЛ, т. 17, стлб. 205-218; ПСРЛ, т. 43: *Новгородская летопись по списку П. П. Дубровского*, Москва 2004, с. 265-269.

[7] ПСРЛ, т. 17, стлб. 573-585.

[8] A. Prochaska, *Przekład ruskiego latopisca ks. Litewskiego na język łaciński*, „Kwartalnik Historyczny”, Lwów 1888, R. 2, zesz. 2, s. 196-205; ПСРЛ, т. 17, стлб. 219-226; ПСРЛ, т. 35, с. 115-117.

[9] J. Długosz, *Opera omnia*, t. 12: *Historiae Polonicae libri XII*, t. 3, lib. IX, X, Cracoviae 1876, s. 404-412; он же, *Annales seu cronicae incliti Regni Poloniae*, liber 10: *1370-1405*, Varsaviae 1985, s. 92-101.

[10] S. Smolka, *Najdawniejsze pomniki*, s. 35, 48.

[11] В соответствии с названием этого языка в аутентичных письменных источниках конца XIV-XVI вв. В нашем понимании руский (с одной буквой «с» в отличие от собственно русского) язык идентичен «западнорусскому (рутенскому)» языку в соответствии с определением, которое дал ему Вячеслав Всеволодович Иванов в своей обзорной работе о языках ВКЛ (В. В. Иванов, *Языки, языковые семьи и языковые союзы внутри Великого княжества Литовского*, [в:] *Speculum Slaviae Orientalis: Muscovy, Ruthenia and Lithuania in the Late Middle Ages*, Moscow 2005, с. 100-102). Речь идет о языке кириллических письменных памятников, создававшихся в рассматриваемый период на территории Великого княжества Литовского (включая Смоленскую, Холмскую и Подольскую земли), Галицкой Руси и Молдавии, с учетом той или иной примеси церковнославянского языка.

воначально существовал в отдельном виде, и именно он послужил протографом для латинского перевода «Origo regis». С. Смолька указал на целый ряд фактологических и текстологических параллелей между первой частью «Летописца великих князей литовских» и текстом на средневерхненемецком языке «Dis ist Witoldes sache wedir Jagaln und Skirgaln», записанным со слов Витовта в Пруссии в 1390 г.[12] Вторая же часть «Летописца великих князей литовских», по мнению С. Смольки, была написана в Смоленске в начале 30-х гг. XV в. автором, входившим в окружение митрополита Герасима, возможно, его писарем. Историк полагал, что основное внимание во второй части уделяется смоленским событиям. Отсюда он делал вывод, что автор жил в Смоленске и, судя по общей окраске текста и цитатам из Священного Писания, был духовным лицом. Поскольку С. Смолька усматривал определенное сходство между второй частью «Летописца великих князей литовских» и хроникой войны 30-х гг. XV в., также вошедшей в первый летописный свод ВКЛ, он считал, что вторая часть «Летописца великих князей литовских» составлена вскоре после 1430 г. В распоряжении сводчика находилась первая часть «Летописца великих князей литовских», взятая в великокняжеском архиве ВКЛ, и некая смоленская летопись, имевшая лакуну между 1382 и 1395 гг. Чтобы заполнить эту лакуну, по мнению С. Смольки, и была написана вторая часть «Летописца великих князей литовских»[13].

Несмотря на различия в трактовке некоторых деталей, главные выводы С. Смольки, — о необходимости различать между собой первую и вторую части «Летописца великих князей литовских» как произведения, возникшие в разное время и при разных обстоятельствах, — прочно закрепились и получили дальнейшее развитие в научной литературе[14]. Многие исследователи отмечали, что между двумя

[12] Единственный список конца XIV — начала XV вв.: Geheimes Staatsarchiv Preußischer Kulturbesitz, XX. HA, OF 1b, лл. 22 об.-24 об. Публикации: *Scriptores rerum Prussicarum*, Leipzig 1863, Bd. 2, s. 711-714; K. Alminauskis, *Vytauto skundas*, „Archiwum philologicum”, Kaunas 1939, t. 8, p. 182-224.

[13] S. Smolka, *Najdawniejsze pomniki*, s. 52-53.

[14] A. Prochaska, *Latopis litewsk*i, s. 16, 30-31; И. А. Тихомиров, *Два польских труда о западнорусских летописях*, «Журнал Министерства народного просвещения», ч. 273, 1891, февраль, отд. II, с. 407; он же, *[Рец.:] A. Prochaska, Latopis litewski. Rozbiór krytyczny, Lwów 1890*, «Журнал Министерства народного просвещения», ч. 287, 1893, май, с. 263-264; он же, *О составе*, № 3 (март), с. 8-9; М. С. Грушевський, *«Похвала в. кн. Витовту»*, с. 3, 13, 15-16; А. А. Шахматов, *О Супрасльском списке западнорусской летописи*, «Летопись занятий Археографической комиссии за 1900 год», Санкт-Петербург 1901, вып. 13, с. 8; Т. П. Сушицький, *Західньо-руськи літописи*, с. 149; В. А. Чамярыцкі, *Беларускія летапісы*, с. 108-109, 111, 113-114; M. Jučas, *Lietuvos metraščiai ir kronikos*, p. 33, 39.

фрагментами существует отчетливая языковая и стилистическая разница. Так, по мнению Яна Якубовского, литературный стиль первой части «Летописца великих князей литовских» ничем не напоминает русские летописи; изложение очень живое, язык приближен к разговорному и схож отчасти с языком государственных документов того времени, то есть XIV-XV вв.; в тексте нет церковнославянизмов и цитат из Священного Писания[15]. Вячеслав Чемерицкий тоже отмечает, что первая часть «Летописца великих князей литовских» «напісана жыва і цікава, як бы на адным дыханні, і вылучаецца надзвычайнай цэласнасцю і маналітнасцю», тогда как вторая часть носит фрагментарный характер и ее язык и стиль «даволі выразна вылучаюцца сваёй царкоўнаславянскай, кніжнай афарбоўкай, архаічнасцю моўных форм»[16].

Большое значение имеет точное установление стыка, своеобразной границы между текстами первой и второй частей «Летописца великих князей литовских». По обоснованному мнению Феоктиста Сушицкого, вторая часть «Летописца» начинается сразу после сообщения о первом отъезде Витовта в Пруссию, которым завершается «Origo regis»[17]. Надежда Морозова, проанализировав языковые особенности «Летописца великих князей литовских» (по Виленскому списку как лучше всего сохранившемуся), пришла к выводу, что первая часть «Летописца» написана на «руськом» (по ее терминологии) языке, в котором основной глагольной формой прошедшего времени является перфект без связки. Вторая же часть создана на «гибридном церковнославянском» языке с преобладанием аористов и перфектов со связкой[18]. Таким образом, определить начало второй части «Летописца великих князей литовских» можно и с учетом особенностей языка. Однако некоторая путаница в этом вопросе возникла в связи с работами Валентины Мороз. Повторив некоторые наблюдения Н. А. Морозовой, В. К. Мороз отметила, что точно разделить текст на отдельные структурные части можно, в частности, по таким языковым признакам, как полногласие и неполногласие, использование глагольных форм аориста и перфекта и т. д.[19] Исходя из этого, исследо-

15 J. Jakubowski, *Studia nad stosunkami narodościowymi*, s. 14, 17-21.

16 В. А. Чамярыцкі, *Беларускія летапісы*, с. 103.

17 Т. Сушицький, *Західньо-руськи літописи*, с. 149.

18 Н. А. Морозова, *Виленский список «Летописца великих князей литовских» — языковые особенности и состав*, „Kalbotyra: mokslo darbai. Slavistica Vilnensis 1995", Vilnius 1997, nr 45 (2), s. 38-39.

19 В. К. Мароз, *Летапісы і хронікі ў кантэксце фарміравання беларускай літаратурнай мовы старажытнага перыяду. Манаграфія*, Мінск 2011, с. 71.

вательница посчитала, что первая часть «Летописца великих князей литовских» завершается на словах «И оттолѣ почал крестити Литву у латынскую вѣру, и прислал арцибискуп бискупа к Вилни в литовскую землю», а вторая часть начинается с описания похода князя Андрея Ольгердовича на Литву («и тогда начяша стави костелы в всеи Литовъскои земли»)[20].

Существует ряд контраргументов, которые не позволяют принять это мнение. Во-первых, кажется невозможным, чтобы граница между двумя частями «Летописца» проходила посреди логически завершенной и целостной фразы: «И оттолѣ почал крестити Литву у латынскую вѣру, и прислал арцибискуп бискупа к Вилни в литовскую землю, и тогда начяша стави костелы в всеи Литовъскои земли». Цитируемая фраза в полной мере соответствует критериям, которые указала Н. А. Морозова для текста, написанного на «гибридном церковнославянском» языке, то есть объединяющего в себе элементы как церковнославянского, так и руского языка. Иначе говоря, вся эта фраза целиком могла входить в состав второй части «Летописца великих князей литовских». Во-вторых, необходимо учитывать фактор «Origo regis», то есть принимать во внимание, на каких словах завершается латинский перевод первой части «Летописца великих князей литовских». В-третьих, В. К. Мороз, получается, оставляет в первой части «Летописца» фразу, явно написанную с элементами церковнославянского языка: «Бывшоу же ему в Немцех и оу Маринеграде оу мистра, приехаша к нему мнози князи и бояре Литовьскыи» и т. д. (цитируется по Виленскому списку). Здесь наблюдаются такие черты, как дательный самостоятельный, форма аориста. Для объяснения возникающего противоречия В. К. Мороз называет эту фразу «небольшой вставкой» в первой части «Летописца»[21], но в этом случае непонятно, почему таких вставок на церковнославянском языке нет в остальном тексте первой части. Этих противоречий можно избежать, признав, что первая часть «Летописца великих князей литовских» заканчивается там же, где завершается и латинский перевод «Origo regis», а именно на словах об отъезде Витовта в Пруссию (см. ниже таблицу).

[20] Там же, с. 71, 76.

[21] В. К. Мароз, *Мова беларускага летапісання: «Летописец великих князей литовских»*, «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Серыя 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія», 2009, № 1, с. 61.

	Конец первой части «Летописца великих князей литовских»	**Начало второй части «Летописца великих князей литовских»**
«Origo regis»	...ad Theutunicos properauit.	
Виленский список	И оутекъ з города въ Нѣмци и оу Прусы.	Бывшоу же ему в Нѣмцех и оу Маринѣ градѣ оу мистра приехаша к немоу мнози князи и бояре Литовьскыи
Академический	Да оутекь оу Нѣмци оу Прусы.	Соущю ж ему оу Нѣмцахь оу Марьинѣ градѣ у мистра приехаше к нему мнози князи и бояре Литовьскии.
Слуцкий	И оутечеть оу Немци и Пруси.	Соущу ж емоу оу Немцах оу Марьине городѣ оу мистра и приехавша к нему мнози князи и бояре Литовьскии.
Супрасльский	И оутечеть во Немци оу Пруси.	Соущю же емоу в Нимцах в Марине городѣ в мистра и приѣхаша к немоу многи князи и бояре литовъскии.

Стилистическая и языковая целостность первой части «Летописца великих князей литовских» убедительно свидетельствует о том, что при ее создании нарративные (например летописные) источники даже если и привлекались, то были глубоко переработаны и не включались в текст в своем исходном виде. Противоположная картина наблюдается во второй части «Летописца великих князей литовских», которая как будто составлена из множества разнородных и в языковом, и в стилистическом отношении фрагментов-лоскутов. Это подтверждается и результатами лингвистического анализа, который провела в цитировавшейся выше работе Н. А. Морозова. По ее мнению, чередование фрагментов на церковнославянском и руском языке во второй части «Летописца» может быть обусловлено причинами не лингвистического, а текстологического характера[22]. Иными словами, пестрота языка второй части «Летописца» объясняется тем,

[22] Н. А. Морозова, *Виленский список «Летописца великих князей литовских»*, с. 39-41.

что эта часть составлена из разных исходных материалов и языковую разницу между этими материалами не устранила даже их поверхностная редакторская обработка. К руским Н. А. Морозова отнесла фрагменты о возвращении Витовта в Литву, крещении и коронации Ягайла в Кракове, битве близ Вейшишек, взятии Кривого города в Вильно, походе Скиргайла на Черкассы и Звенигород. Возможно, источником для некоторых из этих и других фрагментов, написанных с преобладанием руского языкового элемента, стали какие-либо документальные, эпистолярные или делопроизводственные материалы из государственного архива ВКЛ. В то же время при создании целого ряда фрагментов второй части «Летописца», написанных с преобладанием церковнославянского элемента (например о браке княжны Софьи Витовтовны и московского великого князя Василия Дмитриевича, о смерти князя Скиргайла в Киеве и другие), вероятно, в качестве текстологического, фактологического или стилистического источника использовались русские летописи. Впрочем, в некоторых случаях, на наш взгляд, целесообразно отличать языковую основу тех или иных фрагментов от их стилистического декора. Так, многие фрагменты, написанные в своей основе на руском языке, не исключено, были по стилистическим соображениям «приукрашены» автором с помощью церковнославянской лексики, чтобы приблизить их звучание к высокому стилю, характерному для религиозных текстов, да и для древнерусских летописей тоже.

Во всяком случае возникает вопрос, какие же конкретно летописи использовались при создании второй части «Летописца великих князей литовских»? Несмотря на то, что история изучения летописания ВКЛ насчитывает уже почти два столетия, удовлетворительного решения эта проблема до сих пор не получила. Безусловно, она теснейшим образом связана с вопросом о происхождении выборки общерусских летописных известий, включенной в первый летописный свод ВКЛ наряду с «Летописцем великих князей литовских». Поколение исследователей, работавшее в конце XIX — начале XX столетия, по объективным причинам еще не могло ответить на оба этих вопроса — по той простой причине, что на тот момент не были изданы многие важнейшие общерусские летописные своды (например Рогожский летописец, Московский свод конца XV в.), а связи между ними тогда не были изучены в достаточной мере. Исключение составлял, конечно, Алексей Шахматов, но он занимался летописными источниками всего древнейшего свода ВКЛ в целом, а конкретно «Летописец великих князей литовских» не изучал. Так, С. Смолька вообще предполагал, что автор второй части «Летописца великих князей литовских» писал «snać z pamięci» (то есть опираясь на собственную память) и что

выборка общерусских летописных известий в первом летописном своде ВКЛ создана на основе общего источника с Воскресенской летописью, а именно на основе гипотетической смоленской летописи за 1395-1418 гг.[23] Ему возразил Антони Прохаска, указавший на целый ряд параллелей между второй частью «Летописца великих князей литовских» и Воскресенской летописью — в сообщениях о крещении Ягайла в Кракове, о войне 1386 г. (осаде Мстиславля смоленскими войсками), о женитьбе московского великого князя Василия Дмитриевича на княжне Софье Витовтовне, о смерти Ульяны Александровны, о встрече Витовта с Василием Дмитриевичем в Смоленске. Таким образом, А. Прохаска считал неоспоримым тот факт, что вторая часть «Летописца великих князей литовских» создана с привлечением какой-то русской летописи, следы которой сохранились в Воскресенском летописном своде XVI в.[24] С ним, однако, не согласился Иван Тихомиров, отметивший, что известия летописей ВКЛ и общерусских летописных сводов (например Воскресенского) об одних и тех же событиях носят разную идеологическую окраску и направленность. Например, эпизоды про битву под Мстиславлем 1386 г., про поездку княжны Софьи Витовтовны в Москву в летописях ВКЛ написаны с литовской точки зрения, а в общерусских сводах — соответственно со смоленской и с московской. Исключение И. А. Тихомиров сделал только для известия о взятии Смоленска Витовтом и о войне его с Рязанью, которое и в летописях ВКЛ, и в общерусских сводах восходит, по его мнению, к общему источнику[25]. Объективно говоря, представленная И. А. Тихомировым аргументация по этим вопросам кажется слабой, так как он почему-то отказался учитывать то обстоятельство, что заимствованные летописные статьи во второй части «Летописца» могли подвергаться редактированию с литовских политических позиций. Ф. П. Сушицкий, в свою очередь, утверждал, что вторая часть «Летописца великих князей литовских» написана на основе неких гипотетических памятников смоленского летописания конца XIV — начала XV в.[26], однако не представил убедительных текстологических доводов — прежде всего для обоснования тезиса о том, что это была именно смоленская, а не какая-либо общерусская летопись. Сопоставляя точки зрения этих четырех ученых, вплотную занимавшихся вопросом о летописных источниках второй части «Летописца великих

[23] S. Smolka, *Najdawniejsze pomniki*, s. 24-25, 53.
[24] A. Prochaska, *Latopis litewski*, s. 17-19.
[25] И. А. Тихомиров, *[Рец.:] A. Prochaska, Latopis litewski*, с. 257-258; он же, *О составе*, № 3 (март), с. 10-11.
[26] Т. Сушицький, *Західньо-руськи літописи*, с. 153-156.

князей литовских», мы видим, что наиболее обстоятельно подошел к его решению А. Прохаска, которому удалось на весьма скудном доступном ему летописном материале сформулировать в целом правильные, хотя и нуждающиеся в уточнениях выводы.

Важный вклад в изучение рассматриваемой проблематики внесли ученые, исследовавшие выборку общерусских летописных известий, включенных в состав первого летописного свода ВКЛ. По мнению А. А. Шахматова, источниками для первого летописного свода ВКЛ послужили общерусская летопись в западнорусской обработке, составленная в Смоленске на основе митрополичьего свода, доведенного до 6954 (1446) года, а также Новгородская IV летопись, Софийская I летопись первой редакции и некоторые западнорусские летописные источники[27] (надо понимать, смоленские записи о событиях 30-х — 40-х гг. XV в.). Затем к этой общерусской летописи был присоединен текст «Летописца великих князей литовских», и так образовался протограф свода по Супрасльскому списку[28].

Михаил Приселков отметил, что вся часть выборки общерусских летописных известий в первом летописном своде ВКЛ до 6817 (1309) г. представляет собой заимствование из Новгородской IV летописи. Известия с 6818 (1310) г. по 6893 (1385) гг. обнаруживают сходство с Троицкой и Симеоновской летописями, отражающими общерусский свод митрополита Киприана 1408 г., в котором особое внимание уделялось московским политическим тенденциям и реалиям. Известия с 6893 (1385) по 6926 (1418) гг. схожи с Софийской I летописью древнейшей редакции по спискам Оболенского и Карамзина. Остальная часть по 1446 г. создана на основе митрополичьей летописи, продолжавшей гипотетический Полихрон Фотия 1418 г.[29]

Несколько к иным выводам пришел В. А. Чемерицкий. Выборка общерусских летописных известий сделана, по его мнению, на основе двух источников. Сведения с самого начала и до 1305 г. включительно, а также за 1385-1446 гг., взяты из митрополичьей летописи 1446 г., основу которой составлял гипотетический общерусский свод 1418 г., так называемый Полихрон Фотия; известия же за 1306-1388 гг. почерпнуты из свода 1408 г. (В. А. Чемерицкий назвал его сводом 1409 г.), отразившегося в Троицкой и Симеоновской летописях[30].

[27] А. А. Шахматов, *Обозрение русских летописных сводов XIV-XVI вв.*, Москва — Ленинград 1938, с. 331, 345.
[28] Там же, с. 331, 334, 345.
[29] М. Д. Приселков, *История русского летописания XI-XV вв.*, подг. к печати В. Г. Вовиной, Санкт-Петербург 1996, с. 221-224.
[30] В. А. Чамярыцкі, *Беларускія летапісы*, с. 70-76.

В свою очередь Яков Лурье счел возможным отвергнуть гипотезу о существовании Полихрона Фотия как общерусского свода, стоявшего между сводом 1408 г. и протографом Новгородской IV и Софийской I летописей[31]. По его мнению, протограф Новгородской IV и Софийской I летописей возник в 30-х — 40-х гг. XV в. как митрополичий свод общерусского характера, связанный со сводом 1408 г. (Троицкой летописью)[32]. Что же касается первого летописного свода ВКЛ (Я. С. Лурье неточно датировал его составление началом XVI в.), то его составитель заимствовал начальную часть общерусских летописных известий до 6817 (1309) г. из Новгородской IV летописи, а текст за период с 6893 (1385) по 6926 (1418) г. — из Софийской I летописи. Остальной текст за XIV и первую половину XV в. представлял собой соединение свода 1408 г. (Троицкой летописи) и краткой митрополичьей летописи, отмечающей деятельность митрополитов Фотия в 1420-1427 гг. и Герасима в 1432-1435 гг.[33]

Необходимо также сказать о гипотезе Бориса Клосса, полагающего, что автором Троицкой летописи был монах Троице-Сергиева монастыря преподобный Епифаний Премудрый, одно время выполнявший функции секретаря митрополита Фотия и скончавшийся в конце 1418 или в 1419 г.; помимо прочего, он же, по мнению Б. М. Клосса, написал несколько произведений для составлявшегося около 1418 г. летописного свода митрополита Фотия (общего источника Новгородской IV и Софийской I летописей)[34]. Для нашей темы эти выводы чрезвычайно интересны еще и потому, что составитель первого летописного свода ВКЛ был наверняка знаком с творческим наследием Епифания Премудрого и, по крайней мере, в одном случае использовал его в качестве образца. В частности, при создании «Похвального слова Сергию Радонежскому» Епифаний взял первые строки «Таину цареву добро есть хранити, а дела Божия проповедати преславъно есть...» из жития Марии Египетской[35], которое в свою очередь в данном случае основывалось на библейской книге Товита (12:7). Автор летописной редакции «Похвалы Витовта», вошедшей в первый летописный свод ВКЛ, подражая Епифанию, также начал свой панегирик аналогичны-

[31] Я. С. Лурье, *Общерусские летописи XIV-XV вв.*, Ленинград 1976, с. 107.

[32] Там же, с. 71, 113-114.

[33] Там же, с. 115.

[34] B. M. Kloss, *Determining the Authorship of the Trinity Chronicle*, „Medieval Russian Culture”, vol. II, ed. by Michael S. Flier and Daniel Rowland, Berkeley — Los Angeles — London 1994, p. 57-72; Б. М. Клосс, *Избранные труды*, т. 1: *Житие Сергия Радонежского*, Москва 1998, с. 107, 110.

[35] B. M. Kloss, *Determining*, p. 62; Б. М. Клосс, *Избранные труды*, т. 1, с. 95.

ми, хоть и несколько видоизмененными словами: «Таину таити цареву добро есть, а дела велика господаря поведати добро жь есть...»[36].

Итак, несмотря на различия в некоторых трактовках полученные указанными исследователями результаты задают общие ориентиры и для исследования летописных источников второй части «Летописца великих князей литовских».

Соотношение между «Летописцем великих князей литовских» и Воскресенской летописью. Начнем этот обзор мы не с действительной, а с мнимой связи, то есть с летописи, которая на самом деле источником для «Летописца великих князей литовских» не является.

Автор второй части «Летописца», как известно, не знал о происхождении польской королевы Ядвиги, поэтому ошибочно назвал ее единственной дочерью польского короля Казимира, хотя она была младшей дочерью венгерского и польского короля Людовика из Анжуйской династии. Аналогичная ошибка отразилась также в «Повести о Подолье» и Воскресенской летописи — своде, доведенном до 1541 г. и составленном на основе московских летописей.

«Летописец великих князей литовских» по Виленскому, Академическому и Супрасльскому спискам	Короля Казимира краковского в животе не стало, и сынов в него не было, только одна дочка (именемь) Ядвига. И почали ляхове слати с Кракова к великому князю Ягаилу, абы принял крещение старого Рима и понял бы в них королевну Ядвигу и стал бы в них королем в Кракове и на всеи Лядскои земли[37].
Сексуальныя стасункі ў шлюбе. З пункты гледжання рэлігіі законнымі і натуральнымі лічыліся сексуальныя стасункі ў шлюбнай пары. Адмова ў сексе партнёру лічылася грахом[31], а „блуду” неабходна было пазбягаць[32].

Інтымнае жыццё пачыналася пасля вянчання і вяселля. Першы сексуальны кантакт адбываўся ў пэўным сэнсе публічна. У першы вясельны вечар пару вялі ў ложак, і праводзіўся абрад пакладзіны. Гэта важны элемент у ланцугу шлюбных абрадаў. Па сутнасці ён паказваў

[27] О. Левицький, *Сім'я і побут українців у XVI ст.*, [у:] *На переломі. Друга половина XVI ст.*, Київ 1994, с. 221-224.

[28] М. В. Довнар-Запольский, *Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках*, [у:] *Исследования и статьи*, т. 1: *Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность*, Киев 1909, с. 73-81.

[29] Падрабязней пра вена і вяноўныя запісы гл.: Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ у XVI-XVII стст.*, Смаленск 2015, с. 159-204.

[30] L. Stone, *The Family, Sex, and Marriage in England, 1500-1800*, New York — Hagerstown — San Francisco — London 1977, s. 501-502, 607-610; M. Ingram, *Church courts, sex and marriage in England, 1570-1640. (Past and present publications)*, Cambridge 1987, p. 219-237.

[31] *Собрание припадков краткое*, Супрасль 1722, с. 85 адв.; Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 297.

[32] Л. Зизаний, *Сия книга глаголемая Катихисис*, [Москва] 1627, с. 181.

асноўную мэту заключэння шлюбу — сексуальныя стасункі і працяг роду. Палавы акт замацоўваў шлюб і рабіў яго канчаткова здзейсненым. Прычым гэта набывала грамадскае значэнне, бо прысутнічала пры провадах уся грамада. Гэты абрад адбываўся нават пры шлюбе кіраўнікоў дзяржавы. На вяселлі вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста і чэшскай каралевы Альжбеты пакладзіны былі праведзены на наступны дзень пасля яе каранацыі 17 мая 1543 года[33]. Звычай меў месца і на сучаснай тэрыторыі Украіны[34].

Шляхецкія пакладзіны суправаджаліся спецыяльнымі для гэтага выпадку прамовамі: запрашэнне панны ў ложак, аддаванне панны ў ложак, падзяка за панну ў ложку, падзяка за добрае выхаванне, адказ на падзяку[35]. У просьбе аб панне ўвага надавалася не толькі каханню. З яе можна зразумець, што ложак — гэта месца, дзе перамагала каханне. У ім здзяйснялася „бітва”, дзе актыўную ролю меў мужчына. Там ён атрымліваў доказ цноты[36]. Заўважым, што ў прамовах няма адкрытага апісання сексуальных стасункаў. Усё перадаецца праз услаўленне шлюбу, жаніха і нявесты. У беларускай народнай традыцыі пакладзіны мелі не менш важнае значэнне. Увечары шлюбную пару суправаджалі да каморы з песнямі і жартамі на сексуальную тэму[37].

Найбольш інтэнсіўны перыяд для сексуальных стасункаў быў у першыя месяцы шлюбу[38]. Ад пары чакалі нашчадкаў і часта першая цяжарнасць наступала ў першы год сумеснага жыцця. Аднак гэты бок жыцця практычна схаваны ў дакументах. У сямейных хроніках знаходзім толькі інфармацыю пра нараджэнне дзяцей, іх шлюбы.

Абмежаванні ў інтымным жыцці сям’і накладалі фізіялагічныя асаблівасці. Стасункі паміж мужчынам і жанчынай не здзяйсняліся падчас цяжарнасці, менструацыі[39], хваробы. Па прычыне хваробы

[33] *Полное собрание русских летописей (*далей: *ПСРЛ)*, т. 35: *Летописи белорусско-литовские*, Москва 1980, с. 237.

[34] О. Левицький, *Сім’я і побут українців у XVI ст.*, с. 221.

[35] M. Trębska, *Staropolskie szlacheckie oracje weselne. Geneologia, obrzęd, źródła*, Warszawa 2008, s. 231-244.

[36] НГАБ у Гродне, ф. 1663, воп. 1, спр. 426, арк. 2, адв., 3 адв.

[37] Прыклады жартаўлівых спеваў з эратычным падтэкстам гл.: М. Ф. Федароўскі, *Люд беларускі*, Мінск 1991, с. 136-137. Апісанне абраду каморы гл.: *Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-русский край, снаряжённой императорским географичаским обществом. Юго-западный отдел*, т. 4: *Обряды: родины, крестины, свадьба, похороны*, собр. П. П. Чубинский, Санкт-Петербург 1877, с. 434-450.

[38] Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 136.

[39] Michalonis Lituani, *De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum fragmina X, multiplici historia referta*, Basillae 1615, s. F. 27; М. Литвин, *О нравах татар, литовцев и москвитян*, Москва 1994, с. 90.

Ядвіга Юр'еўна Насілоўская не магла задаволіць сексуальныя патрэбы мужа Грыгорыя Юр'евіча Осціка. Ён знайшоў сабе каханку. Жонка даведалася пра здраду. У выніку яны развяліся (1566)[40].

У сямейным жыцці секс меў важнае значэнне. Праз яго здзяйснялася пракрэатыўная функцыя сям'і. Гэта быў адзіны магчымы шлях для нараджэння дзяцей. Да таго ж наяўнасць сталага партнёра давала магчымасць зняць сексуальнае напружанне. Нават калі ў грамадстве не дэкларавалася адкрыта важнасць інтымнага жыцця, то гэта разумелася.

Месцы для стасункаў. У першую чаргу як месца для сексуальных стасункаў варта згадаць дом. Так як у ВКЛ у той час былі чатыры сезоны, то ў халодны перыяд для шлюбных і пазашлюбных кантактаў памяшканні мелі важнае значэнне. Дом — гэта шматфункцыянальная пабудова. Канечне, немагчыма сцвярджаць, што ён будаваўся выключна для таго, каб там займацца сексам. Месцы для пражывання ўладкоўваліся ў адпаведнасці са статусам і заможнасцю.

Шляхецкі маёнтак уяўляў сабой цэлую гаспадарчую сістэму, якая складалася не толькі з дома[41]. Пры ім знаходзіліся кухня, пякарня, сырнік, стайня, бровар, лазня і інш. Мы не выключаем магчымасць выкарыстання гэтых будынкаў не па прызначэнню. У асноўным шляхецкія маёнткі будаваліся з дрэва, аднак былі і мураваныя замкі (Мір, Нясвіж, Гайцюнішкі і інш.)[42]. У сувязі з палітычнай дзейнасцю шляхта мела дамы ў гарадах. Аднак яны адрозніваліся ад маёнткаў. У сувязі з абмежаванай гарадской плошчай у іх былі толькі неабходныя пабудовы: невялікі дом, стайня, вазоўня, кухня[43].

[40] НГАБ, КМФ-18, спр. 262, арк. 350-361 адв.

[41] Захавалася шмат інвентароў за перыяд XVI-XVII стст. Яны дазваляюць уявіць выгляд шляхецкага маёнтка. *Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею* (далей: *АВАК*), т. 14: *Инвентари имений XVI-го столетия*, Вильна 1888; *АВАК*, т. 25: *Инвентари и разграничительные акты*, Вильна 1898.

[42] *Гісторыя беларускага мастацтва*, т. 1: *Ад старажытных часоў да першай паловы XVI ст.*, Мінск 1987, с. 129-156; *Гісторыя беларускага мастацтва*, т. 2: *Другая палова XVI ст. — канец XVIII ст.*, Мінск 1988, с. 10-22; В. У. Шаблюк, *Феадальныя сядзібы XVI-XVIII стст. Верхняга Панямоння*, [у:] *Помнікі мастацкай культуры Беларусі*, Мінск 1994, с. 240-244; ён жа, *Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння: XIV-XVIII стст.*, Мінск 1996, с. 38-55; *Lietuvos architektūros istorija*, t. II: *Nou XVII a. Pradžios iki XIX vidurio*, Vilnius 1994, p. 165-177; Ю. Бохан, А. Скеп'ян, *Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV — сярэдзіне XVII стагоддзя*, Мінск 2011, с. 19-88.

[43] Н. Сліж, *Гарадзенскія падворкі ў XVII ст.*, [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI-XX ст.*, рэд. А. Ф. Смалянчук, Н. У. Сліж, Мінск 2011, с. 222-254.

Планіроўка дома і яго ўнутранае ўбранне непасрэдным чынам залежала ад статусу роду і яго фінансавых магчымасцей. Ён меў прызначэнне не толькі для пражывання, але і для дэманстрацыі месца і ролі роду ў грамадстве. Большае месца тут займала публічная прастора прызначаная для прыёмаў і спажывання ежы. Адпачывальні (каморы) адводзіліся далейшыя пакоі. Яны былі значна меншыя. У іх маглі знаходзіцца шафы, куфры, печ, стол, крэслы, лавы, ложак. Адпачывальні магнатэрыі аздабляліся дарагімі шпалерамі і апонамі, диванамі, карцінамі і абразамі[44].

У сувязі з небяспекай ад пажараў у гарадах імкнуліся спрыяць будаванню мураваных дамоў, аднак дамінавалі драўляныя[45]. Асаблівасці забудовы тагачасных гарадоў добра бачны на гравюрах Гародні Адэльгаўзера-Цюндта (1567-1568), Вільні (1583), Коўна Тамаша Макоўскага (1600) і інш. Мяшчанскае саслоўе ўладкоўвала свае дамы ў залежнасці ад заможнасці. Багатыя мяшчане ў побыце пераймалі элементы шляхецкай культуры. Напрыклад, дом берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага не саступаў дому заможнай шляхты. Ён быў мураваны, меў два паверхі. Асобны пакой быў адведзены пад адпачывальню[46]. Мяшчане сярэдняй заможнасці будавалі дамы з некалькімі жылымі памяшканнямі, каб адно з іх адвесці пад адпачывальню. У гарадах былі розныя пабудовы, рознага ўзроўню камфорту[47]. Былі нават самыя бедныя дамы, якія называлі „халупа". Пакоі і, нават, куты здаваліся ў арэнду. У такіх дамах была вялікая канцэнтрацыя людзей і малая прыватная прастора.

Сялянскія дамы былі збудаваны з дрэва, мелі двухкамерную (хата і сені) ці трохкамерную (хата, сені і камора) планіроўку[48]. Гэта азначала, што шлюбнай пары практычна не было месца для інтымнай прасторы. У адным памяшканні мясціліся дзеці, сужэнцы, сваякі. Для стасункаў трэба было чакаць пакуль усе заснуць, ці сыходзіць у гаспадарчыя пабудовы, а ў цёплы перыяд можна было выкарыстаць любое бязлюднае месца.

[44] *АВАК*, т. 20: *Акты, касающиеся города Вильны*, Вильна 1893, с. 136; Ю. Бохан, А. Скеп'ян, *Побыт феадалаў*, с. 93-130.

[45] *Lietuvos architektūros istorija*, t. II, p. 175-187.

[46] Н. Сліж, *Тастамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага, 1639 г.,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne / Беларускі гістарычны зборнік", 2014, № 42, с. 13, 21.

[47] Інвентары гарадскіх дамоў гл.: D. Frick, *Wilnianie. Żywoty siedemnastowieczne*, Warszawa 2008, s. 422-427, 553-556, 573-578; Н. Сліж, *Гарадзенскія падворкі ў XVII ст...*, с. 223-224.

[48] П. Одэрборн, *Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў*, с. 167-189; В. У. Шаблюк, *Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння*, с. 31-36.

Традыцыйна месцам у доме для сексуальных забаваў быў ложак. Гэта было адно з месцаў стасункаў каханкаў Зафеі Радзівілаўны і слугі яе мужа Станіслава Тымінскага[49]. Асаблівасці змен выгляду гэтага тыпу мэблі ў перыяд XVI-XVII стст. даволі цяжка прасачыць. Захавалася не так шмат выяў. Ложак служыў розным людзям: хворым, паміраючым, адпачываючым. Схематычна ён паказаны на іконах „Нараджэнне Маці Божай" (1649 і 1648-1650 гг.)[50], на выявах на стэле ў Фарным касцёле ў Гародні, якія прысвечаны цудам ажыўлення Юзафа Тымінскага, вылячэння Андрэя Катовіча, Барбары Сапежанкі і Канстанцыі Вадынскай (канец XVII ст. — пачатак XVIII ст.)[51].

Як вынікае з карцін і інвентароў ложкі былі драўляныя, мелі рознага віду спінкі. Іх асновай была высокая платформа, што надавала ім трываласць. Ложкі былі як прывазныя, так і выробленыя мясцовымі рамеснікамі[52]. У XVII ст. сярод шляхты і заможных мяшчан набывае папулярнасць ложак з намётам, які замацоўваўся на чатырох слупах. Заслона рабілася з каштоўнай тканіны: шоўк, аксаміт і інш.[53] Такі ложак дадаткова ствараў прыватную прастору для мужчыны і жанчыны: засланяў ад нечаканых позіркаў. Да таго ж ён утвараў прыемную інтымную атмасферу.

Да ложка дадаваліся неабходныя прыналежнасці: падушкі, пярыны (верхняя і ніжняя), коўдры, навалачкі, просціны. Пасцельная бялізна рабілася з розных тканін (даматканай, шаўковай і інш.), магла аздабляцца карункамі і вышыўкай[54]. Пра наяўнасць пасцелі і ложка згадваецца ў мяшчанскіх дакументах[55]. У інвентары маёмасці за 1651 г., якая засталася пасля Лаўрына Клічэўскага згадваліся два ложкі: ложак мужчынскі (36 грошаў літоўскіх) і ложак з верхам (24 грошаў літоўскіх)[56]. Сярод рэчаў, апісаных пасля смерці віленскай мяшчанкі Анастасіі Віт-

[49] A. Sajkowski, *Opowieści misjonarzy, konkwistadorów, pielgrzymów i innych świata ciekawych*, Poznań 1991, s. 321.

[50] Гл.: *Іканапіс Беларусі XV-XVIII стст.*, Мінск 1992, іл. № 17, 29.

[51] Н. Сьліж, *Лава ў капліцы Маці Божай Студэнцкай у фарным касьцёле Гародні*, „Arche. Другая Гародня", 2010, № 1-2, с. 70-73, 75, 76, 87-89, 94-95.

[52] Ю. Бохан, А. Скеп'ян, *Побыт феадалаў*, с. 127.

[53] M. Bartkiewicz, *Odzież i wnętrza domów mieszczańskich w Polsce w drugiej połowie XVI i w XVII wieku*, Wrocław — Warszawa — Kraków — Gdańsk 1974, s. 41-44.

[54] D. Frick, *Wilnianie*, s. 204.

[55] *XVII a. vidurio Maskvos okupacijos Lietuvoje šaltiniai*, t. I: *1657-1662 m. Vilniaus miesto tarybos knyga*, sudarė E. Meilus, Vilnius 2011, p. 162, 230, 266, 345, 362; Н. Сліж, *Тастамент берасцейскага бурмістра Станіслава Баброўскага*, с. 13, 21.

[56] Lietuvos valstybės istorijos archyvas, f. 23, ap. 1, b. 1 (SA 5096), l. 515, 517.

коўскай у 1684 г., былі два ложкі: дубовы без намёта (5 фларэнаў) і сасновы на адну асобу (2 фларэны). У доме Альжбеты Юсевічоўны быў вялікі маляваны ложак (1682)[57]. Аднак чым заможней былі гаспадары, тым больш якасная і багатая тканіна была на ложках.

Аднак у якасці ложкаў маглі выкарыстоўваць шырокія лавы ці тапчаны з 2-4 дошак, на якія клаліся сеннікі, пярыны, коўдры. На дзень гэтыя канструкцыі разбіраліся. Акрамя таго іх выкарыстоўвалі для гасцей, бо мець дадатковыя ложкі ў хаце не заўсёды было магчыма[58]. Бялізна пралася і мянялася, але як часта гэта адбывалася ў дакументах не згадваецца.

У XVI-XVII стст. замацавалася трывалая традыцыя ўключаць у пасаг прыналежнасці да ложка. Напрыклад, яны пералічваліся ў пасагу шляхцянак Ганны Рагазянкі (1562), Настассі Адамовічаўны (1614), Барбары Сынкоўскай (1670-1680-я гг.) і інш.[59], мяшчанкі Барбары Якубаўны Медзешэўскай (1675)[60], дачкі гаспадарскага каваля Мікалая Яновіча[61]. Ложак меў важнае значэнне для сужэнцаў. У пэўным сэнсе гэта была тэрыторыя жанчыны, якую важна было мець у парадку, чысціні і прыгожым аздабленні. Таму было абсалютна натуральна даваць у пасаг рэчы для ложка.

У ложак клаліся апранутымі. Для гэтага былі спецыяльныя начныя кашулі. Жанчыны часта атрымлівалі іх у пасаг[62]. Доўгія сарочкі апраналі на ноч мужчыны. Падчас раптоўнай жарсці мужчыны і жанчыны не заўсёды распраналіся, а агалялі неабходныя часткі цела. Традыцыя спаць у вопратцы была і ў іншых краінах. Калі верыць дзённіку Яна Хрызастома Паска, то ў Польшчы нават жонкі перад мужам не агаляліся перад сном. Таму яго моцна здзівіла ў Даніі норма спяць голымі. Гэта не лічылася сорамам, бо Бог такімі стварыў людзей (1658)[63].

Аднак сексуальныя дачыненні мелі месца не толькі ў ложку. Кажучы сучаснай мовай, у той час былі аматары экстрэмальнага сексу і займаліся гэтай справай там, дзе іх ахапіла жарсць. Разнастайнасць

57 D. Frick, *Wilnianie*, s. 205, 574.

58 Ю. Бохан, А. Скеп'ян, *Побыт феадалаў*, с. 124, 126.

59 Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 231-254, 488, 502-503, 514, 515.

60 НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 410.

61 Інфармацыя пра пасаг паходзіць са скаргі гаспадарскага каваля Мікалая Яновіча на гаспадарскага баярына Марціна Пашкевіча, зяця, з прычыны знікнення дачкі адзначана (1539). *АВАК,* т. 17: *Акты Гродненского гродского суда*, Вильна 1874, с. 84-85.

62 Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 503, 515.

63 *Pamiętniki Jana Chryzostoma Paska*, wyd. E. Raczyński, Poznań 1836, s. 9.

месцаў для сустрэч было ўласціва каханкам. Яны займаліся сексам пры любой магчымасці. Гэта магло адбывацца днём, а не абавязкова ноччу, бо пры наяўнасці сужэнца значна прасцей было знайсці час у дзень. Зафея Радзівілаўна і яе каханак Станіслаў Тымінскі былі заўважаны ў пакоі гаспадыні, святліцы, каморы Тымінскага, доме Б. Паўлавай (1607)[64]. Падчас памінак па жонцы Войцеха Галімскага ў берасцейскім двары Зафеі Чаховічаўны, жонкі віленскага чашніка Даніэля Набароўскага, Альжбета Шчупакоўна здрадзіла мужу, берасцейскаму радцы Лукашу Памаранскаму з чаляднікам Галімскага Янам Вярбіцкім на гарышчы (1640)[65]. Жонка Матыса Ёдэшкі — Ганна сярод белага дня кахалася з чаляднікам паручніка ў склепе (1658)[66]. У судовай справе супраць дачкі гарадзенскага ката Марціна Загурскага — Раіны адзначалася, што яе бачылі з жыдам Шымкам Хаімовічам пад грушкай у полі, якое належала касцёлу св. Мікалая, у карчме за Нёманам, на прыродзе за Нёманам (1668)[67]. Абое былі ў шлюбе і, канечне, не маглі выкарыстоўваць свае дамы для спаткання. А летам было добрае надвор’е і любіцца можна было паўсюль, галоўнае далей ад людскіх вачэй. Аднак выпадковыя сведкі заўважылі каханкаў.

Як вынікае з народнага фальклору ў сялян таксама адбываліся стасункі на прыродзе:

Куды мяне павядзеш,
Такую маладую?
На папову сенажаць,
Траву зеляную[68].

А мамачка, — мельнік,
Павёў мяне ў ельнік,
І стаў ён варажыць:
Куды мяне палажыць?
А ножкамі к дарожца,
Галоўкаю к бярозца[69].

64 A. Sajkowski, *Opowieści misjonarzy, konkwistadorów*, s. 321; J. Seredyka, *Księżniczka i chudopachołek. Zofia z Radziwiłłów Dorohostajska. Stanisław Tymiński*, Opole 1995, s. 39-40, 42, 45.

65 Лукаш Памаранскі пражываў пры двары З. Чаховічаўны. *АВАК,* т. 6: *Акты Брестского гродского суда (поточные). Акты брестского подкоморского суда. Акты Брестской магдебургии. Акты Кобринской магдебургии. Акты Каменецкой магдебургии,* Вильна 1872, с. 366-367.

66 D. Frick, *Wilnianie*, s. 114.

67 НГАБ, ф. 1800, спр. 1, арк. 164 адв.-165.

Месцы для стасункаў былі розныя: ад дому да поля. У гэтым плане жыхары ВКЛ былі не адзіныя. Напрыклад, палякі кахаліся ў ложку, гаспадарчых пабудовах, карэтах, на паляванні і іншых месцах[70].

Аднак захаваць таямнічасць падчас сексу і абараніць сябе ад прысутнасці іншых людзей было даволі складана. Інтымныя стасункі адбываліся практычна публічна. У шляхецкім падворку пражывала вялікая колькасць людзей. У драўляных дамах была добрая акустыка. Таму нават пра секс гаспадароў ведалі двор і прыслуга. Напрыклад, забавы З. Радзівілаўны і яе каханка Тымінскага ноччу чулі ўсе паненкі[71]. Шчыльна заселеныя мяшчанскія і сялянскія дамы таксама спрыялі таму, што стасункі праходзілі на відавоку.

Публічныя мерапрыемствы і месцы таксама маглі справакаваць раптоўны секс. Гэта магло адбыцца ў карчме, у гасцях, на святах, вяселлях. Жанчыны наведвалі корчмы як і мужчыны, а на святах сядзелі ўсе разам, не было падзелу на мужчынскія і жаночыя часткі. Атмасферу стваралі алкаголь, распусныя песні, жарты, танцы. Сымон Будны і Андрэй Фрыч Мадрэўскі мелі рацыю ў тым, што згаданыя рэчы прыводзяць да распусты[72]. Асаблівае нараканне было на танцы. Яны ствараюць магчымасць цялеснага кантакту, які можа перарасці ў секс.

Не менш важнае значэнне быў час для стасункаў. Хрысціяне павінны былі абіраць яго згодна з кананічным правам. Забаранялася займацца сексам у пасты, святы, серады, пятніцы, перад службай і інш.[73] Па сутнасці, асоба павінна была падпарадкоўваць сваё інтымнае жыццё рэлігійнаму календару, але не заўсёды гэта рабіла.

Публічная і прыватная прастора моцна перакрыжоўваліся. Для прыватнасці было не так шмат месца. Таму ў сэксуальных дачынен-

[68] M. Federowski, *Lud białoruski. Materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877-1905*, t. VI, Warszawa 1960, s. 37.

[69] П. В. Шейн, *Материалы для изучения языка и быта русского населения Северо-западного края*, т. 1, ч. 1: *Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях*, Санкт-Петербург 1887, с. 566.

[70] Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, Łódź 1992, s. 281-283.

[71] J. Seredyka, *Księżniczka i chudopachołek*, s. 45.

[72] *Катэхізіс: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст.,* адаптаваны тэкст, пер. з старажыт. бел. мовы Н. Кабелка, Мінск 2005, с. 122; A. Fricz Modrzewski, *O poprawie Rzeczypospolitey*, s. 53-55.

[73] J. A. Brudage, *Law, Sex, and Christian Society in Medieval Europe*, Chicago — London 1987, p. 136-137, 139-141, 152-166; Е. Левина, Се*кс и общество в мире православных христиан, 900-1700*, [в:] *„А се грехи злые смертные...": Любовь, эротика и сексуальная этика в доиндустриальной Росии (X — первая половина XIX в.)*, ред. Н. Пушкарёва, Москва 1999, с. 303-307.

нях не заўсёды можна было захаваць інтымную прастору. Яна парушалася як у доме, так і на прыродзе. Але ў доме была магчымасць спецыяльна ўладкаваць месца для сну і сексу. Калі жарсць ахапіла раптоўна, то на месца ўжо не звярталася асабліва ўвагі.

Патэнцыя і імпатэнцыя. Важным элементам сексуальных адносін была мужчынская патэнцыя. Было вядома, што палавы акт для мужчыны заканчваўся семявывяржэннем. У працы Псеўда-Арыстоцеля сярод іншага тлумачылася ўтварэнне спермы. Яна ад мозгу ішла праз пячонку, сэрца і даходзіла да патрэбнага органа. А белы яе колер утвараўся ад косці. Аднак само стварэнне семені мела дзве версіі: або з часткі цела або з вадкасці цела. Пры гэтым пры тлумачэнні немагчымасці зачацця звярталася ўвага не толькі на праблемы ў жанчын, але і ў мужчын. Не спрыяла пракрэацыі больш халодная прырода мужчыны, вадзяністае семя, рознасць тэмпераментаў мужчыны і жанчыны[74].

Пік сексуальнай актыўнасці мужчыны прыходзіўся на маладосць. Як адзначала прымаўка: „Kto w zieleni, żenić się nie leni"[75]. Аднак здольнасць зачаць дзіця некаторыя маглі захаваць у пачэсным узросце. Пліній Старшы адзначаў пра патэнцыю мужчын нават у 86 год, а таксама пра выпадкі плоднасці пасля 70 год сярод людзей нізкага стану[76]. Вядома, што гетман ВКЛ Канстанцін Астрожскі ажаніўся першы раз з Таццянай Сямёнаўнай Гальшанскай у 1509 г., калі яму было 49 год. Праз два гады яна нарадзіла сына Ілью. Другога сына Канстанціна Васіля і дачку Зафею ён меў у другім шлюбе з Аляксандрай Слуцкай. На момант нараджэння сына Канстанцін Астрожскі быў прыкладна ў 65-гадовым узросце[77].

Пра жарсці і сексуальную моц ва ўзросце пісаў Ян Каханоўскі ў вершы „Да дзеўкі („Do dziewki"):

...Nie uciekaj, ma rada, wszak wiesz: im kot starszy,
Tym, pospolicie mówią, ogon jego twardszy,
I dąb choć mieścy przeschnie, choć list na nim płowy
Przedsię stoi potężnie, bo ma korzeń zdrowy[78].

[74] *Problemata Aristotelis ac philosophorum medicorumque complurium*, Paganus 1557, p. 110-113, 123.

[75] *Proverbiorum Polonicorum*, centuria 7: 80.

[76] Працы Плінія Старшага былі вядомы ў ВКЛ. *K. Pliniusza Starszego Historyi naturalnej ksiąg XXXVII = C. Plinii Secundi Historiae naturalis libri XXXVII*, t. 3, ks. 7-9, tł. J. Łukaszewicz, Poznań 1845, s. 47-49.

[77] T. Kempa, *Konstanty Wasyl Ostrogski (ok. 1524/1525-1608), wojewoda kijowski i marszałek Ziemi Wołyńskiej*, Toruń 1997, s. 16-115.

[78] J. Tuwim, *Cztery wieki fraszki polskiej*, Warszawa 1957, s. 28.

У кнізе прымавак Саламона Рысінскага частка гэтага верша сустракаецца як прымаўка: „Im kot starszy, tym ogon twardszy”[79]. А іншая прымаўка пацвярджае думку: „Stary, ale jary”. Але адносна шлюбу старога з маладой пададзена іншае меркаванне: „Kiedy się stary z młodą ożeni, tedy właśnie, iakoby w stary wóz szalone konie założył”[80]. Народная мудрасць бачыла розніцу паміж сексам і шлюбам.

Мужчынская сіла праяўлялася ў дзецях. Для шляхты было важным пакінуць пасля сябе нашчадкаў мужчынскага полу для працягу роду. Мікалай Радзівіл Сіротка (1549-1616) у 1579 г. пісаў свайму сваяку гетману польнаму ВКЛ Крыштафу І Радзівілу (1547-1603): „... bo to prawie sztuka, i Moskwę pobić i dziecię urobić, nie każdemu to można”[81]. Калі верыць лісту М. Радзівіла, то гетман быў рэдкім мужчынам і ў бітве, і ў ложку. На той час гетману было 32 гады, у гэтым узросце, як правіла, на патэнцыю яшчэ не наракаюць.

Дадзенае выказванне з'яўляецца цікавым прыкладам параўнання вайсковай моцы і мужчынскай патэнцыі. Для тагачаснага грамадства відавочнай праявай мужчынскай фізічнай сілы была спрытнасць у вайсковай справе. Фізічна развіты і загартаваны мужчына мог пераносіць паходы. Аднак гэтага было недастаткова для паспяховага ваяра. Ён павінен быў добра валодаць зброяй, стратэгіяй і тактыкай, каб перамагаць ворага. Вайсковая дзейнасць, па сутнасці, была публічнай дэманстрацыяй мужчынскай моцы. Сексуальная патэнцыя мужчыны непасрэдна асацыявалася з яго ўменнем ваяваць. Стасункі з жанчынай параўноўваліся з вайной, якую мужчына заваёўваў і скараў. А вынікам перамогі станавілася нараджэнне дзіцяці. Таму выйграная бітва і нашчадкі былі публічнай дэманстрацыяй мужчынскай патэнцыі, якая шанавалася ў грамадстве.

Візуалізацыю мужчынскай вайсковай сілы можна было пабачыць у своеасаблівым „алтары мужчынскай патэнцыі” ў касцёле св. Пятра і Паўла ў Вільні, які заснаваў гетман ВКЛ Міхаіл Казімір Пац. Зараз яго атрыбуты стаяць у іншых месцах. З левага боку каля галоўнага алтара знаходзіцца алтар з цудатворнай іконай Маці Божай. Ён змешчаны паміж дзвюма калонамі, якія падтрымліваюць скульптуры на-

[79] У бібліятэцы Рысінскага былі творы Каханоўскага, таму цікавыя выказванні ўвайшлі ў яго кнігу. Г. Я. Голенченко, *Крупные светские частновладельческие библиотеки Белоруссии и Литвы второй половины XVI — середины XVII в.*, [у:] *Федоровские чтения, 1982*, Москва 1987, с. 112.

[80] *Proverbiorum Polonicorum*, p. C, centuria 4:80; centuria 15:10; p. D 3, centuria 7:10.

[81] Ліст ад 2 красавіка 1579 г. *Archiwum domu Radziwiłłów*, t. VIII, Kraków 1885, s. 15.

палову аголеных мужчын барочнага целаскладу. На падлозе стаялі два вайсковыя барабаны і куфар. Найбольшую цікавасць прадстаўляе гэты прадмет мэблі, які належаў фундатару. Ён аздоблены выявамі герба ўладальніка. Паміж імі змешчаны вайсковец. Замок ад куфра знаходзіцца на месцы чэлеса. Калі ўставіць ключ у замок, то атрымліваецца адпаведная двухсэнсоўная карцінка.



Выява з куфра гетмана ВКЛ Міхаіла Казіміра Паца (фотаздымак Тацяны Вароніч).

Дзякуючы Яну Длугашу, да нас дайшла інфармацыя пра шалёны тэмперамент вялікага князя Вітаўта. Ён пасля заключэння міру з зяцем Васілём І, маскоўскім князем[82], кінуў войска і на кані паспяшыў

[82] *ПСРЛ*, т. 32: *Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного*, Москва 1975, с. 77-78.

да жонкі Ганны. У хроніцы адзначаецца, што Вітаўт „jako człowiek nader skłonny do roskoszy miłosnych i chętnie im hołdujący”[83]. Пасля гісторыя знайшла водгук у Марціна Кромера[84] і Мацея Стрыйкоўскага:

O wtorey woynie Witoldo, wen z zięcie Basiliem Moskiewskim,
a o złości Swidrigiełowey 1407 & 1408

...A Witold skoro pokoy z zięciem concludował,
Na rozsadzonych koniach k Wilnu appelował,
Do żony, bo go Wenus piekła na dzień każdy,
A też zwyczay przed woyskiem ieżdzać miewał zawżdy,
Woyska w nieprzyiacielskiey ziemi się zostały,
Ktore bez wodza zewsząd szkody potykały...[85]

У частцы прысвечанай смерці Вітаўта Ян Длугаш, сярод іншага, зноў адзначаў хцівасць вялікага князя да жанчын. Для задавальнення жарсці ўтрымліваў наложніц пры двары (1430)[86]. Вялікі князь меў хударлявы целасклад, вёў актыўны лад жыцця, не ўжываў алкаголю. Гэта дазволіла яму на доўгі час захаваць патэнцыю і здольнасць да сексуальных забаў. Але такую характарыстыку Вітаўта дае толькі Длугаш. У летапісах ВКЛ засяроджваецца ўвага толькі на яго вайсковай і дзяржаўнай дзейнасці. Інфармацыю прадстаўленую Длугашам цяжка ўспрымаць як выключна праўдзівую, бо ён такім чынам прадстаўляў Вітаўта як дзяржаўнага дзеяча, які не зусім адпавядае класічным еўрапейскім патрабаванням хрысціянскага рыцара. Варта адзначыць, што ў наступныя стагоддзі дзейнасць Вітаўта стала прыкладам для нашчадкаў.

Сярод апантаных аматараў жанчын згадваліся вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст, канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл. Напрыклад, у ма-

[83] J. Długosz, *Roczniki czyli kroniki sławnego królewstwa polskiego*, ks. 10-11, Warszawa 2009, s. 25-26.

[84] *Kronika polska Marcina Kromera biskupa warmińskiego ksiąg XXX: dotąd w trzech językach, a mianowicie w łacińskim, polskim i niemieckim wydana, na język polski z łacińskiego przełożona przez Marcina z Błażowa Błażowskiego i wydana w Krakowie w drukarni M. Loba r. 1611*, Sanok 1857, s. 767.

[85] M. Stryjkowski, *Kronika*, Królewiec 1582, s. 517-518.

[86] „Ale bardzo wielu mówi, że książę do tego stopnia szukał przygód z kobietami, że tak był lubieżny i skłonny do miłostek, że nieraz tuż przez nadchodzącym zwycięstwem zostawiał wojsko na ziemi wroga. Przemierzając wiele ziem i zmieniając konie wracał zwykle do żony i do nałożnic, by zaspokoić palącą żądzę”. J. Długosz, *Roczniki czyli kroniki sławnego królewstwa polskiego*, ks. 11, Warszawa 2009, s. 318.

ладосці Жыгімонт Аўгуст любіў разам з сябрамі рабіць распусныя вечарыны з удзелам дзяўчат[87]. Пра яго ў летапісе пісалася: „Потом король Август, кгды поховал тело королевое, малжонки своее, будучи пан молоды, не могучи здержати прирожоное хтивости своеи ку белым головом, почал миловати паню Барбару Радивиловну”[88]. У гэтым урыўку адназначна паказваецца, што Жыгімонт Аўгуст у маладым узросце любіў жанчын і не мог стрымліваць сваіх жаданняў.

У рэлігійнай палеміцы часта гучала абвінавачванне духавенства розных канфесій у распусце, што пацвярджаецца судовымі выпадкамі[89]. Народная культура прыпісвала найбольшую пажадлівасць служыцелям хрысціянскага культу — папам і ксяндзам[90]. У калекцыі М. Федароўскага ёсць такі верш:

О там на грузду
Прадаваў поп пізду,
А хлопчыкі купавалі[91].

Праблема мужчынскай сілы і яе захавання турбавала Міхалона Літвіна. Ён прыязна ставіўся да палігаміі ў татараў. Жонка ў іх бралася для нараджэння дзяцей. А ў сувязі з тым, што жанчына не заўсёды даступна для сексу па прычыне менструацыі ці цяжарнасці, і не ўсе жанчыны могуць мець дзяцей, то наяўнасць другой жонкі дае магчымасць пакінуць нашчадкаў. Літвін вельмі ўхваляў ашчаднае стаўленне татар да сваёй спермы. Яны не раскідваюць для задавальнення хцівасці, а выкарыстоўваюць толькі для нараджэння дзяцей[92].

У гэтым сцвярджэнні прасочваецца ўяўленне, што рэдкія сексуальныя стасункі робяць сперму мужчыны больш якаснай, а частыя — аслабляюць патэнцыю і сілу мужчыны. Аднак тут заўважна даволі павярхоўнае прадстаўленне тэмы. Літвін або не ведаў дэталёва пра практыку стрымання семявывяржэння, або не хацеў пра яе грунтоў-

[87] R. Hejdensztejn, *Dzieje Polski od śmierci Zygmunta Augusta do roku 1594*, księga XII, tom 1, Petersburg 1867, s. 7, 153; Z. Kuchowicz, *Miłość staropolska*, Łódź 1982, s. 429.

[88] *ПСРЛ*, т. 35, с. 282.

[89] J. Tazbir, *Dewiacje obyczajowe*, [w:] *Studia nad kulturą staropolską. Prace wybrane*, t. 4, red. S. Grzybowski, Kraków 2001, s. 254, 259; Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 333, 352-354, 376.

[90] У. Лобач, *Эрас у беларускай традыцыйнай культуры*, с. 241-242.

[91] Gabinet Rękopisów Biblioteki Uniwersytetu Warszawskiego, sygn. 441, k. 474.

[92] Michalonis Lituani, *De moribus tartarorum, lituanorum et moschorum*, p. 27; М. Литвин, *О нравах татар, литовцев и москвитян*, с. 90.

на распавядаць. Татары, як туркі і арабы, былі знаёмы з даасізмам. Ён прыйшоў з Кітая і меў добра распрацаваныя падручнікі па тэхніцы сексу. На гэты аспект жыцця звярталася шмат увагі, бо ён быў адным з элементаў неабходных для доўгага і здаровага жыцця. Згодна з вучэннем мужчына павінен падоўжваць палавы акт на максімальны доўгі перыяд часу для таго, каб атрымаць больш энергіі ад жанчыны. Найвышэйшага піку энергія жанчыны дасягае падчас аргазму, таму мужчына абавязаны давесці яе да гэтага стану. Для стрымання семявывяржэння існавалі дзве тэхнікі *coitus reservatus* і *coitus obstructus*. Першая тэхніка патрабавала высокай канцэнтрацыі ў апошні момант: мужчыне трэба было заплюшчыць вочы, прыціснуць язык да нёба, выгнуць спіну і напружыць шыю. Такім чынам, семявывяржэнне не здзейсніцца і сперма застаецца ўнутры. Другая тэхніка таксама выкарыстоўвалася перад вывяржэннем. Мужчына хутка заціскаў указальным і сярэднім пальцамі левай рукі месца паміж машонкай і заднім праходам. Такім чынам семя пераводзілася ў мочаспускальны канал. Акрамя таго, былі рэкамендацыі па семявывяржэнні ў залежнасці ад пары года, узросту і целаскладу. Напрыклад, моцны мужчына ў 15-20 год можа выпускаць семя два разы ў дзень, слабы — адзін; у 30 год — раз у дзень, слабы — раз у два дні. З узростам норма змяншалася. Пры гэтым канцэпцыя і тэхніка палавога акту для папаўнення энергіі і для зачацця дзіця адрознівалася[93].

Гэта тэхніка была даволі складанай і не кожны мужчына мог ёю авалодаць. Пры гэтым яна мела шмат пераваг. Стрыманне семявывяржэння дазваляла рабіць кантроль над нараджальнасцю, канечне, не заўсёды на 100%, але дастаткова эфектыўна. Акрамя таго, жаночы аргазм наступае пазней за мужчынскі і мае больш складаны механізм[94], а доўгі палавы акт спрыяе інтарэсам жанчыны і даводзіць яе да максімальнага задавальнення. Аднак у даасізме рабілася гэта ў першую чаргу для папаўнення энергіі мужчыны.

[93] Р. Тэннехилл, *Секс в истории*, с. 158-160; Р. ван Гулик, *Искусство секса в Древнем Китае*, с. 80, 205-206, 260-268, 375-381, 388-390.

[94] Пра спецыфіку аргазму гл.: J. Bancroft, *Seksualność człowieka*, s. 79-100; K. Imieliński, *Seksiatria. Psychofizjologia seksualna*, s. 319-328; A. M. Traish, N. N. Kim, R. Munarriz, *Biochemical and physiological mechanisms of female genital sexual arousal*, „Archives of Sexual Behavior", 2002, № 31, p. 393-400; E. A. Lloyd, *The Case of the Female Orgasm: Bias in the Science of Evolution*, Cambridge — London 2005; K. Mah, Y. Binik, *Are orgasms in the mind or the body? Psychosocial versus physiological correlates of orgasmic pleasure and satisfaction*, „Journal of Sex & Marital Therapy", 2005, № 31, p. 187-200; H. Frith, *Orgasmic Bodies: The Orgasm in Contemporary Western Culture*, Houndmills and New York 2015 і інш.

З трактату Літвіна вынікае, што татары ведалі і практыкавалі гэту тэхніку. Яна прыйшла да іх з Кітая. Ад татараў інфармацыя дайшла да жыхароў ВКЛ. Аднак немагчыма дакладна казаць пра практыкаванне тэхнікі і яе распаўсюджанасць сярод мужчын ВКЛ, хоць трактат быў вядомы ў ВКЛ і меўся ў бібліятэках[95]. Тэхніка сапраўды была вартая пераймання. Для гэтага патрабаваліся падручнікі, настаўнікі і здольныя мужчыны.

Да вышэйапісанай тэхнікі была вядомая ў Еўропе тэхніка перарванага палавога акту — *coitus interruptus*. Мужчыне трэба было паспець да пачатку семявывяржэння вывесці з улоння жанчыны чэлес. Гэта быў адзін са спосабаў кантрацэпцыі, які забараняўся рэлігіяй як грахоўны[96]. Аднак і ён не даваў стапрацэнтнай гарантыі ад цяжарнасці, бо за пару секундаў да семявывяржэння з'яўляюцца першыя кроплі спермы, якія здольныя для апладнення[97]. Можна толькі выказаць меркаванне, што мужчыны ВКЛ пра яго ведалі і практыкавалі. Праз вандроўкі была магчымасць пашырыць свой сексуальны далягляд. Але крыніцы пра валоданне гэтай тэхнікай не згадваюць.

Аднак казаць, што мужчыны ВКЛ цалкам кантралявалі свой чэлес было б яўным перабольшваннем іх магчымасцей. Яны ў гэтым плане былі такія ж як і іншыя мужчыны. Распаўсюджаная ў свеце мудрасць справядліва заўважае, што калі ўстае чэлес — губляецца розум. У той ці іншай інтэрпрэтацыі яна паўтараецца ад старажытнасці да сучаснасці[98].

Ва ўсе часы імпатэнцыя была мужчынскім сорамам. Праваслаўе, уніяцтва, пратэстантызм, каталіцызм лічылі яе слушнай прычынай для разводу, бо мужчына і жанчына ўжо не маглі жыць як муж і жонка і мець дзяцей. Сям'я не магла выконваць пракрэатыўную функцыю. Скасаванне шлюбу з-за мужчынскай імпатэнцыі адбывалася амаль без перашкод у царкоўным і свецкіх судах[99]. Уніяцкая царква лічыла „неспособность до сполкованя" перашкодай да шлюбу і вылучала два віды: часовае і вечнае. Для доказу недзеяздольнасці патрабавалася тры гады, а пасля даваўся развод[100].

[95] Г. Я. Голенченко, *Крупные светские частновладельческие библиотеки*, с. 111.
[96] L. Stone, *The Family, Sex, and Marriage in England*, s. 489, 501; N. Davidson, *Theology, nature and the law: sexual sin and sexual crime in Italy from the fourteenth to the seventeenth century*, [y:] *Crime, Society and the Law in Renaissance Italy*, ed. by T. Dean, K. J. P. Lowe, Cambridge 1994, p. 77-78.
[97] K. Imieliński, *Seksiatria. Psychofizjologia seksualna*, s. 317-319.
[98] И. С. Кон, *Мужское тело в истории культуры*, Москва 2003; электронная версия книги, исправленная и дополненная, 2010 год, с. 35.
[99] Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 136-139.
[100] *Собрание припадков краткое*, Супрасль 1722, с. 83 адв.

Такія справы сустракаюцца ў розных саслоўях. На старабеларускай мове для тлумачэння разводу з-за імпатэнцыі выкарыстоўвалі наступныя выразы: „не маючы мешканя такого, якое межи мужам и жену бывает, иж если не был способен на учинок свой мужской” і „з-за дефектов натуральных неспособность здоровя”[101]. ВКЛ не была адзінай краінай, якая скасоўвала шлюб з-за імпатэнцыі. Напрыклад, духоўныя суды Іспаніі лічылі гэта слушнай прычынай для разводу[102].

Моцная патэнцыя — гэта тое, што робіць мужчыну мужчынам. Яна дае ўпэўненасць у сабе, а магчымасць яе прадэманстраваць павышае самаадзнаку. Адпаведна немагчымасць праявіць мужчынскасць адбіваецца адмоўна на рэпутацыі і статусе. Мужчынская моц не была прыватнай справай мужчыны. Ад яе праявы залежала сітуацыя ў сям'і, таму патэнцыя ці яе адсутнасць была не толькі прыватнай, але грамадскай сферай.

Тэхнікі і практыкі ў сексе.

Інфармацыю пра тэхнічны і фізіялагічны бакі сексу можна было атрымаць з розных крыніц. ВКЛ мела трывалыя інтэлектуальныя кантакты з рознымі краінамі. Гэта дазваляла жыхарам не толькі атрымліваць звесткі праз досвед, але і праз літаратуру. Адукаваныя людзі сярод шляхты і мяшчан імкнуліся мець уласныя бібліятэкі. Але ў сувязі з рознымі гістарычнымі падзеямі многія з іх дайшлі да нас толькі ў спісах. Шмат старадрукаў захоўваецца па-за межамі Беларусі. Вывучаючы розныя калекцыі, мы звярнулі ўвагу на наяўнасць сярод збораў замежнай літаратуры, якая датычылася тэматыкі інтымных стасункаў. Канечне, наяўнасць кнігі ў бібліятэцы не азначала, што яе чыталі, а веды выкарыстоўвалі. Аднак можна казаць, што кнігі дайшлі да тэрыторыі ВКЛ.

Пра анатомію, сексуальныя стасункі можна было даведацца з медычнай і мастацкай літаратуры. Медычныя творы як правіла былі на лацінскай мове. У іх утрымліваліся звесткі са старажытнагрэчаскай, старажытнарымскай, арабскай, сярэднявечнай і рэнесанснай еўрапейскай навукі. Замежная літаратура па медыцыне была добра вядомая ў ВКЛ і мелася ў прыватных бібліятэках. Згадваецца яна ў зборах Альбрэхта Гаштольда, віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, Саламона Рысінскага і інш.[103] Крыніцы паказваюць, што да ВКЛ да-

[101] *Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске* (далей: *ИЮМ*), вып. 6, Витебск 1876, с. 473; вып. 10, Витебск 1879, с. 446.

[102] E. Behrend-Martinez, *Unfit for Marriage. Impotent Spouses on Trail in the Basque Region of Spain, 1650-1750*, Nevada 2007.

[103] НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 450, арк. 58, 58 адв., 62; M. B. Topolska, *Biblioteki w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI i pierwszej połowie XVII wieku*, „Pamiętnik

ходзіла новая на той час літаратура і пераклады антычных твораў. Гэта азначае, што інтэлектуальнае грамадства ведала апошнія еўрапейскія тэндэнцыі ў галіне медыцыны, а значыць мелі магчымасць атрымаць веды па анатоміі і фізіялогіі.

Працы па прыродазнаўстве функцыянавалі ў культурнай прасторы і актыўна выкарыстоўваліся. Лаўрэнцій Зізаній згадваў кнігу пра жывёл Арыстоцеля пры тлумачэнні слова „*неясыт, пелікан*". Сымон Будны быў вельмі адукаваным для свайго часу чалавекам. У сваіх творах ён спасылаўся на філосафаў Антычнасці, Сярэднявечча і Рэнесансу, між іншым згадваў Плінія Старшага[104]. Згаданыя працы краналі тэму фізіялогіі мужчыны і жанчыны. Кніга Плінія Старэйшага *Historia naturalis*[105] сярод іншага звяртала ўвагу на зачацце і нараджэнне дзяцей[106]. У працы Арыстоцеля *De animalibus*[107] апошняя частка прысвечана захворванням жанчын, якія перашкаджаюць зацяжарыць, мужчынскай бясплоднасці, працэсу зачацця дзіцяці. Шматлікія цытаты антычных філосафаў прыводзіліся ў працы Беняша Буднага[108]. Гэтыя і іншыя прыклады сведчаць пра рэцэпцыю антычнай і еўрапейскай думкі і пераасэнсаванне яе ідэй у працах дзеячаў ВКЛ. Аднак заўважым, што ў нас больш друкавалася рэлігійная літаратура, а не прыродазнаўчая. У асноўным уласнікамі друкарняў былі прадстаўнікі рэлігійных плыняў, што зрабіла ўплыў на выбар кніг.

Biblioteki Kórnickiej", 1983, z. 20, s. 168, 178; K. Gudmantas, *Alberto Goštauto biblioteka ir Lietuvos metraščiai*, „Knygotyra", 2003, t. 41, p. 14, 21; D. Frick, *Wilnianie*, s. 190-191; M. Zachara, *Silva Rerum Szyrmów*, „Odrodzenie i Reformacja w Polsce", 1981, t. 26, s. 174; J. Niedźwiedź, *Kultura literacka Wilna (1323-1655)*, Kraków 2012, s. 116.

104 Л. Зизаний, *Лексис. Сиречъ речения, въ кратъце събраны*, Вильна 1596, с. 24; H. Merczyng, *Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych*, Kraków 1913, s. 149; С. А. Падокшын, *Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі*, Мінск 1990, с. 71, 72, 81.

105 Кніга была ў бібліятэцы С. Рысінскага. НГАБ, ф. 694, воп. 1, спр. 450, арк. 58. Вядомы розныя яе выданні: Plinius Caius Secundus, *Historia naturalis*, Hagenoae 1518.

106 *K. Pliniusza Starszego Historyi naturalnej*, s. 31-49.

107 Кніга была перакладзена Тэадорам Газай і выдадзена першы раз у Венецыі. Aristoteles, *De animalibus*, Venezia 1476. Гэтае рэдкае выданне ёсць у калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. І. Саверчанка, *Італьянскія кнігі эпохі Рэнесансу на Беларусі*, [у:] *Материалы международной электронной конференции „Книжная культура пограничья Славии Восточной и Западной (ноябрь 2007 г.)"*, рэжым доступу: http://www.knizhkult.narod.ru/Saverchenko.htm. Кніга была ў спісе віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, але не было згадана месца і год выдання. D. Frick, *Wilnianie*, s. 191.

108 B. Budny, *Krotkich a węzłowatych opowieści, ktore po grecku zową Apophtemata*, Lubcza 1614.

Адзначым змест некаторых прац, якія сустрэліся ў кнігазборах. У спісе кніг С. Рысінскага згадваецца кніга па анатоміі французскага медыка Андрэ ду Лаўрэнса. У ёй даецца апісанне ўсіх органаў, у тым ліку апісваецца анатамічная спецыфіка мужчыны і жанчыны[109].

Асобныя творы ўтрымлівалі не тэхнічныя парады, а тлумачэнні фізіялагічных працэсаў. Такая інфармацыя мелася ў асобных тэматычных частках (палавы акт, сперма, менструацыя, цяжарнасць, зачацце, гермафрадыты, дзеці) з працы Псеўда-Арыстоцеля *Problemata Aristotelis ac philosophorum medicorumque*. Гэта праца, створаная ў форме пытанняў і адказаў, ахоплівала розныя тэмы пра цела мужчыны і жанчыны, а таксама іншыя пытанні. Яна была папулярная ў Еўропе з часоў сярэднявечча, выкарыстоўвалася ва ўніверсітэтах, медыцынскіх колах, судах, перакладзена на розныя мовы. Акрамя таго, выйшаў шэраг прац розных аўтараў з каментарыямі[110]. Лацінскі варыянт кнігі быў у спісе віленскага бурмістра Стэфана Лебядзевіча, але не было згадана месца і год выдання[111].

Кніга мела свецкі характар і на тагачасным узроўні тлумачыла асаблівасці чалавечага цела і працэсаў, якія з ім адбываюцца. Давалася вызначэнне палавога акта: „Coitus est mutia action maris & faeminae, per instrumenta ad talem actum deputata, ad servuandam speciem". Арганізму наносілі шкоды частыя стасункі (парушаюць дыханне і высушваюць цела), стасункі пасля ежы (шкода страваванню), лазні (адчыненыя поры хутка ахалоджваюць цела), ванітавання. Шкоднымі лічыліся і распусныя стасункі. Адзначалася, што часты секс змяншае жаданне. Нягледзячы на тое, што сам палавы акт брудны і нізкі, толькі задавальненне прымушае яго практыкаваць[112]. Істотны момант пры апісанні сексу

109 Кніга мела шмат перавыданняў, першае выйшла ў 1600 г. A. Laurentii, *Historia anatomica: humani corporis partes singulas uberrime enodans, novisque controversiis et observationibus illustrata: cum indice rerum et verborum locupletissimo*, Frankfurt a. M. 1600, p. 342-357.

110 У навуцы абмяркоўвалася аўтарства твора, яго ўплыў на развіццё навукі і іншыя аспекты, гл.: *Aristotle's Problemata in Different Times and Tongues*, ed. by P. De Leemans, G. Michèle, Leuven University Press 2006; F. Wallis, *Giulio Guastavini's Commentary on Ps.-Aristotle's Account of Male Same-Sex Coitus, 'Problemata' 4.26.*, [у:] *The Sciences of Homosexuality in Early Modern Europe,* ed. by K. Borris, G. S. Rousseau, London — New York 2008, p. 57-73; S. Wexler, *Re-evaluating Aristotle's Problems*, „International Zeitschrift", 2009, vol. 5, № 2, электронная версія:: http://www.zeitschrift.co.uk/v5n2swexler.html; A. Carré, L. Cifuentes, *Girolamo Manfredi's Il Perché*: I. *The Problemata and its medieval tradition*, „Medicina & Storia", X. 2010, № 19-20, n.s., p. 13-38.

111 D. Frick, *Wilnianie*, s. 191.

112 Гэта кніга мае шмат перавыданняў. Для характарыстыкі было выкарыстана выданне 1557 г. *Problemata Aristotelis ac philosophorum medicorumque complurium*, Paganus 1557, p. 105-109, 160, 166, 223.

— гэта звяртанне ўвагі і на задавальненне, што па сутнасці супярэчыла хрысціянству. Калі падсумоўваць агульна прыведзеныя звесткі, то сексуальныя стасункі, якія адбываюцца ў адпаведны перыяд, не распусным чынам, спрыяюць здароўю, даюць здаровых дзяцей. Парушэнне правілаў прыводзіць да хвароб.

Твор Псеўда-Альберта Вялікага аб жаночых сакрэтах быў вядомы ў ВКЛ на лацінскай мове[113], а пасля выйшаў яго пераклад па-польску. У ім звярталася ўвага на карысць сексуальных стасункаў для жанчын: „Na ostatek wiedz, że łączenie się z mężem białymgłowom iest pomocne, bo przez to zbytki wilgotne z nich odchodzą, a gorącość przyjmuią, ktora temperuie ich zimność. W męszczyźnie zaś opacznie się dzieie, zkąd białymgłowy często obcuiące z mężami, nie są tak krotkiego życia, iak mężowie; to świadczy natura wrobla, ktory dla częstey iurnośći zdycha"[114]. Гэта парада базавалася на тым, што структура мужчыны гарачая, а жанчыны — халодная. Таму секс карысны жанчыне як сродак разагрэву, а для мужчын гэта мела адваротнае дзеянне. Пад лішкамі вільгаці ў жанчыны разумеліся яе фізіялагічныя асаблівасці: выдзяленне вадкасці падчас сексу.

Асобна былі пазначаны характарыстыкі „гарачай" і „халоднай" жанчыны. Першы тып з радасцю кантактуе з мужчынамі, атрымлівае задавальненне, мае цвёрдыя і поўныя грудзі, шмат грубых валасоў на целе, акрамя таго смелая з мужчынамі, вясёлая, любіць выпіць, прыгожа апранацца, часта бывае ў грамадскіх месцах. Другі тып мае мала валасоў на целе, мяккія грудзі, цела падобнае да мужчынскага, бледны твар, слаба гаворыць[115]. Гэта інфармацыя пададзена для далейшай характарыстыкі асаблівасцей цяжарнасці двух тыпаў жанчын. Па сутнасці медыкі ВКЛ ведалі гэтыя і іншыя працы, але ці даходзілі гэтыя веды да іх асяроддзя, да хворых, ці давалі яны сваю ўласную ім ацэнку, гэта сказаць цяжка.

Дадаткова з мастацкай літаратуры, напрыклад з *Аповесці пра Атылу*, можна было даведацца, што празмернае ўжыванне алкаголю перад сексам і празмернае фізічнае задавальненне для мужчын старэйшых за 50 гадоў можа прывесці да смерці[116]. Пра прыгоды падчас пада-

[113] Кніга была шмат разоў перавыдадзена і мела назву на латыні: Albertus Magnus, *De secretis mulierum. Item, de virtutibus herbarum, lapidum et animalium*, Amstelodami 1655, 1669 і інш.

[114] Albertus Magnus, *O sekretach białogłowskich, mocy zioł, kamieni y zwierząt osobliwych przetłumaczony*, Amsterdam 1695, s. 31-32.

[115] Там жа, с. 383-386.

[116] А. Н. Веселовский, *Из истории романа и повести*, вып. 2, Славяно-романский отдел, „Сборник отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук", т. 44, № 3, Санкт-Петербург 1888, Приложение, с. 232.



Місіянерская поза. Ілюстрацыя з выдання: A. Carracci, L'Arétin, Paris 1798, p. 5.

рожжаў, метады спакусы і іншае можна было пачытаць у *Дэкамероне*, канечне, пры ўмове, што чытач быў адукаваны.

У перакладным творы з італьянскай мовы *Страшны герой* Андрэіні Франчэскі давалася апісанне, як працуе натуральны інстынкт у мужчын. Спачатку прываблівае знешнасць, а пасля ўжо разбіраюцца ці варты быў прадмет кахання: „To pierwsz upodobanie zrządzone obaczeniem subiecti rodzi się w nas z instynktu naturalnego, lecz poznawszy, wyrozumiawszy y uważywszy merita & demerita, tey w ktorey się kochamy upodobanie, do swey przychodzi wolności, y iuż godność kochać, a niegodność nie kochać osoby roskazuie". Як і зараз візуалізацыя для мужчыны мае першаснае значэнне. У іншым выказванні тэма развіваецца далей, хцівасць зняволівае і адбірае розум: „Przez źrenicę do serca, a z serca skoro miłość dopadła intellektu mego, zaraz chciwość mię

tak uięła, y z niewoliła, że teyże godziny on affekt miłosnego zawzięcia, radbym był podał do wiadomości ukochaney Damy, w czym pokazała mi miłość y matka iey Venera wielki fawor". Хоць у творы называецца гэта пачуцце каханнем, але больш яно характэрна для фізіялагічнага жадання, якое цалкам падпарадкоўвае мужчыну. Гэта ідэя пацвярджалася меркаваннем, што купідон жыве паміж ног Венеры: улонне правакуе жарсці, а не каханне: „Między nogami Venery Bogini ma swą rezydentią Cupido, ktory padszy na łono matki swey, pewnie sposobnieyszego na to nie mogłby znaleść mieysca nigdy"[117].

У маралізатарскіх творах можна было знайсці не толькі павучэнні пра прыстойныя паводзіны, але і апісанні метадаў спакусы жанчын, якімі традыцыйна карысталіся мужчыны. Канечне, яны лічыліся непрыстойнымі. Апісваючы сустрэчы, якія маглі адбыцца як у горадзе, так і ў вёсцы Андрэй Мадрэўскі адзначаў, што Бахус падштурхоўвае да Венеры, бо спрыяе разнявольванню. Мужчыны падпайвалі жанчын, паказвалі малюнкі з непрыстойнымі сцэнамі, вялі адпаведныя размовы. Атмасферы спрыяла спяванне распусных песень і танцы. Пасля мужчыны адкрывалі вопратку, цалавалі, шчыпалі, разняволена мацалі. Такое каханне ацэньвалася нешчаслівым для замужніх і дзяўчат[118].

Агульна прынятая традыцыя надавала актыўнасць у сексе мужчыне. Жанчына як правіла прымала жаданні мужчыны. Аднак у крыніцах часам сустракаецца інфармацыя пра ініцыятыўных жанчын у сексе. Пра іх тагачасная прымаўка казала: „Miłośnice, drapieżnice"[119]. Міхалон Літвін пісаў пра заможных жанчын, які жывуць пад відам удаўства ці дзявоцтва, пры гэтым праяўляць жаданні адносна сваіх падданых, нават іх пераследуюць[120]. Канцлер ВКЛ Альбрэхт Станіслаў Радзівіл апісваў выпадак спакушэння манашкі манахам. У выніку яна нарадзіла дзіця, якое забіла і пахавала пры алтары. Цела было знойдзена, манашка пакарана смерцю, а манах быў збіты розгамі і адпраўлены ў вязніцу (1646). Але не менш цікавыя высновы Радзівіла аб небяспецы кантактаў з манашкамі. Жанчына, нават у манаскім абліччы зможа прынесці непрыемнасці. Жанчыны-спакусніцы фігуравалі ў жыцці святых. Нейкая распусніца безвынікова спрабавала спакусіць св. Юзафата Кунцэвіча[121]. Як вынікае з назіранняў прач-

117 F. Andreini, *Bohatyr Straszny*, s. 24, 25, 98.

118 A. Fricz Modrzewski, *O poprawie Rzeczypospolitey*, s. 53-55.

119 *Proverbiorum Polonicorum*, p. E 3v, centuria 9:10.

120 М. Литвин, *О нравах татар, литовцев и москвитян*, с. 90.

121 A. S. Radziwiłł, *Pamiętnik o dziejach w Polsce*, t. 2, Warszawa 1980, s. 503; Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 277.

кі Барбары Паўлавай, Зафея Радзівілаўна мела тэмперамент і прагу да сексу з каханкам С. Тымінскім. Яна не саромелася пускаць яго да сябе праз акно, калі муж быў у маёнтку (1607)[122].

Даволі складанае пытанне — гэта працягласць палавога акту. Бытаваў стэрэатып, што жаночае ўлонне ненасычанае. Прымаўка казала: „Trzy rzeczy nienasycone, a czwarta nie mowi dosic. Piekło, łono białogłowskie, ziemia, a ogien nigdy nie mowi dosic"[123]. Яе паходжанне было звязана з асаблівасцямі жаночага арганізма. Жанчыне патрабуецца значна больш часу, каб атрымаць задавальненне. Далёка не кожны мужчына здольны кантраляваць сябе больш доўгі перыяд, чым тры хвіліны, і давесці жанчыну да аргазму, а тым больш хутка аднавіць сілы для паўторных актаў. Напрыклад, *Аповесць пра Бова* апісвае сексуальныя кантакты Бова і Дружненны тройчы за ноч[124].

Акрамя таго, ад партнёра ў сексе чакалася актыўнасць і не радавала пасіўнае ляжанне:

Ці ты спіш, ці ляжыш,
Ці якое ліха?
Я дзяруся і чашуся,
А ты ляжыш ціха![125]

Яшчэ больш цяжка праводзіць даследаванні па сексуальным задавальненні партнёраў. У сувязі з фізіялагічнымі асаблівасцямі ў мужчыны механізм атрымання аргазму просты. Дасягаецца ён заўсёды, пачынаючы з першага сексуальнага вопыту, за выключэннем хвароб і паталогій[126]. Жаночы аргазм мае складаную структуру, патрабуе паступовага развіцця. Нават па даследаваннях групы амерыканскіх даследчыкаў пад кіраўніцтвам Альфрэда Кінсэя 1953 года вынікала, што на першым годзе шлюбу дасягалі аргазму толькі 25% жанчын[127]. Ва ўмовах XVI-XVII стст. гэта азначала рэдкую магчымасць для жанчыны развіць сваю сексуальнасць. Аднак, у адрозненні ад мужчын, для рэалізацыі пракрэатыўнай функцыі жанчыны не мае значэння ступень яе задавальнення, таму адпаведна і ўвага мужчын на гэта мала звярталася. Пры гэтым варта ўлічыць, што штодзённае жыццё боль-

122 A. Sajkowski, *Opowieści misjonarzy, konkwistadorów*, s. 321.
123 Vilniau Universiteto Bibliotekos, Rankraščių skyrius, f.-2239, l. 60-60v.
124 А. Н. Веселовский, *Из истории романа и повести*, вып. 2, с. 154.
125 M. Federowski, *Lud białoruski*, t. VI, s. 36.
126 K. Imieliński, *Seksiatria. Psychofizjologia seksualna*, s. 317-319; ён жа, *Seksiatria. Patologia seksualna*, s. 6-19.
127 K. Imieliński, *Seksiatria. Psychofizjologia seksualna*, s. 319-328.

шай часткі насельніцтва (мяшчан і сялян) было прысвечана справам для захавання жыццядзейнасці. Таму час для сексуальных практык мелі ў асноўным заможныя людзі.

Медыцынская думка Італіі абмяркоўвала праблему жаночага задавальнення падчас сексу. У XVI ст. прафесары медыцыны лічылі, што мужчына і жанчына маюць сексуальныя жаданні. Да таго ж прапаноўваліся розныя спосабы, каб задаволіць жанчыну[128]. Зварот навукоўцаў да структуры і функцыянавання палавых органаў быў невыпадковым, паколькі гэта заставалася таямніцай, якая ўзбуджала цікавасць. Леанарда да Вінчы, вывучаючы праблему сексуальных кантактаў, пісаў пра чаканні партнёраў: „Жанчыны любяць вялікі чэлес, а мужчыны чакаюць ад жаночага ўлоння чагосьці адваротнага. Ніхто не мае таго, чаго прагне"[129]. Ён быў правы ў сваіх меркаваннях. Многім жанчынам важна глыбіня пранікнення, а мужчынам — максімальна шчыльнае ахопліванне чэлеса. Аднак, калі мужчынскае стаўленне да сексу і рэакцыя можа быць пачута праз кнігі і дзённікі, то жаночых нататак у Еўропе пра інтымнае жыццё не выяўлена[130]. Маўклівымі на гэты конт засталіся і жанчыны ВКЛ, а мужчыны пазбягалі дэталяў інтымнай сферы ў сваіх дзённіках і мемуарах.

Часам некаторыя намёкі можна знайсці ў народным фальклоры. Двухсэнсоўнасць прымаўкі паказвае жаночы тэмперамент і патрабаванні: „Dwa razy żona męża biła, raz że ogorki łupił, a drugi raz, że iabłek nie łupił"[131]. Тут ужыты два сімвалы — агуркі як пазначэнне чэлеса і яблыкі — грудзей. Калі адчытаць гэта выказванне ў сексуальных кантэксце, то жонку раззлавала цікавасць мужа да свайго, а не да яе цела.

Аднак учынкі часам больш кажуць, чым словы. Тое, што фізічнае задавальненне мела значэнне для мужчын і жанчын, сведчаць справы пра пералюб. Жарсці авалодвалі так, што не палохала нават пагроза смяротнага пакарання. Шлюбная здрада мела месца ва ўсіх саслоўях. У справе гарадзенскага мешчаніна Юзафа Каваліцкага і яго жонкі Рэгіны Лукашоўны падчас правядзення следства за 9 ліпеня 1674 г. задаваліся пытанні пра маральны стан жанчыны і высвятлялася ад каго ў яе дачка. Сярод іншых сведчанняў прагучала цікавае выказванне пана Візапольскага. Рэгіна служыла ў яго два тыдні, хацеў яе пакінуць на год. Аднак яна „tęskniła, że według swego upodobania męs(z)

[128] N. Davidson, *Theology, nature and the law*, p. 81-82.

[129] D. Friedman, *Pan niepokorny. Kulturowa historia penisa*, przekł. I. Kolczyńska, Warszawa 2003, s. 73.

[130] L. Stone, *The Family, Sex, and Marriage in England*, s. 490, 552-559.

[131] *Proverbiorum Polonicorum*, p. B2; centuria 3:40.

czyzny nie miała”[132]. Мы ўлічваем, што цытата жанчыны зроблена з іншых слоў. Калі яна прыведзена блізка да тэксту, што сведчыць пра дасведчанасць мяшчанкі ў практыцы сексу, а таксама веданне памкненняў свайго цела. Зразумела, што такая жанчына не магла доўга заставацца са сваім мужам.

Крыніцы захавалі нам урывачныя звесткі пра практыку сексу. Старажытныя і вядомыя пяшчоты не толькі ў нас, але і ў іншых народаў, — гэта пацалункі і абдымкі. Пра іх выкарыстанне сведчыць пас з анёлкамі пад самай столлю, якія абдымаюцца і цалуюцца. Ён знаходзіцца ў касцёле св. Пятра і Паўла ў Вільні. Абдымкі Адама і Евы бачны на тытульнай старонцы Берасцейскай Бібліі 1563 г. Пра пацалункі прыгожа напісана ў старабеларускім перакладзе *Найвышэйшай песні Саламонавай*[133]: „Оцалуймя поцалованиемъ оустъ своих, ялко лепшая суть милости твоя надъ вино, войннейшаа над масти драгие”, „Сотъ каплющий оуста твоя невесто. Мед и млеко подъ языкомъ твоимъ”[134].

Пра паходжанне звычаю цалавання апавядаў Ян Пратасовіч у творы *Inventores rerum albo Krótkie opisanie kto co wynalazł i do używania ludziom podał* (1608). Пацалункі паходзілі ці то ад старажытных жыдоў, ці то ад уцекачоў з Троі, ці то ад рымлян. Плутарх апісвае звычай рымскіх патрыцыяў, вярнуўшыся дадому, цалаваць сваіх жонак, каб даведацца, ці не пілі тыя падчас іхняй адсутнасці віна. Паэт лічыў, што такія жанчыны варты кія, а не пацалункаў:

Lecz tu rychlej niż wino gorzałkę poczuje,
Bowiem się takich siła białychgłów najduje,
Iż się gorzałką miłą nadobnie uraczą,
Że czasem ledwie mężów swych przed sobą baczą.
Przeto takich by najmniej nie trzeba całować,
Ale raczej sporego kija nie żałować,
Okładając po grzbiecie, aby jej nie piła,
Lecz raczej gospodarstwa swego pilna była[135].

[132] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 376-376 адв.; Н. Сліж, *Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст.*, „Arche. Гарадзенскі міленіум”, 2014, № 11, с. 151-152.

[133] Гэты твор у Бібліі Ф. Скарыны, а таксама ў Берасцейскай Бібліі, у іншых выданнях прадстаўлены як размова Царквы і Хрыста. Такім чынам эратычнаму твору было нададзена рэлігійнае гучанне. Біблія Ф. Скарыны ўтрымлівае не ўсё вершы.

[134] *Біблія: Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Ф. Скарынаю ў 1517-1519 гг.*, т. 3, Мінск 1991, с. 425, 432.

[135] С. Кавалёў, *Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу*, Мінск 2010, с. 316-318.

Аральны секс быў вядомы ў практыцы. З працы Псеўда-Арыстоцеля вынікала, што аральныя стасункі нельга лічыць сексам, паколькі яны не прыводзяць да зачацця дзяцей, бо семя, калі трапляе ў рот, знішчаецца ў сістэме страванання[136].

Верш Д. Набароўскага таксама сведчыць пра знаёмасць з гэтай тэхнікай. Напэўна гэтым бавіліся Ян Сабескі і Марыя Казіміра, бо згадвалі ў лістах пацалункі па ўсім целе[137]. Пра аральны секс згадваецца ў беларускім фальклоры. Вельмі яскрава тэхніку прадстаўляе наступны верш:

Як за лесам, за буйракам
Там стаяла баба ракам,
А дурань думаў капліца
Дай давай туды маліцца[138].

Іншы варыянт гэтага верша:

Ішла баба цераз кладку
Ды задрала ногу.
А дзед думаў, што ікона —
Памаліўся Богу.

Зыходзячы са спавядальных чыноў можна сцвярджаць пра практыкаванне стымуляцыі грудзей і палавых органаў рукамі[139]. Пра пяшчоты грудзей адзначаецца ў *Найвышэйшай песні Саламонавай*: „Рано встанмы на виннице, соглядаймо естьли же есть зацвила винница... Тамо дамъ тобе перси мое"[140]. Твор натхніў Збігнева Морштына напісаць верш на гэту тэму[141]. *Аповесць пра Бова* апісвае, што галоўны герой перад сексам схапіў Дружненну за грудзі[142]. Гэта частка жано-

[136] *Problemata Aristotelis*, p. 108.

[137] Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 290.

[138] Е. В. Аничков, *Язычество и Древняя Русь*, Санкт-Петербург 1914, с. 375; У. Лобач, *Эрас у беларускай традыцыйнай культуры*, s. 238.

[139] Ілюстрацыя са стымуляваннем жаночых палавых органаў змешчана ў: A. Carracci, *L'Arétin d'Augustin Carrache ou Recueil de Postures Érotiques, d'Après les Gravures à l'Eau-Forte par cet Artiste Célèbre, Avec le Texte Explicatif des Sujets*, Paris 1798, Il. p. 64.

[140] *Біблія: Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі*, т. 3, с. 438-439.

[141] *Helikon sarmacki, wątki i tematy polskiej poezji barokowej*, przyg. A. Vincenz, M. Malicki, J. Chrościcki, Biblioteka Narodowa, nr 259, seria I, Wrocław — Warszawa — Kraków — Gdańsk — Łódź 1989, s. 425-426.

[142] А. Н. Веселовский, *Из истории романа и повести*, вып. 2, с. 154.

чага цела заўсёды прыцягвала і хвалявала мужчын, таму не дзіўна, што ім прысвечаны літаратурныя творы.

Крананне да жаночых грудзей спрыяла хуткаму ўзбуджэнню мужчыны. Аб гэтым наўпрост пішацца ў загадцы, якая змешчана ў рукапісе Крыштафа Завішы:

Anigma
Parę jabłek od Ewy w Raiu zdobycz swoię
Damy u piersi noszą dziś na żałość moię.
Ktorych skoro się dotknę ręką Adamową,
Wąż pomysłą tego grzechu podnosi tam głową[143].

Разнастайнасць, а таксама прадухіленне ад цяжарнасці, даваў анальны секс, але ён адносіўся да ліку грахоўных[144]. Каталіцкая царква выступала супраць такіх стасункаў. А магістрат Венецыі публічна абвясціў у 1511 г., што прастытуткі, практыкуючыя анальны секс, будуць выкінуты з прафесіі[145]. А ў XV ст. там сустракаюцца выпадкі пакарання мужоў за выкарыстанне гэтай практыкі з жонкамі[146]. Гэты від сексу лічыўся брыдкім і непрыстойным, хоць практыкаваўся ў Рэчы Паспалітай. У польскага шляхціца Станіслава Нямоеўскага выклікала пачуццё брыдоты апавяданне маскоўскага папа пра анальныя стасункі з жонкай. У яго было на той час 12 дзяцей і гэта быў спосаб кантрацэпцыі. Шляхціц быў здзіўлены распаўсюджанасці гэтай з'явы ў Расіі (1606)[147]. Пра практыкаванне там гэтай тэхнікі сведчыць таксама Адам Олеары[148].

Групавы секс таксама лічыўся грахоўным. Аднак эксперыментатары ў гэтай галіне былі. У шлюбаразводным працэсе магілёўскага мешчаніна Багдана Лук'янавіча і Уліты згадваецца, што жонка на яго вачах, у яго доме, здраджвала з некалькімі казакамі і пасля з імі з'ехала ў Маскву (1610)[149]. Пра агульную распусту сярод гасцей на вяселлях пісаў Паўль Одэрборн[150].

143 Vilniau Universiteto Mokslines Bibliotekos rankraščių skyrius, f. 3-2239, l. 91.

144 *Катэхізіс: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст.*, с. 112; Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 288, 291.

145 N. Davidson, *Theology, nature and the law*, p. 87.

146 G. Ruggiero, *The Boundaries of Eros: Sex Crime and Sexuality in Renaissance Venice*, New York 1985, p. 119-120.

147 *Pamiętnik Stanisława Niemojewskiego (1606-1608)*, Lwów 1899, s. 98-99; Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 322.

148 *Из записок иностранных путешественников XVI-XVII в.*, [у:] *„А се грехи злые смертные...”*, с. 139.

149 *ИЮМ*, вып. 7, Витебск 1877, с. 297-300; J. Bardach, *Świecki charater zwyczajowego prawa małżeńskiego ludności ruskiej Wielkiego Księstwa Litewskiego (XV-XVII wieku)*, „Czasopismo Prawo-Historyczne”, 1963, t. XV, z. I, s. 118.

У еўрапейскіх краінах таксама быў вядомы адначасовы секс з некалькімі партнёрамі. Знакаміты альбом *I Modi* (*Шляхі" ці 16 спосабаў задавальнення*) утрымлівае выяву з групавым сексам. На ёй мужчына стасуецца з жанчынай, а яго нага выкарыстоўваецца другім мужчынам для стымуляцыі чэлеса[151].

Мастурбацыя — адна з самых старажытных формаў самазадавальнення[152]. Яна была адна з самых бяспечных формаў сексу, які не пагражаў цяжарнасцю і венерычнымі захворваннямі. Аднак праваслаўе, каталіцызм і пратэстантызм самазадавальненне адносілі да грахоўных дзеянняў[153], бо яно распальвала сексуальнае жаданне, не прыводзіла да нараджэння дзяцей. Кіраваліся словамі апостала Паўла: „Не льстите себе. Ни блудницы, ни идолослужители, ни прелюбодее, не сквернители, ни малакия, не мужеложницы, ни лихоимцы, ни тати, ни пияницы, не досадителе, ни хищницы ц(а)рствия Б(о)жия не наследятъ"[154]. Практыкуючыя мастурбацыю былі пастаўлены ў лік грэшнікаў разам з п'яніцамі, язычнікамі і інш.

Практыкаванне ананізму трактавалася даволі негатыўна еўрапейскімі тэолагамі, лічыўся сродкам пазбягання шлюбных дачыненняў. Таму мужчыны, які практыкаваліся ў самазадавальненні, захоўвалі гэта ў таямніцы. Пытанне абмяркоўвалася ў літаратуры. Медыкі лічылі мастурбацыю карыснай для здароўя. У 1710 г. у Лондане выйшла кніга *Onania*, якая закранала практыкі самазадавальнення. Яна атрымала надзвычайную папулярнасць і была перакладзена на розныя мовы[155]. Мастурбацыю, як правіла, выкарыстоўвалі для зняцця сексуальнай напружанасці пры адсутнасці партнёра[156]. Выпадкамі публічнай мастурбацыі на банкетах вядомы Караль Радзівіл „Пане Каханку"[157].

[150] П. Одэрборн, *Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў*, с. 167-189.

[151] A. Carracci, *L'Arétin*, p. 73.

[152] J. Peakman, *The Pleasure's All Mine. A History of Perverse Sex*, London 2013, p. 47-48.

[153] Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 294; J. Tazbir, *Dewiacje obyczajowe*, s. 253-255.

[154] *Апостол*, Вильна 1595, с. 135. У Новым запавеце 1568 г. выкарыстана слова „roskosznicy", але яго можна выкарыстоўваць да аматараў цялесных задавальненняў. *Nowy Thestament z greckiego na polski ięzyk z pilnością przełożony*, Nieśwież 1568, s. XIIIv.

[155] D. Friedman, *Pan niepokorny*, s. 106-111; S. Matthews-Grico, *Ciało i seksualność w Europe w czasach Ancien Régime'u*, [w:] *Historia ciała*, t. 1: *Od renesansu do oświecenia*, red. G. Vigarello, przełożył T. Stróżyński, Gdańsk 2011, s. 191-193; J. Peakman, *The Pleasure's All Mine*, p. 51-55.

[156] Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 323.

[157] J. Tazbir, *Dewiacje obyczajowe*, s. 264.

Рэлігійная літаратура ВКЛ XVI-XVII стст. акцэнтавала асноўную ўвагу на мужчынскай мастурбацыі. Адзначаліся наступныя тэхнікі: стымуляцыя палавых органаў сваімі рукамі, рукамі ці сцёгнамі партнёра. Здзяйсняць самазадавальненне мужчына мог лежачы ўніз тварам у ложак ці вопратку. Для гэтай мэты таксама выкарыстоўвалася дзірка ў дрэве[158]. Па сутнасці ў крыніцы адрознівалі мастурбацыю як сродак самазадавальнення і ўзаемазадавальнення. Такі ж падыход існуе зараз у сучаснай сексалогіі[159]. Беларуская традыцыйная культура да мастурбацыі ставілася спакойна, як да сродку зняцця напругі[160].

Даволі складаны момант у даследаванні — гэта позы, бо адмысловых падручнікаў, створаных у ВКЛ не было. Таксама цяжка вызначыць распаўсюджанасць тут падобнай замежнай літаратуры. У Еўропе было толькі некалькі выданняў практычнага характару па сексуальных позах. Але яны значна адставалі ад кітайскіх падручнікаў[161]. Знакаміты альбом *I Modi* ўтрымліваў наступныя позы: місіянерская поза — ляжачая, тварам да твару, самая распаўсюджаная поза ў еўрапейскіх народаў[162]; адваротная поза — мужчына ляжыць, а жанчына сядзіць на ім, павярнуўшыся спінай; у варыяцыі гэтай позы нага мужчыны закінута на нагу жанчыны; варыяцыя місіянерскай позы — жанчына на ўзвышэнні паўляжыць, мужчына стаіць; поза стоячы — мужчына на руках трымае жанчыну, адна яе нага закінута на плячо; варыяцыя гэтай позы — абедзве нагі жанчыны на поясе мужчыны; адваротная поза — мужчына ўнізе, а жанчына ляжыць на ім; варыяцыя місіянерскай позы — жанчына сядзіць на ўзвышшы, а мужчына стаіць на каленях; варыяцыя місіянерскай позы — мужчына і жанчына ляжаць павернутыя адно да другога; поза жабы — мужчына стаіць і трымае жанчыну за клубы, а жанчына павярнуўшыся спінай, практычна вісіць, толькі рукі на падлозе; варыяцыя місіянерскай позы — жанчына ляжыць на высокім ложку, пад спінай падушка, а мужчына стаіць; варыяцыя місіянерскай позы — жанчына сядзіць на ўзвышшы, а мужчына стаіць;

[158] І. Марзалюк, *Матрыманіяльнасць і секс у Беларусі ў XI-XVIII стст.*, [у:] *Terra Alba*, t. 2, с. 135; Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 288, 291.

[159] Сучасная навука прадстаўляе мастурбацыю ў вельмі шырокім кантэксце: ад гісторыі да тэрапіі. *Masturbation as a Means of Achieving Sexual Health*, ed. by W. Bockting, E. Coleman, New York 2012; J. Knowles, *Masturbation — From Stigma to Sexual Health*, электронная версія: https://www.plannedparenthood.org/files/5513/9611/7867/masturbation_11-02.pdf [доступ 15.06.2012].

[160] У. Лобач, *Эрас у беларускай традыцыйнай культуры*, s. 239.

[161] L. Stone, *The Family, Sex, and Marriage in England*, p. 493-494.

[162] Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 294.

жанчына паўляжыць крыху звесіўшыся з ложка, а мужчына трымае яе за нагу; поза стоячы — жанчына паўляжыць на ложку, мужчына стаіць, яе нага закінута яму на плячо; варыяцыя місіянерскай позы — жанчына ляжыць на ложку, а мужчына стаіць на каленях; поза ззаду — жанчына стаіць на каленях і руках, а мужчына — ззаду[163]. Апісаныя вышэй позы таксама дапамагалі зрабіць сексуальнае жыццё больш разнастайным. Пра іх было вядома яшчэ з часоў старажытных Грэцыі і Рыма. На прадметах побыту і мастацтва захаваліся розныя позы: місіянерская, вершніца і інш.[164] Так як жыхары ВКЛ наведвалі Італію, то напэўна мелі магчымасць азнаёміцца з тэхнікамі. Тым больш, што італьянцы лічыліся знаўцамі сексу. Аднак крыніцы не дазваляюць правесці грунтоўнае даследаванне па выкарыстанні гэтых ведаў.

Карыстаўся папулярнасцю ў Англіі *Aristotle's Masterpiece*, які ўпершыню быў надрукаваны ў Лондане ў 1684 г., а пасля неаднаразова перавыдаваўся. Кніга непасрэдна прысвечана сексуальным дачыненням, анатоміі, сямейным стасункам і іншым падобным пытанням[165].

Варта адзначыць, што пары, якія хацелі зрабіць сваё сексуальнае жыццё больш разнастайным, адразу траплялі ў лік грэшнікаў. Напрыклад, у праваслаўі грахом лічыліся аральны і анальны секс, мастурбацыя, глыбокі пацалунак, крананне вуснамі грудзей і палавых органаў, стымуляцыя палавых органаў рукамі, позы вершніца, ззаду, перавернутая поза 6 на 9[166]. Каталіцтва дазваляла толькі місіянерскую позу. Усе разнастайнасці тэхнікі лічыліся грахоўнымі[167]. Ці паводзілі сябе вернікі згодна з прадпісаннямі дакладна сказаць цяжка, але пералік грахоўных тэхнік дазваляе казаць пра практыку ў ВКЛ як мінімум чатырох поз.

163 Альбом быў упершыню надрукаваны ў Італіі ў 1524 г., пасля ў 1527 г. Па загадзе Ватыкана быў знішчаны. Да нашых дзён дайшлі некаторыя фрагменты. Лічыцца, што выданне 1550 года базавалася на папярэдніх. На яго аснове была надрукавана французская версія ў 1798 г. *I modi*, электронная версія: https://en.wikipedia.org/wiki/I_Modi; *I modi. Woodblock edition*, http://www.eroti-cart.com/i-modi-woodblock-edition-c-93_94; У кнізе 1798 г. апісаныя позы маюць назвы антычных герояў. A. Carracci, *L'Arétin*, p. 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29, 33, 37, 41, 44, 49, 53, 57, 61, 69, 77.

164 Выявы з позамі з часоў старажытных Грэцыі і Рыма можна пабачыць на старонцы: *Sex and erotic in Greek and Roman Arts*, http://www.flickriver.com/photos/carolemage/sets/72157633026810785.

165 Інфармацыя пра выданне і яго змест гл.: *Aristotle's Masterpiece,* https://en.wikipedia.org/wiki/Aristotle%27s_Masterpiece; *The Works of Aristotle, the Famous Philosopher*, http://www.gutenberg.org/files/12699/12699-h/12699-h.htm.

166 *Канонические церковные памятники XIII-XVIII вв.*, [у:] *„А се грехи злые смертные...”*, с. 312-315; Н. Сліж, *Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ*, с. 285-292.

167 N. Davidson, *Theology, nature and the law*, p. 76-78.

У народнай культуры беларусаў вядомы позы місіянерская, ззаду, вершніца. У радзіннай абрадавасці галоўнымі героямі былі кум і кума. Праз іх апавядалася пра сексуальныя стасункі[168]:

Кума, кума задзяры ногу,
А кум скажа хвала Богу[169].

Ілюстрацыя з карты рэчкі Гарынь у Мазырскім павеце сведчыць, што была вядома поза стоячы. Постаці мужчыны і жанчыны намаляваны схематычна на фоне рэчкі, але бачна ўлонне і мужчынскі чэлес ва ўзбуджаным стане. Поза больш падыходзіць для людзей прыкладна аднолькавага росту і даволі зручная ў прыродных умовах[170].

Пра жаданне ўдасканальвацца ў тэхніцы сексу сведчыць ліст караля Яна Сабескага 1675 г. да жонкі Марыі Казіміры. Калмык Астракан быў больш дасканалы ў сексе, чым французы, італьянцы, іспанцы і туркі. Ён распавёў пра 12 практычных поз, пра якія даведаўся ў калмыкаў. Таксама хваліўся, што ведае больш за тысячу сакрэтаў. Пісаў Сабескі жонцы з мэтай, каб жонка падумала пра разнастайнасць іх сексуальнага жыцця[171].

Дасведчанасць калмыка ў інтымнай сферы жыцця тлумачыцца кантактамі калмыкаў з кітайцамі. Варта адзначыць, што на той час у Кітаі была ўжо даволі развітая навука па сексуальных практыках. Былі распрацаваны рэкамендацыі і надрукаваны альбомы з ілюстрацыямі розных поз[172]. Таму ў Азіяцкім рэгіёне Кітай меў уплыў на развіццё тэндэнцый у галіне інтымных стасункаў.

Ліст Яна Сабескага — гэта рэдкі выпадак, калі асоба не толькі азнаёмілася тэарэтычна з ведамі ў галіне сексу, але і жадала ўвесці іх у сваю практыку. Вядома, што жыхары ВКЛ выязджалі за мяжу і мелі розныя кантакты, у тым ліку і сексуальныя. Аднак непасрэдна прасачыць замежны ўплыў у сексуальную культуры не заўсёды крыніцы даюць магчымасць.

[168] У. Лобач, *Эрас у беларускай традыцыйнай культуры*, s. 233-234, 238.

[169] Gabinet Rękopisów Biblioteki Uniwersytetu Warszawskiego, sygn. 441, k. 463.

[170] На карце не адзначана дата, верагодна канец XVIII ст. ці пачатак XIX ст. Выказваю шчырую падзяку Герману Брэгеру за інфармацыю пра гэту крыніцу. НГАБ, ф. 1477, воп. 1, спр. 3176.

[171] T. Żeleński-Boy, *Marysieńka Sobieska*, Warszawa — Lwów 1938, s. 343-344; Z. Kuchowicz, *Człowiek polskiego baroku*, s. 294.

[172] Р. ван Гулик, *Искусство секса в Древнем Китае*; R. van Gulik, *Erotic Colour Prints of the Ming Period With an Essay on Chinese Sex Life from the Han to the Ch'ing Dynasty, B.C. 206-A.D. 1644*, Leiden 2004; Jie Guo, *Robert Hans van Gulik Reading Late Ming Erotica*, „BIBLID 0254-4466", 2010, Nr 28:2, p. 225-265.

Прыведзеныя звесткі па тэхніках сексу носяць фрагментарны характар. Яны не даюць магчымасці прадставіць цалкам сітуацыю ў ВКЛ і прааналізаваць, якія віды практык і як часта выкарыстоўвалі пары. Варыятыўнасць магла быць рознай як само жыццё.

Высновы. Старабеларуская практыка сексу з'яўляецца прадуктам грамадства, якое існавала ў канкрэтным гістарычным кантэксце. Грамадства ВКЛ было феадальным, адпаведна мела аграрны характар. Для яго была ўласціва традыцыйнасць, кансерватыўнасць, архаічнасць. Новыя павевы датычыліся адукаваных людзей, якія мелі магчымасць вандраваць за мяжу, чытаць літаратуру. Але яны складалі невялікую частку насельніцтва.

На сексуальныя адносіны ў XVI-XVII стст. непасрэдным чынам паўплывалі заканадаўства, рэлігія, традыцыі, звычаі, саслоўная прыналежнасць. З пералічанага самым важным чыннікам была рэлігія, бо яна рэгламентавала тэхнікі і адзначала, якія з іх грахоўныя. Наяўнасць язычніцкіх вераванняў, а таксама фізічнае жаданне не змаглі падпарадкаваць секс рэлігіі і знішчыць задавальненне. Узбагачаў практыку кантакт з іншымі культурамі. У ВКЛ практыкавалі не толькі місіянерскую позу, але і іншыя. Былі знаёмы розныя пяшчоты, пазавагінальны секс, групавы секс.

Для сексуальнага кантакту важна было наяўнасць партнёра, месца, валоданне тэхнікамі, здароўе, патэнцыя. Секс у шлюбе адносілі да катэгорыі неабходных абавязкаў. Задавальненне секс прыносіў там, дзе ўзнікалі жарсці і прага сексу, прычым жаданне праяўлялі як мужчыны, так і жанчыны.

Адсутнасць падручнікаў па сексе, якія б былі створаны на тэрыторыі ВКЛ, значна абмяжоўвае даследчыцкія магчымасці. Да нас таксама не дайшлі дзённікі пра сексуальныя прыгоды з апісаннем тэхнік. Атрыманая інфармацыя мае ўскосны характар. Аднак нават гэтыя звесткі сведчаць пра важнасць інтымнай сферы жыцця і атрымання задавальнення ў ёй.

Summary

Sexual attitudes and practices in Belarus in the 16th and 17th centuries

The article is devoted to sexual attitudes and behaviours in Belarus in the 16th and 17th centuries. Particular attention is given to chastity, sex in family life, places for love making, sexual potency and impotency, as well as sexual techniques and practices. Sexual attitudes were shaped by the law, religion, traditions and medicine. Contacts with other cultures through travel, education and literature were also significant. Religion was the most important factor: it restricted the choice of techniques, indicating which of them were sinful. However, the presence of pagan customs and physical appetites made it impossible to subordinate sex to religion and destroy sexual satisfaction.

In the Great Duchy of Lithuania various sexual techniques were used. In sexual encounters, a suitable partner, place, knowledge of techniques, health and potency were very important. Sex was satisfying when it was accompanied by sexual desire, which was manifested both by men and women. There were no sex manuals in the territory of the Great Duchy of Lithuania, which significantly limits research possibilities. We do not know of any diaries with descriptions of techniques, either. The existing sources, however, are evidence of the importance of this intimate sphere of life and it being a source of satisfaction.

Streszczenie

Praktyka starobiałoruskiego seksu w XVI-XVII wieku

Artykuł traktuje o starobiałoruskiej praktyce seksu w XVI-XVII w. Autorka szczególną uwagę zwróciła na cnotliwość, seks w życiu rodzinnym, miejsce stosunków, potencję, impotencję, techniki i praktykę seksu. Kształtowanie postaw w sferze seksualnej odbywało się pod wpływem prawa, religii, tradycji, zwyczajów, medycyny. Nie bez znaczenia były kontakty z innymi kulturami poprzez podróże, edukację i literaturę. Z wyliczonych czynników najważniejszym była religia, która reglamentowała techniki i wskazywała, które z nich są grzeszne. Obecność zwyczajów pogańskich oraz fizyczne żądze nie pozwoliły na podporządkowanie seksu religii i zniszczenie satysfakcji seksualnej.

W Wielkim Księstwie Litewskim praktykowano różne techniki stosunków płciowych. W kontaktach seksualnych ważną sprawą był odpowiedni partner, miejsce, znajomość technik, zdrowie i potencja. Seks w małżeństwie zaliczał się do niezbędnych obowiązków. Satysfakcję seks przynosił tam, gdzie było pożądanie, przy czym przejawiali je zarówno mężczyźni, jak i kobiety. Brak podręczników seksu tworzonych na terytorium WKL znacznie ogranicza możliwości badawcze. Nie doszły do nas również dzienniki z opisem technik. Jednak istniejące przekazy świadczą o ważności intymnej sfery życia i osiąganej z niej satysfakcji.

Natalla Sliż — historyk, pracuje w grodzieńskiej filii Białoruskiego Instytutu Prawoznawstwa, autorka ponad 140 artykułów. Zainteresowania badawcze: historia rodziny szlacheckiej, historia małżeństwa szlacheckiego, historia Grodna w XVI-XVIII ww.

Adam Pytel
(Warszawa)

Powstanie eparchii grodzieńskiej

Omawiając powstanie diecezji grodzieńskiej w 1900 roku, nie można pominąć analizy sytuacji panującej w diecezji wileńsko-litewskiej[1], w której granicach leżała gubernia grodzieńska. Należy wziąć pod uwagę system parafialny, stan gospodarczy guberni, odpowiedzieć na kilka kwestii dotyczących czynników regulujących ówczesne życie cerkiewne zarówno w guberni grodzieńskiej, jak i całej diecezji. Istotną kwestią był przyrost demograficzny oraz wzrost pobożności prawosławnych wiernych. Czynniki te spowodowały, że parafie rozrastały się i zachodziła konieczność erygowania nowych jednostek parafialnych. Istotnym problemem była też sytuacja materialna duchowieństwa.

Pod koniec XIX wieku na Grodzieńszczyźnie nastąpił wzrost demograficzny, co skutkowało wzrostem liczby wiernych prawosławnych. Po wojnach napoleońskich oraz wojnie krymskiej (1855-1856), które pochłonęły setki tysięcy ofiar, liczba ludności w granicach Imperium Rosyjskiego zaczęła wzrastać. Wiek XIX w Rosji upłynął pod znakiem rozwoju rosyjskiej duchowości oraz rosyjskiej myśli religijnej. Po okresie Oświecenia, kiedy skupiono się na człowieku, jego potrzebach i przyjemnościach, społeczeństwo Rosji zaczęło bardziej identyfikować się z prawosławiem. O ile prądy oświeceniowe docierały do warstw uprzywilejowanych, takich jak dwór carski, arystokracja i inteligencja, o tyle prawosławie jako religia wraz z całym swym bogactwem bizantyjskiej liturgii, teologii, sztuki i duchowości docierała do wszystkich ówczesnych klas społecznych. Prawosławie w Imperium Rosyjskim było traktowane jako jeden z filarów państwowości rosyjskiej i tożsamości narodowej[2]. Z tego powodu po rozbiorach Rze-

[1] Po rozporządzeniach reorganizacyjnych Świątobliwego Synodu z 22 stycznia 1840 r. w granice nowej diecezji wileńsko-litewskiej weszła gubernia kowieńska, wileńska, grodzieńska oraz obwód białostocki. Por.: I. Matus, *Schyłek unii i proces restytucji prawosławia w obwodzie białostockim w latach 30. XX wieku*, Białystok 2013, s. 474.

[2] Tzw. rosyjska triada wartości — prawosławie, samodzierżawie, narodowość. Był to wyznacznik światopoglądu rosyjskiego, wprowadzony w 1883 r. przez ówczesnego ministra oświaty hrabiego Sergiusza Uwarowa, inaczej zwany „triadą Uwarowa", uważany za „osobowość narodu rosyjskiego". Jako kategoria estetyczno-ideologiczna znalazła też miejsce w „trójjedynej" formule socrealizmu: partyjność, jedność, narodowość. Formuła „osobowości narodu" rosyjskiego jest archetypem nacjonalizmu rosyjskiego zarówno z czasów carskich, jak i sowieckich, oraz nieodłączną cechą patriotyzmu narodu rosyjskiego. Za: P. Czaadajew, *Apologia obłą-*

czypospolitej[3] tereny, które weszły w skład Cesarstwa Rosyjskiego, były rusyfikowane poprzez tworzenie w głównych miastach, takich jak Wilno, Grodno, Brześć, ośrodków garnizonowych dla wojsk carskich. W ośrodkach tych wznoszono nowe cerkwie, rozbudowywano strukturę parafialną, zasilano miejscowe duchowieństwo klerem z Moskwy lub Petersburga. Szczególna uwaga zwrócona była zachodnie tereny Imperium, zwłaszcza na Wileńszczyznę, Grodzieńszczyznę, ziemię brzeską, wołyńską oraz chełmską i zamojską.

Istotną rolę w tym procesie odgrywało samo Grodno, które ze względu na zaplecze gospodarcze i kulturalne 1 stycznia 1801 r. zostało mianowane stolicą guberni[4]. W tym czasie w stolicy guberni grodzieńskiej nie odno-

kanego, http://www.filozofiarosyjska.uz.zgora.pl/images/teksty/apologia%20oblakanego.pdf [dostęp 27.08.2017]. Doktryna Sergiusza Uwarowa miała dowodzić, iż wiara prawosławna „stanowi ostoję caratu, a cesarz sprawuje władzę z woli Boga". Można to interpretować tak, iż każdy, kto dokona odstępstwa od prawosławia, będzie tym samym uważany za opozycjonistę wobec władzy. W ślad za tą doktryną Sergiusz Uwarow w 1836 r. ustanowił prawo dotyczące małżeństw mieszanych. W przypadku, gdy jedna z osób pragnących zawrzeć związek małżeński była wyznania prawosławnego, ślubu miał udzielić duchowny prawosławny, a potomstwo z tego związku miało być ochrzczone w cerkwi. Za: V. Winnicka, *Rosjanie w Polsce. Czas zaborów 1795-1915*, Warszawa 2015, s. 379. „Rosyjska triada wartości", czy też wcześniej wymieniona „triada Uwarowa", nazywana „trójjedyną formułą", według prof. Andrzeja Andrusiewicza była próbą rehabilitacji samodzielnej myśli rosyjskiej. Należy przy tym nadmienić, iż te trzy tezy, których autorstwo przypisuje się ówczesnemu ministrowi oświaty Sergiuszowi Uwarowowi swoje źródło miały w myśli oraz idei rosyjskiego historyka Mikołaja Karamzina, który pierwsze wzmianki o koncepcji samodzierżawia jako niezbędnego czynnika wewnętrznego szczęścia Rosji zapisał w swej notatce zatytułowanej „О древнией и новой Русии". Uwarowska teoria została opublikowana dopiero po śmierci jej autora na łamach pisma „Вестник Европы" w 1872 r. przez historyka Aleksandra Pypina, który jako pierwszy nadał jej miano oficjalnej rosyjskiej teorii ludowości. Za: A. Andrusiewicz, *Cywilizacja rosyjska*, t. 2, Warszawa 2005, s. 293-294.

3 Po pierwszym rozbiorze Polski w 1772 r. połowa ludności prawosławnej z terenu Rzeczypospolitej znalazła się w granicach Imperium Rosyjskiego (ok. 300 tys. osób). Oprócz wyznawców prawosławia na wcielonych do Rosji terenach znalazło się 100 tys. wyznawców Kościoła rzymskokatolickiego i 800 tys. unitów. Status wyznań obrządku zachodniego został uregulowany traktatem polsko-rosyjskim z 7 (18) września 1773 r., zapewniającym im wolność wyznaniową na obszarach nowo przyłączonych do Rosji. Szerzej: A. Mironowicz, *Diecezja białoruska w XVII i XVIII w.*, Białystok 2008, s. 277.

4 Po trzecim rozbiorze Polski w 1795 r. z guberni wileńskiej i grodzieńskiej utworzono dwie inne gubernie — wileńską i słonimską, które w 1797 r. połączono w jedną gubernię — litewską. Gubernia grodzieńska została wydzielona z rozległej obszarowo guberni wileńskiej i składała się z powiatów: grodzieńskiego, słonimskiego, brzeskiego, kobryńskiego, prużańskiego, wołkowyskiego, lidzkiego i nowogródzkiego. Powiat bielski, sokólski, białostocki i północna część okręgu grodzieńskie-

towano żadnej świątyni prawosławnej. Na początku XIX wieku na terenie guberni były tylko 3 cerkwie: w Bielsku, Zabłudowie i Drohiczynie (wchodzącym w skład powiatu bielskiego) oraz monaster św. Symeona Słupnika w Brześciu. Liczba wiernych prawosławnych w wymienionych parafiach nie przekraczała trzech tysięcy. W tym czasie na terenie guberni było aż 559 kościołów[5]. Był to efekt wieloletniej latynizacji terenów Grodzieńszczyzny oraz intensywnej działalności unickiej. Dla porównania, po erygowaniu diecezji grodzieńskiej na początku XX wieku gubernia liczyła już 350 parafii prawosławnych i 850 tys. wiernych[6].

Dynamiczne odrodzenie Kościoła prawosławnego na Grodzieńszczyźnie rozpoczęło się po przyłączeniu jej do Cesarstwa Rosyjskiego. W 1807 roku w Grodnie odrestaurowano dawny Kościół Fary Witoldowej oraz przemianowano go na Sobór Mądrości Bożej, pełniący funkcję katedry. Restauracja i przemianowanie świątyni, ufundowanej niegdyś przez wielkiego księcia Witolda — propagatora obrządku łacińskiego, miało na celu przystosowanie jej na potrzeby licznie stacjonujących w Grodnie wojsk rosyjskich. Zanim na terenach zachodnich guberni Imperium przywrócono prawosławie, w 1833 roku wierni prawosławni z guberni grodzieńskiej w związku ze zmianami granic diecezjalnych znaleźli się w składzie eparchii mińsko-grodzieńskiej, siedem lat zaś później — w 1840 roku — w nowo utworzonej diecezji litewsko-wileńskiej, w której pozostawali przez najbliższe sześćdziesiąt lat, do 1900 roku. Jeszcze w 1840 r. utworzono wikariat brzeski eparchii wileńsko-litewskiej, której przedstawiciel od 1848 r. rezydował w monasterze św. św. Borysa i Gleba w Grodnie[7]. Jednym z powodów utworzenia wikariatu była zasada, że każda gubernia miała swoją diecezję, której granice pokrywały się z granicami administracyjnymi guberni.

go wchodziły wówczas w skład Prus (pozostawały w ich składzie w latach 1795-1807). Wcielono je do Rosji po podpisaniu przez cara Aleksandra i Napoleona Bonapartego w 1807 r. traktatu tylżyckiego. W skład guberni grodzieńskiej włączono je dopiero w 1847 roku. Szerzej: *Сотлетие Гродненской губерни*, «Гродненские Епархиальные Ведомости» (dalej: ГЕВ), 1902, № 2, c. 12. Sytuacja gospodarcza w Rosji w pierwszych latach XIX w. nie była w najlepszej kondycji. Spadała wartość rubla, a wydatki państwa pogrążały je w co raz większe zadłużenie. W tym czasie Imperium liczyło 1,5 miliona obywateli mieszkających w samych miastach, liczba zaś duchowieństwa prawosławnego przekraczała ponad 200 tysięcy osób. Za: A. Andrusiewicz, *Aleksander I. Wielki gracz — car Rosji — król Polski*, Warszawa 2015, s. 539.

[5] ГЕВ, 1906, № 5/6, c. 69.

[6] И. Корчинский, *Столетие Гродненской губернии*, ГЕВ, 1902, № 2, c. 13-14.

[7] Tamże; А. В. Кузьмин, Л. Е. Кулаженко, *Гродненская и Волковыская епархия*, [w:] *Православная энциклопедия*, Москва 2006, s. 154.

Po III rozbiorze Rzeczypospolitej w 1795 roku na obszarze wcześniejszych rozbiorów została utworzona eparchia mińska, natomiast parafie, które weszły w skład Cesarstwa Rosyjskiego, zostały podporządkowane ustrojowi synodalno-konsystorskiemu. W 1799 r. Grodno wraz z Wołkowyskiem oraz terenami do nich przylegającymi weszły w skład diecezji mińskiej i litewskiej. Należy przy tym nadmienić, że po kasacie unii kościelnej w 1839 roku prawosławie na omawianych terenach zunifikowano z prawosławiem rosyjskim, zachowując jednak charakterystyczną mu specyfikę obrzędową[8]. Przywracając na Grodzieńszczyźnie prawosławie, przywrócono jej pierwotną wiarę chrześcijańską, która dotarła tu blisko tysiąc lat wcześniej.

Prawosławie, będąc jednym z filarów Cesarstwa Rosyjskiego, stanowiło ważną siłę moralną i duchową społeczeństwa. Zachodnie tereny, które zostały wcielone do Rosji, charakteryzowały się tendencjami unickimi, katolickimi oraz żydowskimi. Carat wraz ze Świątobliwym Synodem dokonali rozbudzenia prawosławia na terenach Grodzieńszczyzny, co ilustruje liczebny oraz procentowy wzrost wiernych tego wyznania na terenie guberni w 1860 r. Gubernia liczyła wówczas 862 854 mieszkańców, z czego 464 265 osób było wyznania prawosławnego (53,80%), 295 132 wyznawało katolicyzm (34,20%), 5791 było wiernymi Kościoła reformowanego (0,67%), 1159 osób wyznawało islam (0,13%), 96 507 — judaizm (11,17%)[9]. W 1894 r. w ogólnej liczbie 50 952 mieszkańców Grodna było już 11 500 wiernych prawosławnych, 30 000 Żydów oraz 8200 katolików. W Grodnie znajdowało się wówczas 5 świątyń prawosławnych, 3 kościoły katolickie, 1 luterański i 2 synagogi[10]. Rząd carski starał się w ten sposób dokonać unifikacji miejscowej ludności z prawosławiem rosyjskim. Jak pokazała wcześniejsza historia tych terenów, był to powrót do religii przodków i zarazem umocnienie państwowości rosyjskiej na jej zachodnich rubieżach. Rozbudowa struktur Kościoła prawosławnego w granicach guberni grodzieńskiej niosła za sobą rozwój sieci parafialnej i administracji cer-

[8] I. Matus, *Schyłek unii*, s. 473.

[9] *Материалы дла географии и статистики России, собранные офицерами Генералнаго Штаба. Гродненская Губерния*, ред. П. Бобровский, Санкт-Петербургъ, 1863, ч. 1, с. 108. Eparchia wileńsko-litewska składała się wówczas z 29 dekanatów, w których skład wchodziło 317 parafii. W Grodnie zaś urzędował biskup brzeski, który był wikariuszem diecezji wileńsko-litewskiej. Zob.: tamże.

[10] Autorzy publikacji *Кронон* podają, że w 1856 r. Grodno liczyło zaledwie 18 386 osób, natomiast 5 lat później — 20 241. Ponadto wyniki spisu z 1859 r. ukazują zasoby ekonomiczne (24 kupców, 6 rynków, 545 rzemieślników), jakimi dysponowało miasto. А. П. Гостев, В. В. Швед, *Кронон. Летопис города на Немане (1116-1990)*, Гродно 1993, s. 66.

kiewnej. Dynamiczny rozrost struktur cerkiewnych na Grodzieńszczyźnie z czasem stał się dumą społeczności prawosławnej, zamieszkującej te tereny i należących do lokalnych parafii. To z kolei niosło ze sobą potrzebę większej liczby duchowieństwa, które kształciło się wówczas przeważnie w Prawosławnym Seminarium Duchownym w Wilnie.

W społeczeństwie guberni grodzieńskiej wyróżniały się takie wybitne jednostki jak F. Sidorowski i W. Sorokin — zamożni kupcy i fundatorzy wielu nowych świątyń prawosławnych na terenie Grodzieńszczyzny, a także wybitni historycy i działacze cerkiewni, między innymi Michał Osipowicz Kojałowicz, pochodzący z Kuźnicy Białostockiej profesor Petersburskiej Akademii Duchownej, doktor teologii i autor wielu prac z zakresu historii Kościoła prawosławnego, unii brzeskiej oraz dziejów Kościoła unickiego na terenie Litwy[11], Flor Sosnowski — założyciel nauczycielskiej szkoły cerkiewnej w Stawku (powiat bielski), a także biskup Józef (Sokołow), wikariusz brzeski, autor szeregu publikacji poświęconych historii Wileńszczyzny i Grodzieńszczyzny[12].

Momentem zasiewu idei wyodrębnienia samodzielnej diecezji grodzieńskiej ze struktur diecezji wileńsko-litewskiej okazał się artykuł opublikowany w „Grodzieńskich Wiadomościach Eparchialnych" („Гродненские Епархиальные Ведомости") w 1870 roku[13]. Treść artykułu szerokim echem odbiła się w stolicy diecezji — Wilnie. Litewski Konsystorz Duchowy próbował odpierać argumenty zawarte w artykule i opowiadające się za erygowaniem nowej samodzielnej diecezji. Próbowano pójść na kompromis z grodzieńskimi działaczami cerkiewnymi, rozszerzając w 1885 roku uprawnienia biskupa brzeskiego, w samym Grodnie zaś tworząc siedzibę przedstawiciela Zarządu Budownictwa Cerkiewnego i Zarządu Zabezpieczenia Bytu Duchowieństwa. To jednak nie wystarczyło społeczności wiernych, którzy znali wartość Grodzieńszczyzny jako zaplecza gospodarczego i kulturalnego dla całej diecezji wileńsko-litewskiej[14]. Dlatego też wśród argumentów przemawiających za utworzeniem nowej eparchii był dynamiczny rozwój struktur cerkiewnych i świadczące o tym regularne zjazdy duchowieństwa i protokoły publikowane na łamach periodyku „Litewskie Wiadomości Eparchialne" („Литовские Епархиальные Ведомости")[15]. Z protokołów można wywnioskować, iż życie kleru parafialnego

[11] I. Matus, *Schyłek unii*, s. 536.

[12] ГЕВ, 1901, № 32, s. 234.

[13] H. Surynowicz, *Organizacja Cerkwi prawosławnej na Grodzieńszczyźnie w XIX wieku*, [w:] *Pokazanie Cerkwie prawdziwej.... Studia nad dziejami i kulturą Kościoła prawosławnego w Rzeczypospolitej*, Białystok 2004, s. 149.

[14] «Литовские Епархиальные Ведомости» (dalej: ЛЕВ), 1900, № 4, s. 25.

[15] ЛЕВ, 1898, № 2, s. 36-38.

oraz dekanalnego w tych czasach na terenie Grodzieńszczyzny było dobrze zorganizowane i zarządzane.

Kolejnym argumentem przemawiającym za stworzeniem nowej jednostki diecezjalnej było życie monastyczne, którego niezaprzeczalny rozwój w Rosji obserwuje się na przestrzeni całego XIX wieku. Miało to związek z uduchowieniem społeczeństwa, co sprzyjało wzrostowi powołań kapłańskich i monastycznych. Rozkwit dotyczył też wydawnictw literatury duchownej. W XIX wieku wydano ponad tysiąc pozycji książkowych o tematyce religijno-duchownej, co stanowiło 15% ogółu literatury wydanej w całym kraju. Tematyka wydawanej literatury dotykała między innymi relacji prawosławia z katolicyzmem oraz unityzmem, historii monasterów oraz związanego z nimi bogactwa życia monastycznego[16].

Rozbudzenie duchowości w narodzie rosyjskim w XIX wieku było niewątpliwie reakcją zwrotną na poprzedzające je czasy Oświecenia i skrajnego humanizmu. Jeszcze na przełomie XVIII i XIX wieku do Rosji napływała ideologia, mająca związek z zachodnim liberalizmem, który rozwinął się na bazie protestantyzmu. Głosił on niczym nieograniczoną władzę w sprawach wiary, co w praktyce oznaczało wolnomyślicielstwo dotyczące przedmiotów kultu, interpretacji dogmatów czy też dowolnego komentowania Pisma Świętego. Prądy oświeceniowe koncentrowały się na cielesności człowieka, jego fizjologii, a także na owocach ludzkich dokonań będących naukowymi symbolami tamtego okresu — filozofii oświecenia, sztuce, a także zainteresowaniach medycyną oraz jej rozwojem. Przyczyną rozwoju wolności słowa w Rosji była kultura francuska, tak popularna w dworskich kręgach arystokratycznych i szlacheckich. Co zaś się tyczy prądów myślowych, które miały w tym okresie istotne znaczenie, to szczególnie popularny był encyklopedyzm francuski. Był on wysoko ceniony w kręgach elitarnych jako wyraz dobrego, europejskiego wykształcenia. W odpowiedzi na tego typu zjawiska zareagowała Cerkiew prawosławna i duchowieństwo, które w kazaniach potępiało nowe ideologie zachodnie. To z kolei sprowokowało reakcję władzy, która wprowadziła cenzurę kościelną oraz sporządziła kanon ksiąg zakazanych[17].

O ile Oświecenie dotarło tylko do carskiego dworu, magnaterii oraz szlachty, o tyle rozwój duchowości dotknął po trosze wszystkie warstwy społeczeństwa. Rosnący poziom życia religijnego znajdował swoje od-

[16] В. Н. Черепица, *Исторические исследования. Монастыри белорусских православных епархий в историко-богословской литературие XIX — нач. XX вв*, ГЕВ, 1996, № 7-8, с. 20.

[17] Szerzej: Archim. Jerzy (Pańkowski), *W poszukiwaniu zbawienia. Bogactwo i piękno życia duchowego w ascetyczno-teologicznej myśli św. Ignacego Branczaninowa*, Hajnówka 2007, s. 16.

zwierciedlenie w poszerzającej się działalności charytatywnej Cerkwi prawosławnej, a także w niezwykle dynamicznym rozwoju teologii oraz charakterystycznej dla tego okresu rosyjskiej myśli teologicznej. Powstała ona w wyniku wzrostu poziomu uczelni teologicznych, które wyłoniły wybitnych teologów swojej epoki. Wśród pionierów rosyjskiej myśli teologicznej znalazło się wielu teologów świeckich, takich jak Aleksy Chomiakow, Włodzimierz Sołowjow, bracia Aksakowowie oraz książęta Trubieccy.

Rozwój nauk teologicznych oraz charakterystycznej dla ówczesnego prawosławia rosyjskiej myśli teologicznej odcisnęły swoje piętno również w sztuce, literaturze i poezji. Wiek XIX to rozkwit działalności naukowej na gruncie teologicznym. Wykształcenie duchowieństwa nigdy wcześniej nie miało tak wysokiego poziomu[18]. Zajmowano się badaniem oraz egzegezą Pisma Świętego, przybliżano historię Kościoła oraz dogmatykę. Rozwinął się również śpiew cerkiewny. Słynni rosyjscy kompozytorzy znani byli głównie z uczestnictwa w chórach i kapelach nadwornych. Aleksander Archangielski, Dymitr Bortniański, Piotr Czajkowski komponowali również muzykę do cerkiewnych utworów śpiewanych. Aby zyskać szerszy odbiór społeczności wiernych prawosławnych, artykuły o tematyce dogmatycznej oraz moralnej i historycznej publikowane były na łamach cerkiewnej prasy również w diecezji wileńsko-litewskiej[19].

W XIX wieku Rosja posiadała tysiące monasterów, spośród których największą liczebnością wyróżniały się monaster sołowiecki, wałaamski, kijowsko-pieczerski w Kijowie, żyrowicki i poczajowski. Rozwój prawosławnej teologii i duchowości w XIX-wiecznej Rosji wpływał na wzrost liczby powołań kapłańskich i mniszych. Część kandydatów do stanu duchownego przybywała na Grodzieńszczyznę, gdzie powoływano do życia parafie pounickie i rozbudowywano życie monastyczne. Rozwój monastycyzmu w ówczesnej Rosji zaowocował wybitnymi postaciami rosyjskiej duchowości, takimi jak św. Serafin Sarowski, św. Teofan Pustelnik (Rekluz) — autor patrystycznej ascezy, św. Ignacy Branczaninow, św. Jan Kronsztadzki, starcy Pustelni w Optino, z których najbardziej znanym był św. Ambroży. Wśród nich pojawiło się szereg przedstawicieli hierarchii Rosyjskiej Cerkwi Prawosławnej, którzy wnieśli duży wkład w rozwój nauk teologicznych, na przykład metropolita moskiewski Filaret (Drozdow) — autor „Dogmatyki", metropolita Makary (Bułgakow) — znakomity znawca historii Cerkwi czy wybitna osobowość akademicka — metropolita Antoni (Chrapowicki)[20].

18 Tamże, s. 18-20.

19 ЛЕВ, 1898, № 17, s. 161-164; ЛЕВ, 1898, № 18, s. 168-170.

20 Archim. Jerzy (Pańkowski), *W poszukiwaniu zbawienia*, s. 25. Szerzej por.: A. Mironowicz, *The Orthodox Church in Tsarist Russia*, [w:] *Russia of the Tsars, Russia of the Bolsheviks, Russia of the New Time*, ed. J. Malicki, Warszawa 2012, s. 7-16;

Праблематыка рэвалюцыі 1905–1907 гг. не належыць да папулярных даследчых кірункаў у беларускім навуковым асяроддзі. Практычна без рэха прайшлі сотыя ўгодкі бурлівых падзей пачатку XX ст. Аднак рэвалюцыя, якая, безумоўна, запачаткавала сучасныя палітычныя і грамадскія плыні ў Расійскай імперыі ў масавым маштабе, была значнай падзеяй і па сёння застаецца актуальнай даследчай тэмай. Уплыў ад яе на сабе адчувалі розныя слаі насельніцтва, у тым ліку і сяляне, лічба якіх дасягала прыкладна 84% (1 210 255 чалавек) ад агульнай колькасці жыхароў Гродзенскай губерні. Прынамсі дзеля гэтага факта сяляне ў кантэксце рэвалюцыі і рэвалюцыя ў адчуванні сялян павінна заняць сваё месца сярод сучасных даследаванняў.

Увогуле, трэба сказаць, што Гродзенская губерня з’яўляецца цікавай тэмай для даследчыкаў у сувязі са сваім геаграфічным і этна-канфесійным палажэннем. Не толькі паслярэформенныя гаспадарчыя супярэчнасці (малазямелле, недахоп лесу, выганаў і пакосаў, вялікая цераспалосіца, адсутнасць знакаў, раздзяляючых уладанні памешчыкаў і сялян, неўстанаўленне ў актах зямельнага ўладкавання сялян дакладных меж сервітутных паш) і дэмаграфічны фактар, але і этнічныя, грамадскія і рэлігійныя адносіны паміж жыхарамі губерні, у тым ліку сялянамі, тварылі ў рэгіёне цікавую мазаіку.

Рэвалюцыйная гістарыяграфія савецкага перыяду (Канстанцін Шабуня[1], Вячаслаў Панюціч[2], Уладзімір Пічэта[3], Леанід Ліпінскі, Емя-

* Артыкул падрыхтаваны ў рамах даследавання «Rewolucja 1905 roku w guberni grodzieńskiej. Oblicze ideowe a wymiar praktyczny» (grant FUGA 4, NCN: Nr DEC-2015/16/S/HS/00532).

[1] К. И. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905-1907 гг.,* Минск 1962.

[2] В. П. Панютич, *Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861-1914 гг.*, Минск 1996.

[3] В. И. Пичета, *Крестьянское и рабочее движение на Белоруссии в эпоху 1905*

льян Лукянаў[4], Уладзімір Салашэнка[5], Уладзімір Крук[6]), хоць важная і адносна разнастайная, але ж тэндэнцыйная. Згодна з марксісцкай метадалогіяй акцэнт ставіўся на вядучую кіруючую ролю бальшавікоў, арганізуючых рабочых і сялян. Шмат увагі прысвячалася таксама дыферэнцыяцыі сялянства і класавай барацьбе не толькі паміж сялянамі і памешчыкамі, але і ўнутрыкласавым змаганням беднякоў і кулакоў. Сёння тэма патрабуе пераасэнсавання, новых даследаванняў і сучасных навуковых падыходаў[7]. Можна дакладна сказаць, што ў савецкай гістарыяграфіі ўплывы РСДРП сярод сялян Гродзенскай губерні перабольшаны. У дадатку працы савецкіх аўтараў у асноўным імкнуліся да абагульнення тэмы па тэрытарыяльным прынцыпе (БССР), часцяком мінаючы лакальныя фактары.

У сваю чаргу польская гістарыяграфія рэвалюцыі 1905 года, зрэшты як і ў часы ПНР, накіраваная на даследаванне зямель, якія знаходзяцца ў межах сучаснай Польшчы, перш за ўсё на Царства Польскае. Трэба памятаць, што ў склад Гродзенскай губерні ўваходзіла Беласточчына[8]. Таму і савецкія, і польскія даследчыкі не разглядалі асобна Гродзенскай губерні[9]. Па падліках К. Шабуні, Гродзенская губерня па колькасці сялянскіх выступленняў (1905–1907) саступае іншым беларускім губерням (349 да 488 у Мінскай)[10], але калі дадаць Беластоцкі, Бельскі ды Сакольскі паветы, то карціна можа прыблізіцца да ўсходніх беларускіх губерняў.

года, „Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта", 1926, № 11; У. Пічэта, *Сялянскі рух на Беларусі пасля аграрнай рэформы 1861 г.*, „Полымя", 1929, № 8–9.

4 Л. П Липинский, Е. П Лукьянов, *Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900-1907 гг.)*, Минск 1968; Л. П. Липинский, *Классовая борьба в белорусской деревне, 1907-1914 гг.*, Минск 1981.

5 В. И. Солошенко, *Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии (1903 — март 1917 гг.)*, Минск 1981.

6 У. П. Крук, *Сялянскі рух на Беларусі 1864-1900 гг.*, рэд. М. В. Біч, Мінск 1993.

7 С. Токць, *Савецкая гістарыграфія беларускага сялянства перыяду Расійскай імперыі*, „Гістарычны Альманах", 2004, т. X, с. 45–73.

8 *Walki chłopów Królestwa Polskiego w rewolucji 1905–1907*, t. 1: *styczeń– wrzesień 1905*, zebr. i opr. S. Kalabiński i F. Tych, Warszawa 1958, s. 1–35; t. 2: *październik 1905– styczeń 1906*, Warszawa 1960, s. 9–13; t. 3: *luty 1906– czerwiec 1907*, Warszawa 1961, s. 5–26.

9 Адзіная і цяжка даступная праца Акцябрыны Феафілаўны Рудой, якая тычыцца Гродзенскай губерні, з'явілася яшчэ ў сталінскія часы: О. Ф. Рудая, *Революционное движение в Гродненской губернии в 1905–1907 годах [Текст]: Автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата исторических наук*, Белорусский государственный университет им. В. И. Ленина, Минск 1952.

10 К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение*, прил. 6.

Натуральна, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі можна знайсці асобныя спробы пераасэнсаваць рэвалюцыйныя падзеі[11], з'яўляюцца працы, прысвечаныя сацыяльным і культурным працэсам беларускіх сялян, аднак у гэтых працах акцэнт робіцца на ўзнікане і развіццё іх нацыянальнай свядомасці, сацыяльнай трансфармацыі[12] і гаспадарчых змен, пакідаючы палітычна-рэвалюцыйныя фактары па-за даследчай зацікаўленасцю[13]. Тым не менш, нават у сучасных грунтоўных энцыклапедычных апрацаваннях сустракаюцца тэксты, якія стракацяць ад цытатаў Уладзіміра Леніна[14].

Цяжка і ў даволі разнастайнай расійскай літаратуры, прысвечанай Першай расійскай рэвалюцыі, знайсці працы, асвятляючыя падзеі ў гэтым рэгіёне.

У артыкуле мы не будзем пісаць хроніку рэвалюцыі, на гэта яшчэ прыйдзе час, а паспрабуем паставіць некаторыя даследчыя пытанні, разгледзець напрамкі далейшых даследаванняў. Адно з асноўных пытанняў: як рэвалюцыя ўплывала на свядомасць сялян?[15] Наколькі вялікай была ўспрымальнасць сялян на сацыялістычную агітацыю і рэвалюцыйныя ідэі? Якім чынам праходзіла прапаганда сярод сялян і якія формы супраціву былі больш уласцівыя вяскоўцам Гродзенскай губерні падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг.? Якім чынам тварылася гра-

[11] В. М. Фомин, *Гиперболизация политической роли рабочего класса и партии большевиков в революции 1905-1907 гг. в историографии Беларуси*, [у:] *Актуальныя пытанні гістарыяграфіі айчыннай і сусветнай гісторыі: зборнік навуковых прац*, Минск 2012, с. 147-156.

[12] А. Г. Каханоўскі, *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861-1914 гг.)*, Мінск 2013; С. А. Талмачова, *Сялянскае самакіраванне ў Беларусі (1861-1901 гг.): аўтарэф. дыс. канд. гіст. навук: 07.00.02*, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск 2002; В. М. Астрога, *Вясковае настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX стст.: аўтарэф. дыс. канд. гіст. навук: 07.00.02*, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск 2005.

[13] Адным з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў вясковага пытання, аўтарам шматлікіх прац з'яўляецца гродзенскі гісторык Сяргей Токць. Гл.: С. М. Токць, *Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX — пачатку XX ст.*, Мінск 2016.

[14] *Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да 1996 г.: у трох тамах*, т. 2: *Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г.,* ч. 2: *1900– сакавік 1917*, З. Е. Абезгауз, Х. Ю. Бейлькін, А. Р. Бухавец і інш.; пад рэд. В. П. Панюціча, Мінск 2002.

[15] H. Brodowska, *Problemy badawcze świadomości chłopów w okresie zaborów*, „Acta Universitatis Lodziensis. Folia historica", 1992, nr 45, s. 9–21; С. М. Токць, *Палітычная свядомасць беларускага сялянства на пачатку XX ст.*, [у:] *Белорусская политология: многообразие в единстве: материалы Международной научно-практической конференции, Гродно, 27-28 мая 2004 г.*, редкол. В. Н. Ватыль и др., Гродно 2004, с. 193-194.

мадзянская прастора сялян, якія паступова фармаваліся як самастойны палітычны суб’ект?[16] Прыгаворы і наказы сялян 1905–1907 гг. безумоўна з’яўляюцца прадуктам калектыўнага дзеяння гэтай грамадскай групы. Ці і якім чынам рэвалюцыянеры развівалі сялян? На нашу думку, агітацыя дапамагала станаўленню палітычнай свядомасці, разбураючы паступова „наіўны манархізм”. Уплыў аказвалі былыя рабочыя з Пецярбурга, Адэсы, Екацерынаслаўля і іншых рабочых цэнтраў, удзельнікі вайны ў Маньчжурыі, маракі Балтыйскага флоту, габрэйскі пралетарыят і прапагандысты з Беластока і Слоніма. Існавалі прафесійныя сялянскія работнікі „хадакі”. Паводле сведак эпохі, пасля заняпаду руху сяляне „сябе і сваю працу цэняць вышэй, да ўсіх падзей ставяцца ўважліва, з прагнасцю накідваюцца на сучасную літаратуру”, адначасова „да ўсіх урадавых распараджэнняў ставяцца недаверліва, чакаюць дармавога надзелу зямлёй”. Аўтары канстатавалі, што хаця рух заціх сам сабою, але настрой у сялян „чакаючы”, яны пачуваюцца больш пэўнымі, а нават „нахабнымі”. У цэлым па губерні да вясны 1906 г. адзначалася, што рух сялян насіў мірны і арганізаваны характар (дзякуючы каардынаванню сацыялістычных агітатараў)[17].

Пачатак рэвалюцыі адзначыўся малой палітычнай свядомасцю сялян. Бунтаваліся яны па эканамічных матывах, якія датычылі канкрэтнай мясцовасці. Уваходзячы ў склад Паўночна-Заходняга краю, на захадзе Гродзенская губерня межавала з Каралеўствам Польскім, дзе рэвалюцыйныя працэсы сярод сялян праходзілі даволі інтэнсіўна[18]. Напрыканцы лютага 1905 г. з Седлецкай губерні ў кірунку Брэста і Бельска вырушылі дзве вялікія групы сялян, таму ў гарады былі дасланы па адным эскадроне кавалерыі[19]. Губернатар дакладваў міністру ўнутраных спраў, што сяляне Седлецкай губерні чужыя па мове і веры гродзенскім, таму рух не распаўсюдзіўся на ягоную губерню. Адсюль важнае пытанне ў гэтым кантэксце: ці было сярод сялян адчуванне агульнарасійскага вымярэння пратэстаў? Як вядома, ра-

[16] Падобны аналіз праводзіць малады польскі гісторык Віктар Мажэц у сваёй цікавай працы: W. Marzec, *Rebelia i reakcja. Rewolucja 1905 roku i plebejskie doświadczenie polityczne*, Łódź — Kraków 2016.

[17] *Аграрное движение в России в 1905–1906 гг. Обзоры по районам*, Б. Б. Веселовского, В. С. Голубева, В. Г. Громана [и др.], ч. 1, Санкт-Петербург 1908, с. 390–394.

[18] H. Brodowska, *Świadomość obywatelska chłopów pokolenia rewolucji 1905–1907 r.*, „Acta Universitatis Lodziensis. Folia historica”, 1984, nr 18, s. 83–94; S. Kalabiński, F. Tych, *Czwarte powstanie czy pierwsza rewolucja. Lata 1905–1907 na ziemiach polskich*, Warszawa 1976, s. 143–172.

[19] *Walki chłopów Królestwa Polskiego*, t. 1, s. 5.

бочыя Гродна і Беластока салідарызаваліся з Пецярбургам, Лоддзю, Варшавай і г.д., захавалася шмат дакументаў, якія распавядаюць пра салідарнасць некалькіх вёсак аднаго павета. Але ці сяляне разумелі праблемы вёсак далёкіх губерняў?

У сакавіку губернатар Міхаіл Асаргін дакладваў міністру ўнутраных спраў Аляксандру Булыгіну, што аб'язджаючы губерню даведаўся, што настрой агульна спакойны, незалежна ад агітацыі. Рабочы рух па сутнасці чужы сялянству. Тым не менш на нарадах з земскімі начальнікамі высветлілася, што „свядомасці сялян Гродзенскай губерні не чужая думка аб тым, што зямля павінна прыналежаць тым, якія самі яе апрацоўваюць", памешчыцкае землеўладанне павінна быць ліквідавана, а сяляне павінны коштам гэтага атрымаць новыя надзелы зямлі. Адносіны, якія „маюць за сабой на карысць памешчыка юрыдычную слушнасць, з маральнага пункту гледжання складваюцца на карысць сялян і гэтым чынам патрабуюць задавальнення з пункту гледжання агульначалавечай праўды". Прытым, аднак, усялякія аграрныя выступленні – гэта правапарушэнні. І ў маральным, і ў прававым аспекце сяляне не маюць рацыі, таму такія сітуацыі трэба вырашаць строга і цвёрда[20].

З цягам часу пад уплывам рэвалюцыйных падзей жыхары вёсак радыкалізаваліся. Сярод маладых сялян, успрымальных да сацыялістычнай агітацыі, тварыўся новы тып рэвалюцыянераў. У розных мясцовасцях у розныя перыяды часу можна аднатаваць розныя формы барацьбы. Сярод сродкаў супраціву можна пералічыць падпалы лясоў і маёнткаў, нелегальны сенакос, самавольны выпас скаціны, паляванне, вырубка лесу, адмова ад уплаты падаткаў і выконвання гаспадарчых прац, збіцці, а нават забойствы і г.д. Найбольш папулярнымі ў рэгіёне былі патравы, вырубка лесу і забастоўкі. Аднак былі моманты, калі сяляне выкарыстоўвалі больш радыкальныя формы, як падпалы. У Брэсцкім павеце ў другой палове 1906 г. адбылося 11 вялізных пажараў. Паводле К. Шабуні, яны былі не актамі адзіночнай помсты, а з'яўляліся „калектыўным выступленнем" сялян, узгодненым загадзя. Напрыклад, у земскага начальніка, які арыштаваў дэпутата Дзярждумы С. Кандрашука былі падпалены 3 стагі сена і ўраджай. У 1907 г. менавіта падпалы займалі першае месца сярод форм супраціву сялян. У Пружанскім павеце аднатавана 12 вялікіх пажараў[21].

[20] Там жа, s. 5–7; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (далей: НГАБ у Гродне), ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 2 адв.

[21] К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение*, с. 379, 382, 383, 414.

Мы не пагаджаемся з тэзісам С. Токця, што перабольшваннем з'яўляецца адносіць да сялянскага руху „звычайныя патравы палёў і высечку лесу, якія не насілі дэманстратыўнага характару і не суправаджаліся сутычкамі з паліцыяй”[22]. Нізавыя, неарганізаваныя і спантанныя дзеянні часцяком з'яўляюцца адметнай рысай сучасных грамадска-палітычных рухаў. Менавіта з такіх недэманстратыўных дзеянняў пачынаюцца пратэсты, суды, рух. У жніўні 1906 г. у вёсцы Ляўкова Ваўкавыскага павета падчас палявання быў забіты браканьер Юліян Асташук. Аб гэтым сялянам распавёў Павал Харкевіч, якому ўдалося ўцячы. Інфармацыя абляцела хутка Бельскі і Пружанскі паветы. Сяляне з сямі вёсак пачалі вяршыць самасуд: яны пабілі вартаўнікоў[23]. Цікава іншае — на колькі рэвалюцыя складвала ўсе гэтыя асобныя ціхія акцыі ў адзінае цэлае.

У супраціве ўдзельнічалі не толькі дарослыя мужчыны, але і падлеткі, а нават і цяжарныя жанчыны. Праз пратэсты і сумесныя мэты (нават кароткатэрміновыя, лакальныя і выключна гаспадарчыя) узмацнялася вясковая салідарнасць, закладаліся падмуркі сялянскага руху. Напрыклад, у студзені 1906 г. амаль усе жыхары левага боку Мастоў па цячэнні Нёмана вымусілі звольніць з арышту сялян, арыштаваных за падбухторванне да беспарадкаў. Пазней за гэта 27 чалавек патрапілі ў Гродзенскую турму[24].

У траўні 1907 г. у Гарадку Беластоцкага павета п'яныя сяляне Міхаіл Хлябіч і Вікенцій Радзішэўскі пачалі буяніць, спыняючы вазы сялян з цэглай і навозам, раскідваючы цэглы. Паліцэйскія стражнікі сілаю павялі іх у арышт, але па дарозе сабраўся натоўп са ста чалавек разам з сельскім старастам і патрабаваў вызваліць сваіх таварышаў, зневажаючы стражнікаў. Затрыманых адбілі[25].

Паводле выдатнага даследчыка гісторыі сялянства Тэадора Шаніна, „свядомыя” сяляне не пакідалі шэрагу, калі іх аднавяскоўцы выбіралі насілле. Яны не былі і супраць барацьбы са зброяй у руках, асабліва ў выпадках самаабароны, калі трэба было „даць адпор”, ці калі пад'ём рэвалюцыйнай хвалі ў раёне ці паслабленне армейскіх цікаў павялічвалі шанцы на перамогу. Больш ці менш свядома, больш

[22] С. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая траціна XX ст.*, Мінск 2007, с. 31.

[23] *Walki chłopów Królestwa Polskiego*, t. 3, s. 13–15.

[24] *Революция 1905–1907 гг. в России: документы и материалы*, гл. ред. А. М. Панкратова, ч. 1, кн. 2: *Второй период революции 1906–1907 г.: январь– апрель 1906 г.*, Москва 1959, с. 425.

[25] НГАБ у Гродне, ф. 588, воп. 1 спр. 11, арк. 459.

ці менш стыхійна, большасць свядомых сялян спрабавала выпрацаваць эфектыўную тактыку барацьбы за зямлю і за ўладу на месцах[26].

Іншы аспект тычыцца класавай барацьбы ўнутры самой вёскі[27]. У савецкай гістарыяграфіі прынята было лічыць змаганне беднякоў з вясковай буржуазіяй даволі важным кірункам барацьбы. Аднак трэба перагледзець гэтыя ідэйныя ўстаноўкі і канстатаваць, што часцяком „паўстанне здзяйснялася не маргіналамі, а тымі, хто адмаўляўся ператварацца ў такіх". Не былі выключэннем тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю, дзе сацыял-дэмакратаў падтрымлівалі найбольш адукаваныя і заможныя сяляне[28]. Па інфармацыі тагачасных карэспандэнтаў, у руху „ўдзельнічалі амаль усе слаі вёскі", „беднякі і сярэдняга дастатку, але амаль усе ім спачувалі"[29].

У Брэсцкім павеце ў Бардзёўцы ў чэрвені 1906 г. у маёнтку графіні Патоцкай адбыліся збройныя сутыкненні сялян. Генерал-маёр Пацэвіч рапартаваў: „Так як гэтая вёска лічыцца даволі заможнай, то заўсёды ішла на чале ўзніклага апошнім часам эканамічнага руху сярод сялян". Мясцовыя жыхары былі незадаволены, што прышлыя батракі працуюць за меншыя грошы. Сяляне былі перакананы, што жаўнеры не будуць у іх страляць (такая была агітацыя ўсіх рэвалюцыйных партый, так казалі былыя жаўнеры сярод сялян)[30]. Пад камандаваннем капітана Гніласырава сем сялян паранілі, а шэсць забілі[31].

У верасні 1906 г. у Яскевічах Гродзенскага павета пасля арышту шасці лідараў, якіх вялі ў паліцэйскае ўпраўленне, „усе жыхары вёскі, мужчыны і жанчыны, праводзілі арыштаваных натоўпам, лаючы паліцыю і кідаючы чым папала"[32].

У лістападзе 1905 генерал-маёр Пацэвіч пісаў пра рух парабкаў. У Бельскім павеце сто парабкаў з розных маёнткаў хадзіла па ма-

[26] Т. Шанин, *Революция как момент истины. Россия 1905–1907 гг. – 1917–1922 гг.*, перевод с английского: Е. М. Ковалев, Москва 1997, с. 175.

[27] С. М. Токць, *Заможнае сялянства паслярэформеннай беларускай вёскі ў святле мікрагістарычнага даследавання (на матэрыялах Скідзельскай воласці Гродзенскага павета)*, [w:] *Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік*, вып. 8, адк. рэд. У. К. Коршук , Мінск 2013, с. 3–15.

[28] Т. Шанин, *Революция как момент истины*, с. 277, 263.

[29] *Аграрное движение в России*, с. 390.

[30] Селянін з Муравы Пружанскага павета Шымон Карэтка ў кастрычніку 1906 г. у Мураве і Падалянах агітаваў сялян за байкот войска, за што атрымаў 4 месяцы вязніцы. Lietuvos mokslų akademijos centrenės bibliotekas Rankraščių skyrius (далей: LMACB RS), F–155–490, l. 44 v.

[31] *Революционное движение в Белоруссии 1905–1907. Документы и материалы*, ред. А. И. Азаров, Минск 1955, с. 562–564.

[32] НГАБ у Гродне, калекцыя 4 (Вільнюс), воп. 1, спр. 21, арк. 1-1 адв.

ёнтках, патрабуючы павелічэння заробкаў і скарачэння часу працы. Атрымаўшы распіскі аб выкананні патрабаванняў і 3-5 рублёў на гарэлку, натоўп кіраваўся далей. Абыходзілася ў асноўным без насілля. За жорсткае абыходжанне з рабочымі збілі толькі некалькі ўпраўляючых. Сяляне-ўладальнікі да батракоў не далучыліся. Пазней парабкі перайшлі ў Брэсцкі павет, дзе 25 асоб было затрымана[33].

У верасні 1906 г. у Луконіцы і Будзёўцы Слонімскага павета стражнікі вялі бой з сельскай самаабаронай (узброенай камянямі, каламі і рэвальверамі). Паліцыі ўдалося схапіць толькі дзве жанчыны і Міхася Латоша, „які з калом у руках прадаўжаў адзін біцца з атрадам паліцыі" (пазней тлумачыўся, што бараніў маці, якую параніли шашкай)[34]. У лютым 1907 г. сяляне вёскі Дубок Брэсцкага павета разам з жанчынамі і дзецьмі выйшлі, каб не даць высечы лес. Натоўп адбіў у войска 18 арыштаваных сялян[35]. У жніўні 1907 г. у Сасноўцы Пружанскага павета затрымалі селяніна Луку Цынгеля за крадзеж. Уначы яго вызвалілі сяляне з рэвальверамі, аднак праз некалькі дзён яго ізноў затрымалі[36].

Барацьба за „свядомасць" сялян праз актыўную агітацыю і практычную дзейнасць у паветах губерні праходзіла па-рознаму. Актыўнасць і маштаб сялянскага супраціву залежалі ад шматлікіх фактараў (геаграфічных[37], грамадскіх, гаспадарчых). Аднымі з найбольш актыўных па колькасці сялянскіх бунтаў у межах сучаснай Беларусі былі Брэсцкі, Ваўкавыскі, а таксама Пружанскі паветы (у якім увосень 1906 г. нават было ўведзена становішча ўзмоцненай аховы)[38], а таксама тэрыторыя Белавежскай пушчы — адмысловай адзінкі імператарскага ўладання. Менавіта там прасочваліся напружаныя адносіны сялян з адміністрацыяй пушчы: „У раёне Белавежскай пушчы сяляне парушаюць правілы аб паляванні, патравы — з іншага боку на палі сялян нападаюць зубры і кабаны, за што ніхто не плаціць — гэта іх злуе"[39].

Цікавы выпадак меў месца 28 чэрвеня 1905 г., калі ў маёнтак Лукаўка земскага начальніка 4 участка Гродзенскага павета Пчыцкага заві-

[33] *Walki chłopów Królestwa Polskiego*, t. 2. s. 511-512.

[34] НГАБ у Гродне, кал. 6, воп. 1, спр. 20, арк. 1-1 адв.

[35] НГАБ у Гродне, кал. 7, воп. 1, спр. 35, арк. 1–4.

[36] НГАБ у Гродне, кал. 7, воп. 1, спр. 14, арк. 9–10.

[37] У адным з рапартаў ад сакавіка 1905 г. чытаем: „Асабліва дрэнна з глебай у нізінных і балоцістых землях Ваўкавыскага, Кобрынскага і Брэсцкага паветаў", таму „свайго хлеба ім хапае да Раджджаства, рэдка да Вялікдня". НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 6 адв.

[38] *Революционное движение в Белоруссии*, с. 362–364.

[39] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 84.

тала асоба і сказала яго жонцы, што ён – дэлегат з Лодзі ў Гродзенскай губерні для збору сродкаў і прапаганды сярод сялян. Эмісар прасіў грошы. Стараста і соцкі адмовіліся арыштоўваць дэлегата, больш таго мясцовыя сяляне, асабліва жанчыны, прынялі яго вельмі цёпла, размаўляючы ўсю ноч. На наступны дзень ён быў затрыманы. Па словах дэлегата, у губерню высланы каля 300 рабочых ад рэвалюцыйных органаў. Каб прадухіліць магчымыя беспарадкі, быў выкліканы атрад казакоў для мабільнага перамяшчэння ў Гродзенскім павеце[40].

У снежні 1906 г. губернатар адзначаў, што ў некаторых месцах на вывешаных па загадзе губернатара закліках ад 5 лістапада 1906 г. да сельскага насельніцтва былі наклеены рэвалюцыйныя лістоўкі, якія ўнізе не закрывалі подпісы губернатара і таму спакойна віселі, уводзячы сялян у зман[41].

Не заўсёды і не паўсюль сяляне ахвотна прымалі агітацыю. 21 ліпеня 1907 г. памочнік начальніка Віленскага ГЖУ[42] у Лідскім, Ашмянскім і Троцкім паветах пісаў, што сяляне больш вялізных вёсак збіраюцца разам са сваімі адвакатамі і абмяркоўваюць „бягучыя падзеі дзяржаўнага жыцця". Аднак агітацыя левых партый поспехаў не мае, лістоўкі паляць у печах[43].

Часцяком „агітацыя" адбывалася са зброяй у руках. Рэвалюцыянеры прымушалі сялян і парабкаў кідаць працу і баставаць. Напрыклад, 11 ліпеня 1905 г. селянін Геронім Пажазінскі і мяшчанін Станіслаў Свяжбінскі з маёнтка Рогава прыйшлі ў вёску Панькі Беластоцкага павета. Сустракаючы сялян на вуліцы і заходзячы ў хаты пагражалі рэвальверамі і палохалі, што 400 рэвалюцыянераў ужо вырушылі ў маёнтак Сліўна графа Красінскага. У выпадку адмовы пагражалі, што спаляць вёску. Гэтак змагары прымусілі сялян пайсці з імі ў маёнтак. Да іх далучыліся 16 сялян і пайшлі да ляснічага маёнтка Казіміра Сваражынскага. Яму сказалі, што сяляне пакрыўдзіліся ў „камітэт"[44] на яго і што земскі начальнік больш не будзе разглядаць скаргі ад ляснічага па справах самавольных высечак і патраў. Па дарозе ў вёсцы Крушэва да іх „далучыліся" чарговыя 40 сялян. Падыходзячы да маёнтка натоўп сустрэўся з рабочымі, апрацоўваючымі палі пад наглядам кіраўніка маёнтка Рышарда Шчэнснага. Даведаўшыся, што яны

40 НГАБ у Гродне, кал. 4, спр. 11, арк. 79-79 адв.

41 НГАБ у Гродне, ф. 397 воп. 2 д. 1, арк. 2.

42 Губернское жандармское управление — мясцовае аддзяленне жандармскага корпуса ў Расійскай імперыі.

43 Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей: LVIA), f. 419, ap. 1, b. 718, l. 21.

44 „Камітэт", „група", „партыя"– агульныя скарочаныя назвы розных рэвалюцыйных арганізацый.

атрымліваюць толькі 35 капеек дзённага заробку, рэвалюцыянеры запрапанавалі ісці разам з імі. У маёнтку быў зачытаны зварот, што рабочы дзень павінен цягнуцца ад 8 да 18 гадзіны за 50 кап. дзённа, 30 рублёў і 18 карцоў хлеба ў год. Паведаміўшы слухачоў аб тым, што хутка зямля будзе падзелена сярод сялян, загадалі не пачынаць прац да здзяйснення патрабаванняў. У выніку маёнтак быў разграблены (страты – 1400 руб.), наступныя 2 дні рабочыя не працавалі, толькі прыглядаючы за скацінай, але забіраючы малако сабе і прыступілі да працы толькі пасля павелічэння платы. У выніку па судовай справе праходзіла 70 сялян. Паводле прысуду Свяжбінскі атрымаў 3 гады, Пажазінскі і Юдзіцкі па годзе турмы, рэшта атрымала штрафы[45].

Іншая праблема датычыць крыніц. На жаль, сяляне не застаўлялі па сабе шматлікіх крыніц, на падставе якіх можна было б рэканструяваць іх рэвалюцыйную барацьбу і фарміраванне палітычнай свядомасці, таму асноўныя матэрыялы — гэта паліцыйныя і судовыя дакументы, адміністрацыйныя рапарты, дзяржаўная і рэвалюцыйная прэса, лістоўкі. Практычна адсутнічаюць успаміны вяскоўцаў. Бездапаможная тут і вусная гісторыя. Натуральна, засталіся крыніцы ў выглядзе прыгавораў і наказаў[46], судовых спраў і г.д., аднак, на нашу думку, больш цікавымі былі б матэрыялы, якія б пакінулі самі сяляне, а не настаўнікі, адвакаты, сельская інтэлігенцыя ці органы ўлады[47]. Цікавымі крыніцамі былі б дыскусіі сялян аб тых ці іншых рэвалюцыянерах, партыях і групах, у прыватнасці аб тэроры. Увогуле, ці дыскутавалі сяляне аб партыях, як партыі аб іх?

Цікавым падаецца наступны прыпадак. Напрыканцы 1905 г. сялянам Асоўніцкай воласці Кобрынскага павета Мэер Нірэнштейн — арандатар маёнтка Смашка Адэлі Вяржбіцкай — прад'явіў іск за патраву. 5 снежня 1905 г. натоўп 200 чалавек са словамі: „Забастоўка, спыніць працы, прэч з маёнтка" ўварваўся на завод і спрабаваў спыніць работы. Аднак пасля слоў вінакура Боруха Карліна аб тым, што за страты будуць плаціць самі парабкі, яны дазволілі рабочым скончыць пачатую працу, забараніўшы працаваць заўтра. Зачыншчы-

[45] НГАБ у Гродне, ф. 34, воп. 1 спр. 6

[46] О. Г. Буховец, *Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века. Новые материалы, методы, результаты*, Москва 1996; *Приговоры и наказы крестьян Центральной России 1905–1907 гг. Сборник документов*, ред. Л. Т. Сенчакова, Москва 2000; Е. В. Шевченко, *Общественно-политическое сознание российского крестьянства начала XX века (по материалам наказов и приговоров 1905–1907 гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук*, Барнаул 2012.

кі атрымалі ад 8 да 10 месяцаў турмы. Што цікава, сяляне (22-гадовы Андрэй Урублеўскі) з Кобрынскай турмы пісалі па-расійску прашэнне: „наша маёмасць прыйшла ў крайняе спусташэнне, нашы дзеці засталіся назаўжды абняслаўленыя, нашым імем будуць пакаленне палохаць дзяцей". Віну прызналі часткова, але прысуд лічылі надта суровым, таму што „шкодныя ў нашай айчыне хуліганы, якія носяць палітычную (неразборліва), зацкавалі здаровы сэнс і чыстае сэрца чыстага рускага чалавека"[48]. У сувязі з гэтым паўстае пытанне, наколькі шчыры гэты тэкст, а на колькі прагматычны. Ці адвакат параіў, ці яны самі вырашылі „пакаяцца"? Асцярожна трэба ставіцца і да дакументаў рэвалюцыянераў. На колькі можна давяраць партыйным крыніцам аб падтрымцы іх сялянамі? Напрыклад, лідар анархістаў-чорнаазнаменцаў Іуда Гросман-Рошчын успамінаў, што сяляне з навакольных вёсак пасылалі ў Беласток „хадакоў" за дапамогай анархістаў[49]. ППСавец Браніслаў Шушкевіч адзначаў, што агітацыя ў Ласосна і Адамовічах (дзе партыя мела ўласныя колы) сярод сялян каталікоў і ўніятаў была складанай. Хоць і карысталіся яны ў хаце беларускай мовай, але не хацелі прымаць лістовак і брашур па-беларуску, жадаючы польскамоўнай літаратуры, якую ахвотна прымалі. Аднак беларускія матэрыялы ахвотна прымалі на Скідзельскай і Азёрскай шашах праваслаўныя сяляне[50]. Амаль кожная група пісала пра падтрымку і ўзаемапрацу з рабочымі, сялянамі і жаўнерамі, але рэчаіснасць перш за ўсё адлюстроўваецца не ў паперах, але ва ўчынках і паводзінах сялян, маючых свой уласны розум і досвед. Можна смела пагадзіцца з Т. Шаніным, што ніводная з партый не мела дастаткова сродкаў, каб уплываць на сялян у цэлым[51].

Рэвалюцыйная мазаіка партый і груп у Гродзенскай губерні выглядала даволі разнастайнай: Бунд, БСГ, ППС, эсэры, РСДРП, СДКПіЛ, Паалей-Цыён, эсэры-максімалісты, анархісты. Найбольш папулярным сродкам агітацыі былі лістоўкі якія раздаваліся на базарах, расклейваліся па платах і стрэхах, выкідваліся ўпрост з цягнікоў. Напрыклад, у ліпені 1905 г. у калоніі Нязбодка-Міхалова была прычэплена запіска па-расейску: „Аб'ява. Усе сяляне, якія маюць у арэндзе пусцякі, не маюць права адрабляць за заплачаную зямлю, цяпер паншчы-

[47] Т. Шанин, *Революция как момент истины*, с. 200–204, 218.

[48] НГАБ у Гродне, ф. 34, воп. 1, спр. 8, арк. 136-136 адв.

[49] И. Гроссман-Рощин, *Думы о былом (из истории белостокского, анархического„чернознаменского" движения)*, „Былое", 1924, № 27-28, с. 177.

[50] B. Szuszkiewicz, *Organizacja grodzieńska PPS w latach 1898-1910,* „Niepodległość", 1937, t. XVI, s. 538–539.

[51] Т. Шанин, *Революция как момент истины*, с. 256.

ны няма. А калі што будзе, першы, хто пойдзе, той пазбавіцца свайго жыцця альбо ў таго пагуляе чырвоны пеўнік. Нязбодскія сацыялісты”. Масава слаліся пісьмы на імя сялянскіх старастаў аб тым, каб сяляне не плацілі падаткаў, а асабліва выкупных за зямлю, бо яна даўно ўжо выкуплена. Галоўны сакратар Камісіі па літоўскіх справах і загадчык 5 Справаводства Канцылярыі Віленскага генерал-губернатара ў рапарце (1907 г.) пісаў, што анархісты рассеяліся па сёлах і вёсках для прапаганды сярод войска і сялян, „сацыялізм узмацніўся”. У літоўскія губерні паступіла больш за мільён пракламацый для распаўсюду сярод сялян і салдат. Частка матэрыялаў знаходзіцца ў павятовых поштах, частка ў сельскіх старастаў і сялян[52]. Ператрусы ў вёсках паказалі, што лістоўкі былі завернутыя ў гандлёвыя рэкламы ў канвертах ад „Заводы кос” і „Склады сельских орудий”. Гэтыя рэкламы былі высланы на імёны старастаў кожнай вёскі, якім за распаўсюд сярод сялян прапанавалі грошы, а сялянам — дармовы косы. Меў месца таксама распаўсюд лістовак ад імя цара.

Часцяком у рапартах органаў улады пішуць проста пра рэвалюцыянераў. Цікавымі падаюцца больш-менш дакладныя статыстычныя даныя пра тых, хто хадзіў па вёсках[53]. Колькі вёсак наведалі сацыял-дэмакраты, эсэры ці ППСаўцы за тры гады рэвалюцыі, колькі лістовак распаўсюдзілі? Каму найбольш давяралі сяляне? Рэвалюцыянерам ці сельскім настаўнікам? Часцяком настаўнік быў уцягнуты ў рэвалюцыйную барацьбу. Да гэтага даходзіць справа непадлічаных індывідуальных актаў супраціву, якія даследчыкі звычайна памінаюць. Але індывідуальны пратэст таксама фармаваў свядомасць, даваў прыклад ці антыпрыклад сялянскага сацыяльнага дзеяння. Не толькі парубкі ці адмова працы, але такую звычайную форму незадавальнення, як знявага службовых асоб, трэба таксама разглядаць як пэўную форму супраціву[54].

Агітацыя ішла па кірунку горад — вёска. Менавіта блізкасць буйных і актыўных прамысловых цэнтраў уплывала на інтэнсіўнасць прапаганды рэвалюцыйных ідэй сярод сялян. Такія гарады і мястэчкі, як Беласток, Гродна, Крынкі адыгрывалі важную ролю сярод на-

[52] LVIA, f. 1469, ap. 1, b. 19, l. 1-1 v.

[53] Напрыклад, сярод пракламацый у 192 паселішчах Беларусі (студзень — верасень 1905 г.), 47 былі незідэнтыфікаваныя, *Гісторыя сялянства Беларусі*, с. 300.

[54] Е. А. Вересова, *Оскорбления должностных лиц как одна из форм сопротивления крестьянства власти в конце XIX начале XX в. (по материалам Тверской губернии)*, „Вестник Ленинградского государственного университета им. А. С. Пушкина”, 2015, вып. 1, т. 4, с. 82–89.

вакольных сялян. Больш таго, высылаліся агітатары з Каралеўства Польскага, прапагандысты з фабрычна-завадскіх цэнтраў масава хадзілі па вёсках і мястэчках. Губернатар 15 жніўня 1906 г. пісаў земскім начальнікам, іспраўнікам і паліцмайстрам, што ёсць звесткі аб высылцы рэвалюцыйнымі арганізацыямі маладых актывістаў у сельскія мясцовасці для прапаганды нацыяналізацыі зямлі і супраць прыватнай маёмасці, плануецца арганізаваць шэраг выступленняў, захапіць мястэчкі з малой колькасцю войска і да паловы верасня правесці ўсеагульную стачку[55].

Асобным пунктам даследаванняў павінна стаць вязніца, якая была рэвалюцыйнай школай не толькі для прафесійных змагароў, але і для рабочых і сялян. Напрыклад, у чэрвені адбываліся масавыя арышты сялян і сялянак з дзяцьмі ў Пружанскім павеце, па 30-40 чалавек штодзённа[56]. Безумоўна, зняволенне ўплывала на палітычную свядомасць сялян.

З турмой і ўвогуле з рэвалюцыйным дзеяннем у большай ці меншай ступені заўсёды звязаны і крымінал. Здараліся і выпадкі, калі сяляне без спецыяльных эканамічных ці палітычных мэт займаліся „класавай барацьбой". Так было ў выпадку з селянінам-рэцыдывістам Мікалаем Лысюком, які займаўся грабяжом у Ваўкавыскім павеце ў 1905 г., у 1900 ён ужо быў асуджаны на тры гады вязніцы за крадзеж з узломам.

Найбольш паказальнай была справа шайкі ўзброеных рабаўнікоў, дзеючых на тэрыторыі Брэсцкага, Слонімскага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў. 3 сакавіка 1907 г. з Гродзенскай турмы збеглі ажно 18 чалавек (найбольш спектакулярны пабег у гісторыі вязніцы). Пасля гэтага ў ваколіцы пачаліся грабяжы. Уначы 14 сакавіка шэсць чалавек абрабавалі на суму 180 руб. дом мяшчаніна Беняміна Барэнбаўма, які ў Кобрынскім павеце арандаваў маёнтак Зялёны; 25 сакавіка ў пасадзе Блудні Пружанскага павета восем асоб напалі на хату ўдавы святара Скабалановіча, скраўшы грашыма і каштоўнымі паперамі каля 8 тыс. руб.; 31 сакавіка сем чалавек у Слонімскім павеце ў доме памешчыцы Анелі Нілецкай, уладальніцы маёнтка Новы Двор, забралі ўсяго на суму 15 тыс. руб.; 2 красавіка абакралі дом мяшчаніна Нохіма Кагана, які арандаваў млын у маёнтку Дзеравянчыцы (рэчы на суму 500 руб.); 3 красавіка тры асобы напалі на дом памешчыка Канстанціна Астрамецкага ў маёнтку Хорашч (забралі рэчы і грошы на суму 1000 руб.), у той самы час у тым жа павеце абрабавалі дом

[55] НГАБ у Гродне, ф. 397, воп. 2, спр. 1, арк. 27.

[56] К. Шабуня, *Аграрный вопрос и крестьянское движение*, с. 379.

мяшчаніна Матуса Маркуса з маёнтка Альба (150 руб.); 15 красавіка ў сяле Чамеры Брэсцкага павета ў доме святара Ражкоўскага забралі 1700 р.; 20 красавіка ў Слонімскім павеце восем чалавек напалі на дом памешчыка Генрыка Слізеня, скраўшы шмат каштоўнага адзення, золата і серабра. Тады ж у сяле Бусяж пяць асоб завіталі да святара Аляксандра Чэстнага, „пазычыўшы" 300 р.; на Вялікдзень 22 красавіка ў Пружанскім павеце было 3 разбойныя напады на памешчыка Вітальда Свянціцкага з Кабакоў, Міхаіла Стасевіча з Баек і Казіміра Ляўковіча з Букрабоўшчыны — разам скрадзена 3000 руб. Почырк падобны: ноччу ўрываліся з рэвальверамі і стрэльбамі, „сустракаючы ўсюды поўную пакорлівасць, зламыснікі гвалту або смерці нікому не прычынялі і толькі перад зыходам сваім загадвалі пацярпелым пад пагрозай смерці не заяўляць пра іх наведванні паліцыі". У хуткім часе чальцы шайкі былі затрыманы. Частка атрымала смяротныя прысуды, частка катаргу, а Калістрат Пасюк і Дарафей Грыцук былі забіты падчас беспарадкаў у Гродзенскай турме 14 ліпеня 1908 года.

Адвечнае пытанне, што такое дабро і зло, даволі складанае і звязана з паводзінамі тых ці іншых груп і асоб. У адносінах паміж сялянамі і памешчыкамі важную ролю таксама іграў чалавечы фактар. З рапартаў земскіх начальнікаў губернатару можна даведацца, што непаразуменні большай часткай выкліканы былі „недарэчным, упартым" характарам памешчыкаў, практыкуючым самаўпраўства ў выглядзе шырокага насілля і кулачнай расправы. „Там, дзе бацькі з добрасуседскіх адносін з сялянамі дазвалялі ім дарам пасвіць скаціну ў сваіх лясах, нават не абцяжараных сервітутамі, там дзеці з цягам часу альбо скарачалі гэтыя прадастаўленыя сялянам бацькамі правы, альбо цалкам іх спынялі, дамагаючыся сваіх правоў судовым шляхам"[57]. У дадатку сталыя людзі расказваюць, як добра, свабодна было раней, але памешчыкі даводзяць справы да суда і з бедных сялян няма чым плаціць[58]. У іншым месцы чытаем, што пратаколы састаўляюцца на падставе заявы ляснічага, караюцца толькі падазроныя, „парубка і выкраданні лесу часцяком пераследуюцца на падставе дзіўнай здольнасці ляснічых пазнаваць казённы лес у распіленых і нават укладзеных у будынкі дошак і бэлек". Асабліва сяляне незадаволеныя новым ляснічым Беластоцкага лясніцтва[59].

Большасць прадстаўнікоў дваранства і земскіх начальнікаў, разумеючы становішча сялян, канстатавалі ў сакавіку 1905 г., што трэ-

[57] *Walki chłopów Królestwa Polskiego*, t. 1, s. 18.
[58] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 7.
[59] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 64-64 адв.

ба адукаваць сялян, будаваць школы, ліквідаваць цераспалосіцу, прыняць закон аб разгортванні сервітутаў, знізіць цэны сялянам на зямлю, пашырыць дзейнасць Сялянскага банка, важна таксама „правільная пастаноўка на шырокіх пачатках перасяленчай справы, праўдзенне меліярацыі ў балоцістых мясцовасцях.

Розныя палітычныя плыні ставілі сабе розныя мэты, мелі розныя ідэйныя ўстаноўкі, таму тактыка і формы ўплыву на сялян былі розныя, адсюль і чаканні сялянскай барацьбы прадстаўляліся ў розных вымярэннях. Некаторыя звярталі ўвагу на ўзрост нацыянальнай свядомасці, іншыя на актыўнасць і радыкалізм, былі і такія, для якіх спосабы арганізацыі сялянства і дасягненні часовых мэт былі прыярытэтам. Калі ў гарадах і мястэчках пракламацыі пісаліся па-расійску, польску і ідыш, то ў сельскай мясцовасці трэба было ўлічваць беларускі элемент. Паводле даных першага ў Расійскай імперыі ўсеагульнага перапісу 1897 года беларусы ў Гродзенскай губерні складалі 705 045 чалавек (43,97%), большасць з іх жыла ў вёсках. На гэта стараліся рэагаваць некаторыя партыі, распаўсюджваючы звароты па-беларуску.

Вялікую ўвагу сялянам прысвячала Польская сацыялістычная партыя, з якой вылучылася эфемерная Сацыялістычная партыя Белай Русі, і Беларуская сацыялістычная грамада. У лістападзе 1906 г. Гродзенская акруговая арганізацыя РСДРП даслала мясцовым групам пісьмо аб утварэнні агульнагубернскага саюза для працы на вёсцы і падрыхтоўцы да выбараў у Дзярждуму. Першым пытаннем дасланай анкеты было: „Якая ступень культурнасці, свядомасці і рэвалюцыйнасці сялян тых паветаў, якія ўваходзяць у раён іх дзейнасці”[60]. Маладыя эсэры пачалі ствараць рэвалюцыйныя лятучыя атрады яшчэ ў 1904 г., якія, перамяшчаючыся па Паўночна-Заходнім краі, падштурхоўвалі сялян да адкрытага насілля супраць царскай улады і землеўласнікаў.

Іншы аспект датычыць таго, як „беларускасць” бачылі рэвалюцыйныя партыі і ці ў адчуванні змагароў з самаўладдзем беларускія сяляне мелі рэвалюцыйны патэнцыял? Вядома, што ўлады ставіліся да беларусаў як да цёмнага, вясковага насельніцтва. Так адзін з дзяржаўных публіцыстаў у сваім артыкуле крытыкаваў беларускую вёску за забабоны і цемнату, пішучы: „Толькі школа і школа адна сваім дабратворным уздзеяннем у самых шырокіх памерах у стане вызваліць нашу беларускую вёску ад тых адмоўных бакоў жыцця, якія служаць

[60] *Революция 1905–1907 гг. в России*, с. 448–450.

прычынай адсталасці вёскі ў галіне развіцця культурнай грамадзянскасці на рускіх пачатках"[61]. У судовых справах можна сустрэцца з падобнымі поглядамі. У снежні 1905 г. у маёнтку Моладава Генрыка Скірмунта (Кобрынскі павет) сяляне, якія патрабавалі вярнуць ім каля 50 дзесяцін ворнай зямлі ў фальварку Залугі, мяжуючай з іх землямі. Па іх словах, зямля некалі прыналежала ім, а цяпер яны павінны адпрацоўваць за карыстанне ёй. Акрамя таго сяляне дамагаліся павысіць плату да 50 кап. за зімовы дзень і да 1 рубля за летні, прымаць на працу ў эканомію выключна мясцовых жыхароў. Пасля адмовы на вінакурным заводзе са словамі «Забастоўка, спыніць працы» яны разагналі рабочых, а некаторых пабілі, прапануючы прыезджым рабочым з'ехаць з маёнтка, бо тут і сваіх сялян хапае. Некалькі дзён запар забастоўшчыкі прыходзілі ў маёнтак, збіваючы працуючых сялян, а нават забараняючы кухару гатаваць ежу („Мы галадаем, хай і яны галадаюць"). Сітуацыю вырашыў ісправнік з салдатамі. 13 снежня сабралі ўсіх сялян, але тыя не прызналіся, кажучы, што той, хто да новага года не будзе „дахадзіць свайго", усё страціць. У выніку, прыняўшы „крайняе невуцтва падсудных", суд змякчыў прысуд і даў 8 месяцаў турмы кожнаму з наступным наглядам на 2 гады і абмежаваннем права жыхарства[62].

Адзін з чальцоў Гродзенскага губернскага праўлення дакладваў у студзені 1906 г. у МУС наконт гарадзенскіх сялян, якія „мала цікавяцца сучаснымі пытаннямі і падзеямі, хвалюючымі ўсю Расію, думаюць толькі пра хлеб штодзённы". Асобнага сялянскага руху ў Гродзенскай губерні не паўстала па прычынах „пазбаўленага ініцыятывы і рашучасці характару беларусаў"[63]. Падобную думку агучыў валасны старшыня Гродзенскага павета ў сакавіку 1905 г.: „селянін-беларус не спасобны да адкрытага масавага грабяжу і сам па сабе ніколі на гэта не рашыцца"[64].

Цікавыя назірання наконт беларусаў можна знайсці ў дакладзе ўпаўнаважанага ЦК эсэраў падчас з'езду сельскіх работнікаў Паўночна-Заходняй вобласці: „Цэнтрам цяжару партыйнай работы ў Паўночна-Заходнім краі павінна з'яўляцца вёска, аднак існуе шмат цяжкасцей: нацыянальная варожасць, сяляне пад уплывам ксяндзоў, якія нават зніжаюцца да пропаведзяў на „халопскай" мове. Для беларусаў

[61] С. Я-к, *Белорусс в своём сельском самоуправлении*, „Гродненские Губернские Ведомости", 1905, № 25, с. 10–13.
[62] НГАБ у Гродне, ф. 34, воп. 1, спр. 7.
[63] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446 арк. 8.
[64] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1. спр. 446, арк. 23.

у выніку панскага прыгнёту характэрна „адносная забітасць” і „месцамі малая культурнасць насельніцтва”. Акрамя таго „дзякуючы вечным недародам, хранічнаму недаяданню беларусы ў агульнай сваёй масе малаэнергічныя, вялыя, худасочныя”[65].

У рапарце эсэра з сяла Курашава Бельскага павета *Земельный вопрос в Белоруссии* (1908 г.) аўтар піша аб тым, што пад уплывам „шляхты” беларусам накідаецца „індывідуальна-падворны спасаб уладання зямлёй”. Цытуючы Я. Купалу *Ах, ці доўга* (1905–1907) аўтар пераконваў, што ў беларусаў натуральны стасунак да зямлі як да „агульнага здабытку”, „выражаны ў цэлым шэрагу мясцовых звычаяў і звычак да грамадскай справядлівасці”. „Селянін-беларус прыкаваны да зямлі і прынік да яе, як грудное дзіця да маці”. Заканчвае аўтар тым, што беларусы верацЬ у праўду, але на іх наложана „пячаць нясмелай нерашучасці”[66].

Аднак „нерашучыя” сяляне часцяком дзейнічалі даволі рашуча. Уначы 14 чэрвеня 1906 г. у маёнтку Вайцехавізна Мала-Берастaвіцкай воласці Гродзенскага павета былі спалены 2 хлявы і інвентар памешчыка Дзімтрыя Карыбута-Дашкевіча на суму 6 тыс. рублёў. Што цікава, 2 тыдні загадзя ў парку маёнтка знойдзена ананімнае пісьмо „непісьменна складзена на простай беларускай гаворцы”, у якім прапанавалася, каб памешчык плаціў сялянам па 1 рублі дзённага заробку, абяцаючы спаліць усе сельскагаспадарчыя машыны[67].

Вясной 1905 г. у Верцялішскай, Гожскай, Жыдомлінскай, Азёрскай і Скідзельскай валасцях найбольш папулярнай у распаўсюдзе была лістоўка „Царская гаспадарка”, аднак яна не магла асабліва ўплываць на мясцовае насельніцтва, таму што была напісана на „незразумелай і цяжкачытаемай мове”, агульна – сяляне разважлівыя і асцярожныя[68].

Барацьба за душу і свядомасць сялян ішла з абодвух бакоў. Улада таксама агітавала і змагалася словам. Выконваючы абавязкі гродзенскага губернатара Аляксей Азнабішын хадайнічаў перад віленскім генерал-губернатарам Канстанцінам Кршывіцкім аб асігнаванні грашовых сродкаў сумай 5 тыс. рублёў на барацьбу з рэвалюцыйнай прапагандай. Як тлумачыў, на выпіску і друк зваротаў да сялян бралі ў доўг са сродкаў тыпаграфіі і канцылярыі Губернскага прысутніцтва

[65] *Северо-Западная область. О крестьянской работе в Сев.-Зап. Обл.*, Internationaal Instituut voor Sociale Geschiedenis (IISG), Partija Socialistov-Revoljucionerov (Rossija) Archives, ARCH01038, f. 396.

[66] Там жа.

[67] НГАБ у Гродне, кал. 4, воп. 1, спр. 12.

[68] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 40 адв.

(150 руб. на „Призыв к сельским людям”, 20 тыс. асобнікаў; „О земле” — 225 р., „О Государсвтенной Думе”, зварот „Как и каких людей избирать в государственную думу” і іншых зваротаў губернатара; 19,50 руб. пайшло на брашуру *Чего хотят люди, которые ходят с красными флагами*)[69].

Асобна трэба разглядаць габрэйскіх рэвалюцыянераў з партыі Бунд і ўвогуле габрэйскае пытанне. Як вядома, полем дзейнасці бундаўцаў былі горад і мястэчка, але габрэі былі чальцамі не толькі Бунду. Абсалютная большасць анархістаў была габрэямі і ППС, і эсэры мелі ў партыйным складзе нехрысціянскі кантынгент. Напрыклад, 20-гадовы меламед з Кобрына Шая Львовіч атрымаў 8 месяцаў турмы за распаўсюд сярод сялян брашур РСДРП[70]. Пра Віленскую, Гродзенскую і часткова Дзвінскую губерні эсэры пісалі: „Пасрэднікам паміж цэнтральнымі партыйнымі арганізацыямі і сялянскімі масамі з'яўляюцца гзв. „местачковыя групы”, заводзячыя сувязі, распаўсюджваючы літаратуру. Такім чынам, як гэта не дзіўна, што першапачатковым правадніком эсэраўскіх ідэй у вёску з'яўляюцца габрэі, у велізарнай масе сваёй дрэнна размаўляючыя па-руску”. Калі ёсць прафесійныя сялянскія работнікі – „хадакі”, тады праца ўваходзіць у наступны этап”[71].

1 снежня 1905 г. губернатар пісаў да земскіх начальнікаў, што ў асяроддзі пакрыўджаных ад антыгабрэйскіх пагромаў, пераважна ад скрыўшыхся за мяжой, ідзе агітацыя, каб паслаць па вёсках эмісараў, пераапранутых урадавымі чыноўнікамі, якія б чыталі народу падроблены Царскі Указ аб тым, што трэба рабаваць памешчыкаў і захапляць іх землі[72].

Адной з прычын хваляванняў сялян былі чуткі пра мабілізацыю ў войска, якія, па меркаванні земскіх начальнікаў, пакіруюцца ў бок габрэяў. Прычына наступная: габрэі выкупляюцца ад войска і займаюцца спекуляцыямі ў лясной гаспадарцы, таму „уплыў габрэяў ва антыўрадавым кірунку нікчэмны і ніякімі ўскладненнямі ў сэнсе анархісцкага руху не пагражае”[73]. Падтакваў гэтаму земскі начальнік 2 і 3 участкаў Ваўкавыскага павета 3 снежня 1905 г., адзначаючы, што ва ўсіх стасунках паміж казной і сялянамі стаяць габрэі і кулакі, ад

[69] *Революция 1905–1907 гг. в России*, с. 427–428.

[70] LMAB RS F–155–490, l. 43 v.

[71] *Северо-Западная область. Об особенности работы в Северо-Западном Крае*, „Партийные Известия”, 1907, № 8, с. 2.

[72] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 2852, арк. 141.

[73] НГАБ у Гродне, ф. 397, воп. 2, спр. 1, арк. 9 адв.

якіх цалкам залежаць сяляне. І дадаваў: „Развітасць сялян пакутуе ад недахопу школ і неахвотнага яшчэ навучання. Ад слабой рэлігійнасці і абсалютнай расхістанасці сямейных повязей. Габрэйства спутвае ўсяляк сялян"[74]. У сваю чаргу яго калега з 2 участка Кобрынскага павета ўдакладняў, што габрэі з'яўляюцца пасрэднікамі паміж памешчыкамі і сялянамі, прывозяць навіны з іншых месцаў, у кожнай вёсцы „габрэйская карчма з'яўляецца «клубам» вясковых палітыкаў і мостам узнікнення палітычных легендаў"[75].

Як улада, так і самі сяляне ставіліся да чутак няпраўдзівай інфармацыі, якой актыўна карысталіся агітатары, даволі паважна. Сярод асноўных тэм можна выдзеліць чуткі пра рыхтуючыеся парубку лясоў і захоп фальваркаў, адданне зямлі сялянам; з Беластока і Крынак распаўсюджваюцца весткі пра тое, што будуць паліць тыя вёскі, якія ўнясуць дзяржаўныя і мірскія зборы, абяцанні збройнай падтрымкі ў выпадку канфрантацый войскам. Гродзенскі генерал-губернатар Міхаіл Асаргін у лютым 1905 г. звяртаўся да земскіх начальнікаў, каб яны не толькі сачылі за нераспаўсюдам хлуслівых указаў і „шкодных для грамадскага спакою чутак", але і прыслухоўваліся да меркавання сялян, прабуючы ўплываць сваім аўтарытэтам мірна. Падчас непаразуменняў вырашаць такія справы „па-за чаргой" і, увогуле, рабіць усё, каб прымірыць бакі[76]. Адзін з чальцоў Гродзенскага губернскага праўлення рапартаваў у сакавіку 1906 г. у МУС, што ў прылеглых да пралетарскіх мясцін настрой трывожны з-за чутак на базарах і па вёсках, што на Вялікдзень пачнецца рабочы рух і перанясецца на гарады; хто не падтрымае яго, сустрэнецца з гвалтам. І дадаваў, што сярод сялян актыўна распаўсюджваюцца лістоўкі на рускай і польскай мовах, а таксама напісаныя алоўкам запіскі на імя старастаў, у якіх, пагражаючы расправай, заахвочвалі сялян не плаціць казённых і мірскіх павіннасцей, а тым больш выкупных плацяжоў, бо ўся зямля ўжо выкупленая[77].

У лістападзе 1905 г. сяляне вёсак Аполь і Лядовічы Кобрынскага павета вырашылі адабраць угоддзі ў дваранiна Іосіфа Еленскага з маёнтка Аполь, якія несправядлівы суд яшчэ ў 1873 г. замацаваў за памешчыкам. Сяляне матывавалі свае імкненні тым, што „ад Гасудара выйшла папера, прадстаўляючая сялянам тую зямлю, якую яны паспеюць захапіць да 1 студзеня". 220 дзесяцін зямлі не задаволілі

[74] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 78 адв–79.
[75] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 143.
[76] *Walki chłopów Królestwa Polskiego*, t. 1, s. 3–4.
[77] НГАБ у Гродне, ф. 18, воп. 1, спр. 446, арк. 5 адв.

сялян, якія патрабавалі дадатковых зямель і выплаты шкодаў (1 млн. 200 тыс. руб.), якія яны панеслі ад няправільнага ўладання памешчыкам зямлёй, пагражаючы спаліць маёнтак. 17 снежня некалькі соцень чалавек прыйшло ў маёнтак, адбыліся сутыкненні з войскам. У выніку 7 забітых, 8 параненых, зачыншчыкі атрымалі ад 4 месяцаў да года турмы[78].

Негатыўнае стаўленне М. Арэхвы да А. Луцкевіча пацвярджаецца і выяўленымі аўтарам у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дакументамі, якія ніжэй прадстаўляюцца навуковай грамадскасці. Так, М. Арэхва у сваіх прыведзеных выказваннях адмаўляў нават прыналежнасць братоў Луцкевічаў да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху: „нельзя согласиться с тем, чтобы считать Антона Луцкевича (а также и его брата Ивана) деятелями белорусского национально-освободительного движения"[17].

[13] А. А. Савіч, *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921-1939 гады): гістарыяграфія праблемы: манаграфія*, Брэст 2012, с. 46-48.

[14] *К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии*, „Коммунист Белоруссии", 1957, № 8, с. 25-36.

[15] *Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921-1939 гг.)*, Минск 1966, с. 147, 197, 223; А. Н. Мацко, *Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918-1939 гг.)*, Минск 1972, с. 170-171.

[16] Г. Б. Воткович, *КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929-1933 гг.)*, Минск 1975, с. 14; В. Ф. Ладысев, *В борьбе за демократические права и свободы: Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии. 1926-1938 гг.*, Минск 1988, с. 5, 162.

[17] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 112.

Відавочна, што такое стаўленне паўплывала на агульную канцэптуальную схему артыкула пра А. Луцкевіча ў БелСЭ, паводле якой ён „змагаўся з КПЗБ, рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым рухам у Заходняй Беларусі, вёў антысавецкую прапаганду”[18]. Такія аднабакова антыгістарычныя, крайне суб’ектыўныя фармулёўкі і заідэалагізаваныя высновы скажалі не толькі значэнне і ролю А. Луцкевіча ў гісторыі Заходняй Беларусі, але ў чарговы раз прымітывізавалі яе з відавочнай тэндэнцыйнасцю і схематызмам. Пры гэтым трэба адзначыць, адмоўная пазіцыя М. Арэхвы ў дачыненні да А. Луцкевіча як правадыра беларускага нацыяналізму тлумачыцца яго адназначнай прыхільнасцю ідэйна-палітычным канонам кампартыі і яго афіцыйнай пазіцыяй самаадданага камуніста, які асабіста пацярпеў ад сталінскіх рэпрэсій (была расстраляна яго жонка А. Ваявудская).

У пачатку 1970-х гадоў статус ветэрана КПЗБ і навуковы аўтарытэт А. Бергман, шырока вядомай на той час польскай даследчыцы і папулярызатаркі беларускага руху і яе правадыроў, забяспечыў ёй вялікую ролю ў сістэме міжасабовых камунікацый у асяродку тых, хто ў навуковым і асабістым плане быў зацікаўлены заходнебеларускай тэматыкай. Менавіта да яе 18 чэрвеня 1972 г. звярнуўся М. Пецюкевіч ад імя „віленскіх беларусаў” з просьбай паўплываць на працэс падрыхтоўкі артыкула пра А. Луцкевіча ў БелСЭ. Аўтар ліста паведаміў А. Бергман пра ўжо падрыхтаваны варыянт артыкула пра А. Луцкевіча „вельмі крыўднага для яго асобы” і „скандалічна” неаб’ектыўнага[19].

Неабходна, з аднаго боку, аддаць належнае валоданню М. Пецюкевічам бягучай гістарыяграфічнай сітуацыяй, ён справядліва абумоўліваў адмоўную танальнасць артыкула тым, што „нейкі аўтар ...не ведае добра ўсёй яго (А. Луцкевіча. — *А. С.*) дзейнасьці на арэне бел[арускага] вызваленчага руху”. Сапраўды, на той час беларуская савецкая гістарыяграфія, якая была абумоўлена марксісцка-ленінскімі прыярытэтамі з ідэяй пралетарскага інтэрнацыяналізму, не магла дапусціць у сваім складзе спецыяліста, прыхільнага да ідэй „беларускага нацыянал-дэмакратызму”, які, у прыватнасці, атрымаў бы магчымасць падрыхтоўкі аб’ектыўнага станоўчага артыкула пра аднаго з правадыроў „беларускага нацыяналізму”. З другога боку, ад ліста М. Пецюкевіча вее шчырая наіўнасць, аўтар, па-чалавечаму ўзрушаны значнасцю асобы А. Луцкевіча, разлічваў на справядлівае, тоеснае з яго меркаваннем, стаўленне партыйна-дзяржаўных ідэалагічных структур БССР да асобы галоўнага дзеяча беларускага руху міжваеннай Польшчы[20].

[18] Там жа, арк. 110.
[19] М. Пецюкевіч, *Лісты (1956-1982) Listy*, Беласток 2005, с. 69.
[20] Там жа.

Таму М. Пецюкевіч здзіўляўся, што аўтар артыкула „дапасаваў да яго асобы старыя, передваенныя крытэрыі ацэнкі заходнебеларускага вызваленчага руху". Звяртаючыся да А. Бергман, М. Пецюкевіч справядліва спадзяваўся на тое, што яна, „аперуючы фактычным архіўным матэрыялам", з'яўляецца найбольш аўтарытэтным і бесстаронным суддзёй асобы Антона Луцкевіча і магла б унесці ў артыкул аб'ектыўныя заўвагі і карэктуру. М. Пецюкевіч паведаміў і крыніцу атрымання адпаведнай інфармацыі, звяртаючы ўвагу на высокую ступень яе кампетэнтнасці ў дачыненні да пазначанай тэмы: „Пісала да мяне пра гэту справу ведамая Вам Людвіка Антонаўна Войцік[21], жыхарка Вільні. Яна кажа, што „пра Івана Луцкевіча напісаны артыкул даволі аб'ектыўна, але пра Антона — скандалічна. Такое неправідловае прадстаўленне дзейнасьці Антона, шкоднае адначасова для гісторыі бел[арускага] вызваленчага руху ў Заход[няй] Беларусі". І сугеруе мне звярнуцца да Вас, каб Вы прычыніліся да скарэгаваньня гэтага артыкула. Добра было-б, калі-б Вы знайшлі магчымасьць заглянуць у гэту справу, ясна не паклікаючыся ані на Л. А. Войцік, ані на мяне"[22].

Але ў гэтай гісторыі найбольшай увагі заслугоўвае асоба Юрыя Луцкевіча — сына Антона Луцкевіча. Яшчэ 8 чэрвеня 1972 г., за дзесяць дзён да таго, як М. Пецюкевіч напісаў вышэйцытаваны ліст да А. Бергман, Ю. Луцкевіч звярнуўся да галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Петруся Броўкі. Відавочна, такі рашучы крок Ю. Луцкевіч зрабіў пасля актыўнага абмеркавання абставін справы з А. Бергман, з якой ён, як вынікае з дакументаў, меў трывалы кантакт, і „віленскімі беларусамі", у першую чаргу з Л. Войцік. Забяспечаны трывалымі доказамі і аргументамі, ліст Ю. Луцкевіча да Петруся Броўкі стаў відавочнай падставай для грунтоўнай канцэптуальнай перапрацоўкі артыкулаў пра Антона і Івана Луцкевічаў. Асабліва ўражвае асабістая пазіцыя Ю. Луцкевіча, як паказвае знаёмства з тэкстам ліста, таленавітага гісторыка і публіцыста, але найперш удзячнага сына свайго бацькі, і яго імкненне дабіцца гістарычнай і палітычнай рэабілітацыі бацькі і дзядзькі, што непазбежна садзейнічала павышэнню ўзроўню аб'ектыўнасці БелСЭ у дачыненні да прэзентацыі гісторыі Заходняй Беларусі. Неабходна канстатаваць сам факт таго, што навуковая кампетэнтнасць і логіка, асабістая зацікаўленасць

[21] Жонка Антона Войціка (1898-1948), актыўнага дзеяча беларускага руху ў 1921-1930-я гады, аўтарка разам з Лявонам Луцкевічам, сынам Антона Луцкевіча, біяграфічных нарысаў пра Аляксандра Каўша, Адама Станкевіча, Аляксандра Уласава.

[22] М. Пецюкевіч, *Лісты (1956-1982) Listy*, Беласток 2005, с. 69.

і грамадская актыўная пазіцыя Ю. Луцкевіча прымусіла тагачасную сістэму марксісцка-ленінскай гістарычнай навукі БССР становўча адрэагаваць на яго высокапрафесійнае заключэнне адносна нізкага навука-факталагічнага ўзроўню першапачатковага варыянта артыкула пра А. Луцкевіча. Відавочна, што адным з вырашальных аргументаў Ю. Луцкевіча была перасцярога ў адрас галоўнага рэдактара БелСЭ Петруся Броўкі, „каб БелСЭ, якая з'яўляецца савецкім выданнем, дзякуючы перакручванню фактаў і блытаніне.., дапушчаных у гэтых артыкулах, „ліла ваду на млын" якраз нацыяналістычных і антысавецкіх групаў за мяжой"[23]. Безумоўна, вялікую ўвагу і перспектывы для паглыбленага германеўтычнага асэнсавання маюць іншыя тэзісы-аргументы Ю. Луцкевіча, як, напрыклад знішчальны выраз пра Брэсцкі мір, „паводле якога якраз Савецкая ўлада адмаўлялася ад тэрыторыі Беларусі", „а беларускія землі ўвайшлі ў склад Польшчы дзякуючы Рыжскаму трактату, да якога ні Луцкевіч, ні Рада БНР адносін не мелі". Асобна ў гэтым радку стаяць справядлівыя разважанні аб „рашэнні XXII з'езда КПСС, у якім не менш востра кляймілі незлічоныя злачынствы, якія зрабіў Сталін і яго падручныя ў 1937 годзе" які, па логіцы рэдактараў БелСЭ, трэба лічыць „антысавецкай прапагандай".

Зараз пакуль невядома, хто быў аўтарам першапачатковых варыянтаў артыкулаў, магчыма ім быў і сам М. Арэхва. Зусім верагодна, што М. Арэхва да гэтага толькі санкцыянаваў артыкулы, падмацаваўшы іх сваёй пакуль нявыяўленай рэцэнзіяй. Як бы там ні было, пасля знаёмства з аргументамі Ю. Луцкевіча, М. Арэхва быў вымушаны пагадзіцца з неабходнасцю істотнага рэдагавання артыкула пра Антона Луцкевіча, што і было зроблена. Асобна выдзелім роспач М. Арэхвы, ён вымушаны быў шчыра прызнацца: „Если «грунтоўна пераглядзець» обе статьи, как этого требует Юрий, тоесть затушевать националистическое содержание в деятельности обоих Луцевичей (ручкай устаўлена «к». — *А. С.*), то тем самым нужно будет перечеркнуть всю политику и тактику КПЗБ в белорусском национально-освободительном движении в буржуазной Польше"[24]. Сказанае М. Арэхвам вельмі дакладна і ёміста раскрывае сапраўднае месца і ролю асабіста А. Луцкевіча, уздымаючы яго статус як ключавой фігуры заходнебеларускай гісторыі, а таксама рэвалюцыйнага руху і КПЗБ як партыі, якая ў лепшым выпадку дапасоўвалася да дасягненняў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, выкарыстоўваючы яго поспехі і арганізацыйныя структуры, але ў выніку садзейнічала яго дэскрыдэта-

[23] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 109.
[24] Там жа, арк. 112.

цыі і заняпаду як легальнага спосабу вырашэння задач грамадска-палітычнага і сацыякультурнага характару.

У выніку, артыкул пра Антона Луцкевіча быў «грунтоўна перагледзены» і стаў відавочна больш аб'ектыўным. Што тычыцца артыкула пра Івана Луцкевіча, то, нягледзячы на аб'ектыўную высокапрафесійную яго крытыку з боку Юрыя Луцкевіча, ён выйшаў без змен, у першапачатковым варыянце.

Ніжэй зацікаўленаму чытачу прадстаўлены выяўленыя ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь архіўныя матэрыялы, якія з'яўляюцца красамоўнай ілюстрацыяй гісторыі апублікавання біяграфічных артыкулаў пра братоў Луцкевічаў у БелСЭ. Дакументы падаюцца без істотных выпраўленняў мовы, стылістыкі і граматыкі машынапісных дакументаў.

Дакумент 1.
Ліст галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Петруся Броўкі да Мікалая Арэхвы[25].

Акадэмія навук БССР
БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ
ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ
г. Мінск, Акадэмічная, 15а. Тэлефон 39-47-67
№ 70-3/362 26

чэрвеня 1972 г.

См. (смотри) мой ответ 3/VII 1972 г.[26]

Паважаны Мікалай Сямёнавіч!

Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі просіць Вас азнаёміцца з пісьмом ЛУЦКЕВІЧА Ю.А., а таксама з артыкуламі „Луцкевіч Антон Іванавіч" і „Луцкевіч Іван Іванавіч". Свае заўвагі і прапановы просім паведаміць не пазней 3 ліпеня 1972 г.

З павагай
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР БелСЭ (подпіс) /П. Броўка/.

[25] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 102.
[26] Рэмарка М. Арэхвы.

Дакумент 2.
Ліст Юрыя Луцкевіча да рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі Петруся Броўкі[27].

Вільня 8.VI.1972 г.

Паважаны Пётр Усцінавіч!

Хаця я і не маю гонару быць з Вамі знаёмы, аднак пішу гэты ліст, бо лічу, што Вы безумоўна зацікаўлены ў тым, каб у выданні БелСЭ, якое Вы рэдагуеце, было як найменш недарэчнасцей.

Хачу закрануць справу двух артыкулаў, змешчаных у макеце 6-га тому — рэдакцыя гісторыі БССР — менавіта артыкулаў пра братоў Луцкевічаў — Антона і Івана. Нажаль гэтыя артыкулы маюць столькі хібаў, што міма іх прайсці проста немагчыма.

Дазвольце мне пералічыць сцверджанні гэтых артыкулаў, якія разыходзяцца з праўдай, і звярнуць увагу на факты, якія чамусці прапушчаны, хаця значэнне іх дастаткова вялікае.

1. У артыкуле пра Антона Луцкевіча (майго бацьку, светапогляд і дзейнасць якога мне даволі вядомы) сказана, што ён „адзін з ідэолагаў беларускага нацыяналізму”. Гэта хлусня, якая зрэшты і не вяжацца з тым, што, як напісана пару радкоў ніжэй, ён быў адным з стваральнікаў бел. сацыялістычнай[28] грамады, а пасля бел. сацыял.-дэмакратычнай партыі. Ён ніколі не належаў да ніякай палітычнай арганізацыі з нацыяналістычнай праграмай, ніколі ў сваіх друкаваных творах, ні ў публічных выступленнях не прапагандаваў нацыяналістычную ідэалогію. Усё жыццё ён змагаўся за сацыяльнае вызваленне бел. народу і за развіццё яго нацыянальнай культуры. Ён актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыі 1905 г. у Мінску як сацыяліст, а яго брат Іван арганізоўваў забастоўкі, мітынгі, выступаў у іх. БСГ ніколі нічога супольнага не мела з нацыяналізмам, яе членамі былі як беларусы, так яўрэі і жыхары Беларусі іншых нацыянальнасцей.

Сам А. Луцкевіч лічыў сябе марксістам, аб чым афіцыяльна заявіў на працэсе БСРГ у Вільні. (Калі ў Вас няма пад рукой матар’ялаў аб працэсе Грамады, дык можаце атрымаць іх ад А. Бергман, якая жыве ў Варшаве — Aleje Ujazdowskie 16 m. 13. Яна нядаўна напісала артыкул пра А. Луцкевіча для польскага біяграфічнага слоўніка і магла бы даць Вам нямала фактычнага матар’ялу). Не магу таксама не сказаць, што сынам сваім, г.зн. мне і майму брату Лявону (Вільня, вул. Архітэкту 132-69) ён стараўся прывіць сацялістычны светапогляд і ў меру магчымасцей такжа вучням Віленскай бел. гімназіі, дзе ён выкладаў літаратуру.

[27] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 103-109.
[28] Тут і далей падкрэслена ад рукі ў тэксце.

2. Незразумела чаму Бел. віленская рада, створаная пасля Лютаўскай рэвалюцыі, названа ў артыкуле „контррэвалюцыйнай". Дзе і калі гэтая рада выступала „contra" гэтай рэвалюцыі, або імкнулася разагнаць у Петраградзе Часовы ўрад і паклікаць назад цара? Навошта ж гэтыя „ярлыкі"?

3. Няясна, якую барацьбу вёў урад БНР з Сав. уладай, калі само ўзнікненне БНР як самастойнага несфедэраванага з РСФСР дзяржаўнага арганізму было выклікана Брэсцкім дагаворам, паводле якога якраз Савецкая ўлада адмаўлялася ад тэрыторыі Беларусі. (Аб гэтым зрэшты піша сам А. Луцкевіч у сваіх успамінах — „За 25 гадоў" — Вільня 1928 г. ды можа і сёння расказаць Людвіка Войцік — Вільня, вул. Рэвоню 81-а, якая ў той час працавала ў Радзе БНР). Што Найв. Рада БНР, як пішацца ў артыкуле, падтрымлівала інтэрвентаў, гэта ізноў няпраўда. Не падтрымлівала ні маральна, ні мілітарна. Луцкевіч, вяртаючыся з Версальскай канферэнцыі, быў інтэрнаваны на нейкі час Пілсудскім у Варшаве, дзеля чаго не мог папасці на Беларусь. Ну, а беларускія землі ўвайшлі ў склад Польшчы дзякуючы Рыжскаму трактату, да якога ні Луцкевіч, ні Рада БНР адносін не мелі. А што аб факце далучэння тэр. Зах. Беларусі да Польшчы думаў Луцкевіч, ён напісаў у кнізе „Польская акупацыя на Беларусі" Вільня 1920 год.

4. У артыкуле сказана: „У 20-я і 30-я г. разам з Р. Астроўскім, Ф. Акінчыцам і інш. узначальваў Беларускую санацыю, змагаўся з КПЗБ, нац. вызв. рухам у Зах. Беларусі, вёў антысавецкую прапаганду". Гэтак пісаць нельга. Па-першае, такая арганізацыя, як Бел. санацыя, наогул не існавала. Гэта „жаргонны тэрмін". Па-другое, Луцкевіч падтрымліваў кантакты з Астроўскім перад разгромам Грамады, калі апошні яшчэ быў у КПЗБ і быў блізкім да Тарашкевіча, з якім у майго бацькі былі блізкія прыяцельскія адносіны. Аб гэтых адносінах Вам магла бы нямала расказаць б. жонка Тарашкевіча Вера Андрэеўна Ніжанкоўская (Радашковічы, вул. Б. Тарашкевіча, 18).

Пасля працэсу Грамады, калі стала вядомай роль Астроўскага як агента польскай дэфензівы, Луцкевіч, Трэпка і Самойла выклікалі Астроўскага на арбітражны суд чэсці і пасля двухгадовай (у тэксце прапушчана слова, магчыма, „дыскусіі". — *А. С.*) даказалі, што апошні — несумленны чалавек. Калі рашэнне суда было апублікавана ў віленскіх газетах, улады былі вымушаны зняць Астроўскага з пасады дырэктара Віл. Бел. гімназіі і адправіць у Лодзь, дзе яго ніхто не ведаў і дзе ён відавочна „знюхаўся" з фашысцкай „пятай калонай". Аднак яшчэ раней (здаецца ў 1931 г.) не без „дапамогі" Астроўскага мой бацька быў зволен з пасады настаўніка Віл. Бел. гімназіі.

З Акінчыцам жа Антон Луцкевіч ніколі не падтрымліваў бліжэйшых кантактаў, лічыў яго фашыстам. Ды і Акінчыц востра крыты-

каваў Луцкевіча ў друку за „просавецкія сімпатыі”. Гэтыя дадзеныя можа пацвердзіць дакументамі ўспомненая А. Бергман.

Луцкевіч ніколі не змагаўся з КПЗБ, наадварот, з многімі членамі гэтай партыі падтрымліваў кантакты (хаця пасля разгрому Грамады і адышоў ад актыўнай палітычнай дзейнасці), а з некаторымі з іх, як напр. з Тарашкевічам, быў у блізкіх прыяцельскіх адносінах. Думаю, што гэта, калі не захочуць крывіць душой, пацвердзяць Арэхва, Танк, Шырма і інш. Сказаць жа, як напісана ў артыкуле, што Луцкевіч, які фактычна быў адным з піянераў і найбольш актыўных (так) удзельнікаў бел. нацыянальна-вызвольнага руху, змагаўся з гэтым рухам, гэта або поўная ігнарацыя фактаў, або (усё можа быць на свеце) проста друкарская памылка.

Гэтак сама няпраўда, што Антон Луцкевіч вёў калі-небудзь у жыцці „антысавецкую прапаганду”. На гэтай самай аснове можна назваць „антысавецкай прапагандай” рашэнні XXII з’езду КПСС, у якім не менш востра кляймілі незлічоныя злачынствы, якія зрабіў Сталін і яго падручныя ў 1937 годзе. Якраз з такіх пазіцый вступаў супраць Сталіна і Луцкевіч.

5. Пра Івана Луцкевіча зусім няправільна сказана, што ён падтрымліваў нацыяналіст. тэорыю пра бяскласавасць і „дэмакратызм” бел. народа. Не было такой тэорыі. Была зусім не нацыяналістычная і выключна <u>класавая</u> тэорыя. І якраз такой класавай тэорыі адказвала ўся практычная дзеяльнасць абодвух Луцкевічаў і масы іншых спольшчаных ці зрусіфікаваных прадстаўнікоў дваранства, якія звярнуліся да беларускасці іменна з класавых пазіцый і не з пазіцый свайго класа, адвярнуўшагася ад народа, а з пазіцый класа сялян і рабочых, якія можа ў сілу таго, што былі прыгнечаны, захавалі свой нацянальны беларускі твар. Рэвалюцыянеры і сацыялісты Луцкевічы сталі на бок прыгнечаных класаў, вялі барацьбу за іх сацяльнае вызваленне і іх культуру намагаліся развіваць. Яшчэ ў артыкуле сказана, што Іван Луцкевіч „проціпастаўляў (бел. народ) рускаму народу. Ізноў няпраўда, бо Луцкевіч проціпастаўляў беларускіх сялян і рабочых царскім паслугачам, як „імпартаваным” з глыбіні Расіі, так і выгадаваным на радзімым грунце, а гэта зусім не тое самае, што „проціпастаўляць народ народу”. Такжа Луцкевіч не „ідэалізаваў” Вял. Кн. Літоўскае, а сцвярджаў факт існавання ў гэтым Княстве бел. дзяржаўнасці з мэтай даць народу зброю ў барацьбе з найбольш агіднай з’явай у Расіі, як называў Ленін, з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам.

Ну, а цяпер колькі слоў аб тым, чаго ў артыкуле няма, а павінна быць:

1. Няма нічога аб дзейнасці абодвух падчас рэвалюцыі 1905 г.

2. Няма нічога аб тым, што Антон Л. быў старшынёй Беларускага

Навуковага Таварыства ў Вільні, дырэктарам Бел. музея ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні, выкладчыкам Віленскай бел. гімназіі.

3. Нічога не сказана аб тым, што Антон Л. удзельнічаў і выступаў з навуковымі рэфератамі на міжнародных навуковых з'ездах (Варшава, Прага, Рыга).

4. Нічога не сказана аб ролі А.Л. у падрыхтоўцы выбараў у Польскі сейм, у выніку якой у сейм папала шмат „грамадаўцаў" на чале з Тарашкевічам. Аб гэтым мог бы Вам расказаць адзін з выбраных тады дэпутатаў Павел Каруза, які цяпер жыве ў Вільні.

5. Няма хаця бы кароткай бібліяграфіі. Пра Антона Луцкевіча напісана: Аўтар прац па літаратуразнаўстве. А чаму не па гісторыі? А можа лепш было бы даць пецітам спісак найбольш вядомых твораў, напр. Національное возрожденіе бѣлорусов (Моск. еженед. IX Москва 1909), Нашы песьняры (Вільня 1918), Аб дзяржаўным будаўніцтве (Варта № 1 Менск X, 1918), Беларускі правапіс (Вільня 1918), Палітычныя лёзунгі бел. руху (Вільня 1920), Польская акупацыя ў Беларусі (Вільня 1920), Пуцяводныя ідэі бел. літаратуры (Вільня 1921), Жыдоўскае пытаньне ў бел. літаратуры (Вільня 1921), Адбітае жыццё (Вільня 1929), За дваццаць пяць гадоў (Вільня 1928), 15 гадоў працы Бел. нав. т-ва (Гадавік БНТ, Вільня 1933), Narodowolcy-Białorusini i ich organ „Homon" (Pamiętnik VI Powsz. Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie — Lwów 1935 r.), Odrodzeniowa literatura białoruska (Sygnały № 75 Lwów 1939), Янка Купала як прарок адраджэньня (Вільня 1932), Галоўныя кірункі ў беларускай поэзіі (Вільня 1933), З ненадрукаванае спадчыны па Максіму Багдановічу (Гадавік БНТ — Вільня 1933), Беларускі музей ім. Ів. Луцкевіча (Вільня 1933), стацці ў газетах „Наша доля" і „Наша Ніва" (Вільня 1906-1912).

Спадзяюся, што гэты мой ліст дасць Вам стымул, каб грунтоўна перагледзіць абодва артыкулы і выпусціць іх у друк у больш пристойным выглядзе.

Хацеў яшчэ адзначыць, што нягожа, каб БелСЭ, якая з'яўляецца савецкім выданнем, дзякуючы перакручванню фактаў і блытаніне (адносна напр. светапогляду Луцкевічаў), дапушчаных у гэтых артыкулах „ліла ваду на млын" якраз нацыяналістычных і антысавецкіх групаў за мяжой. Бо прымаючы пад увагу факт, што абодва Луцкевічы — Іван і Антон былі бясспрэчна выдатнымі палітычнымі і культурнымі беларускімі дзеячамі — там, за мяжой аб іх гэтак сама тое-сёе публікуюць, але аб іх сацыялістычным (а яшчэ, не дай божа, марксісцкім) светапоглядзе стараюцца прамаўчаць.

Вось бадай і ўсё.

З пашанай

/Юры Луцкевіч/

Індэкс 232040 Вільня, вул. Тверачаўс д. № 8, кв. 22.
тэл. 43366

Дакумент 3.
Заўвагі М. Арэхвы на першапачатковыя варыянты артыкулаў пра А. Луцкевіча і І. Луцкевіча для Беларускай савецкай энцыклапедыі[29].

3-VII-1972 г. Замечания на статьи Луцкевич А.И. и Луцкевич И.И.

Внимательно прочел письмо Ю.А. Луцкевича в связи со статьями о А.И. Луцкевиче (его отце) и И.И. Луцкевиче (его дяде). Можно понять Юрия, как сына, желающего видеть своего отца в лучшем политическом свете, не в качестве белорусского националиста, но нельзя согласиться с тем, чтобы считать Антона Луцкевича (а также и его брата Ивана) деятелями белорусского национально-освободительного движения.

Если «грунтоўна праглядзець» обе статьи, как этого требует Юрий, то есть затушевать националистическое содержание в деятельности обоих Луцкевичей, то тем самым нужно будет перечеркнуть всю политику и тактику КПЗБ в белорусском национально-осв. движении в бурж. П-ше. КПЗБ считала Антона Луцкевича (о Иване Луцкевиче я не пишу, так как он умер в 1919 году и никакой роли в политической жизни Западной Белоруссии не играл) видным деятелем буржуазно-демократического национального движения в П. в 20-30-х годах, но боролась с его полит. взглядами, являвшимися тонко замаскированной разновидностью белорусского национализма. В середине 20-х годов он лишь временно сблизился с БКРГ, но никогда не стоял на позиции последовательной национально-освободительной борьбы белорусского народа против Польской оккупации Западной Белоруссии и господства буржуазии и помещиков.

Поэтому «грунтоўна прагледзець» обе статьи не следует. В принципе они правильные.

Однако считаю, что в статье (перапраўлена ручкай на «ю». — *А.С.*) о А.И. Луцкевиче надо внести поправки и дополнения, написать ее более эластично, обоснованно.

В самом начале статьи следует несколько ослабить определение А.И. Луцкевича, как идеолога белорусского национализма, сказав примерно так: видный деятель белорусского буржуазно-демократического национального движения в России в годы царизма и в буржу-

[29] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 112-114.

азной Польше в году окупкации ею Западной Белоруссии (1920-1939). Следует отметить, что в лагере бел[аруского] нац-зма [национализма] в Зап Бе-сии [Западной Белоруссии] он представлял его левое крыло.

Надо несколько полнее показать политическую деятельность Антона Луцкевича в условиях Западной Белоруссии (20 лет). В статье этому периоду отведена лишь одна последняя фраза, да и то не точно излагающая сущность вопроса.

Вполне можно согласиться с предложением Юрия (см. пункт 2 и 4 его письма на стр. 5-6) и отметить, что Антон Луцкевич был председателем белорусского научного общества, директором музея им. Ивана Луцкевича и преподавателем белорусской гимназии в Вильно, что в начале 20-х годов играл ведущую роль в блоке национальных меньшинств во время выборов в польский сейм и в Белорусский национальный комитет в Вильно.

Последнее предложение статьи лучше было бы сформулировать примерно так:

В начале 30-х годов, после разгрома БКРГ и «Змагання», вместе с Р. Островским создал и возглавил в белорусском национальном движении в бурж. П-ше политическую группировку под названием «Центральный союз культурных и хозяйственных организаций» («Центросоюз»), стремившийся к сотрудничеству с диктаторским режимом Пилсудского, иронически прозванного «санацией», «Центросоюз» боролся с КПЗБ, революционным и национально-освободительным движением в Зап. Белоруссии, выступал против БССР и СССР.

Упоминание фамилии Ф.И. Акинчица из предложения убрать. Этот последний, как и Р. Островский, вскоре в своих политичеких взглядах разошлись с Антоном Луцкевичем, став на фашистские позиции.

Ст. научный сотрудник Института истории партии при ЦК КПБ, бывший член Центрального руководства КПЗБ (Н.С. Орехво). (Уласнаручны подпіс).

Дакумент 4.
Тэкст першапачатковага варыянта артыкула пра Антона Луцкевіча для Беларускай Савецкай Энцыклапедыі[30].

Луцкевіч Антон Іванавіч (псеўд. Антон Навіна, Новіна, Генрык Букавецкі, Іван Мялешка, Кумальга і інш.; 30.1.1884, г. Шаўлі Ковенскай губ. — 1946), адзін з ідэолагаў беларускага нацыяналізму, публіцыст, літаратурны крытык. З сям’і чыгуначніка. Скончыў Пецярбургскі

[30] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 110.

і Дэрпцкі ун-т. Адзін з стваральнікаў і чл. ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), адзін з рэдактараў газ. „Наша доля" і „Наша ніва". У І-ю сусв. вайну выступаў за стварэнне на акупаванай кайзераўскімі войскамі на тэр. Літвы і Беларусі „Канфедэрацыі Вял. кн. Літ.". Пасля Лют. рэвалюцыі ўдзельнічаў у стварэнні контррэвалюц. Бел. віленскай рады, абвяшчэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, з ліст. 1918 узначаліў урад БНР — Народны сакратарыят, які вёў барацьбу з Сав. уладай. Пасля распаду БСГ быў ініцыятарам стварэння Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. У 1919 у час акупацыі Беларусі войскамі бурж. Польшчы ўзначаліў Найвышэйшую раду БНР, якая падтрымлівала інтэрвентаў і заключыла з імі пагадненне аб уваходжанні бел. зямель у склад Польшчы. У 20-я і 30-я г. з Р. Астроўскім, Ф.І. Акінчыцам і інш. узначальваў Беларускую санацыю, змагаўся з КПЗБ, рэвалюц. і нац.-вызв. рухам у Зах. Беларусі, вёў антысав. прапаганду.

Дакумент 5.
Тэкст артыкула пра Антона Луцкевіча, апублікаванага ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі[31].

Луцкевіч Антон Іванавіч (псеўд. Антон Навіна, Новіна, Генрык Букавецкі, Іван Мялешка, Кумальга і інш.; 30.1.1884, г. Шаўлі Ковенскай губ. — 1946), дзеяч бел. бурж.-дэмакратычнага руху, публіцыст, літаратурны крытык. З сям'і чыгуначніка. Скончыў Пецярбургскі і Дэрпцкі ун-ты. Адзін з стваральнікаў і чл. ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) — дробнабурж. нац. партыі леванародніцкага накірунку, адзін з рэдактараў газ. „Наша доля" і „Наша ніва". У І-ю сусв. вайну выступаў за стварэнне на акупаванай кайзераўскімі войскамі на тэр. Літвы і Беларусі „Канфедэрацыі Вял. кн. Літ.". Пасля Лют. рэв. ўдзельнічаў у стварэнні контррэвалюц. Бел. віленскай рады, абвяшчэнні т.зв. Бел. нар. рэспублікі, з ліст. 1918 узначаліў урад БНР, які вёў барацьбу з Сав. ўладай. Пасля распаду БСГ ініцыятар стварэння Бел. сацыял-дэмакратычнай партыі. У 1919 у час акупацыі Беларусі войскамі бурж. Польшчы ўзначальваў Найвышэйшую раду БНР, якая падтрымлівала інтэрвентаў і заключыла з імі пагадненне аб уваходжанні бел. зямель у склад Польшчы. У 20-я і 30-я г. 20 ст. старшыня навуковага т-ва, дырэктар музея імя І. Луцкевіча, выкладчык бел. гімназіі ў Вільні. Адзін з лідэраў паліт. групоўкі Цэнтр. саюз куль-

[31] *Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. У 12 т.*, т. 6: *Кішынёў — Манцэвічы*, Мінск 1972, с. 444.

турных і гасп. арг-цый (Цэнтрасаюз), якая імкнулася супрацоўнічаць з дыктатарскім рэжымам Пілсудскага, змагалася супраць КПЗБ, рэвалюц. руху, выступала супраць СССР і БССР.

Дакумент 6.
Тэкст першапачатковага варыянта артыкула пра Івана Луцкевіча для Беларускай Савецкай Энцыклапедыі[32].

Луцкевіч Іван Іванавіч (25.5.1881, г. Шаўлі Ковенскай губ. — 20.8.1919), беларускі археолаг, этнограф і грамадскі дзеяч. З сям'і чыгуначніка. Скончыў Маскойскі археал. ін-т (1904), Пецярбургскі у-т (1905). У Пецярбурзе ўдзельнічаў у стварэнні Бел. гуртка нар. асветы, рэдагаваў літаграфічнае выданне „Калядныя пісанкі", у зб. „Вязанка" выдаў літ. спадчыну Я. Лучыны. Адзін з арганізатараў Беларускай сацыялістычнай грамады, уваходзіў у рэдакцыі газ. „Наша доля" і „Наша ніва". Вёў археал. і этнагафічныя даследаванні, вывучаў стараж. гісторыю Беларусі, адкрыў і апісаў Аль-Кітаб, быў ініцыятарам стварэння Беларускага музея ў Вільні, першай беларускай гімназіі. Пытанні сац.-эканамічнай гісторыі Л. разглядаў з ідэаліст. пазіцый, падтрымліваў нацыяналіст. тэорыю пра бяскласавасць і „дэмакратызм" бел. народа, проціпастаўляў яго рус. народу, падзяляў лозунг культ.-нац. аўтаноміі для нац. меншасцей, ідэалізаваў Вял. кн. Літ.

Aleksander Sawicz — kandydat nauk historycznych, docent w Katedrze Historii Narodów Słowiańskich Brzeskiego Uniwersytetu Państwowego im. Aleksandra Puszkina.

[32] НАРБ, ф. 1440, воп. 3, спр. 1097, арк. 111.

Aneta Prymaka-Oniszk, *Bieżeństwo 1915. Zapomniani uchodźcy*, Wydawnictwo Czarne, Wołowiec 2016, ss. 365.

Historia I wojny światowej w polskiej historiografii jest przyćmiona przez tragedię II wojny światowej. Jest to wojna także zmitologizowana ze względu odzyskanie po 123 latach niepodległości państwa, dlatego obraz tego konfliktu jest dzisiaj widziany raczej politycznie niż społecznie, koncentruje się na wydarzeniach ukazywanych z perspektywy uprzywilejowanych warstw ludności niż zwykłych ludzi. Dopiero od niedawna ukazują się w Polsce prace dokumentujące doświadczenia ludności cywilnej we wskazanym okresie. Mam tutaj na myśli pracę Katarzyny Sierakowskiej oraz omawianą tutaj ciekawą książkę Anety Prymaki-Oniszk *Bieżeństwo 1915. Zapomniani uchodźcy*, która ukazała się nakładem wydawnictwa Czarne. Temat podejmowany przez Autorkę jest mocno kontrowersyjny, przez co godny uwagi czytelników.

Potrzebą do napisania tej książki było poczucie alienacji. Autorka książki przywołuje odczucia, jakich doznawała słuchając kolejnych informacji o datach i wydarzeniach z narodowej historii, które często nie pokrywają się z rodzinnymi opowieściami. Przywołuje tutaj sytuację ze szkoły podstawowej, gdy podczas typowej szkolnej wycieczki trafiła do muzeum: „Pod koniec lat osiemdziesiątych podstawówka, do której chodzę, jedzie na wycieczkę do muzeum regionalnego w Sokółce. Na wystawie widzimy zdjęcia maszerujących oddziałów, sztandary i szable, trochę strojów ludowych. Przewodnik mówi o rezydencji królowej Bony, z którą związane są początki Sokółki, o Tatarach osadzonych w okolicznych wsiach przez Jana III Sobieskiego, o powstaniu styczniowym, Legionach Polskich i odzyskaniu niepodległości w 1918 roku. O bieżeństwie i historiach, które połowa uczniów zna z domu, nie wspomina” (s. 10). Zapewne wielu miało podobne uczucie i zaczęło zdawać sobie sprawę, że historia nauczana w szkole jest zbiorem informacji, które trzeba wiedzieć, być świadomym, dlaczego uczestniczy się akurat w danym apelu, czy dlaczego akurat danego dania wypada określone święto narodowe. Z czasem Autorka zaczęła poszukiwać informacji, pogłębionej dopiero podczas studiów.

Bieżeństwo w języku rosyjskim oznacza uchodźstwo, ale dla wielu osób ze wschodniej Polski jest to nazwa własna, lecz, jak podkreśla Autorka, „to najważniejsza i najbardziej wstrząsająca historia z całego XX wieku. Nawet bardziej destrukcyjna i tragiczna niż II wojna światowa” (s. 12). Być może słowa mogą wydawać się przesadne, ale statystyki nie pozostawiają złudzeń. „Trzy i pół miliona bieżeńców; niektóre opracowania mówią nawet o pięciu milionach! Jeśli liczyć tylko ludzi opuszczających granice

współczesnej Polski — wyjechało nawet dwa miliony osób!" (s. 12-13). Dotyczy to ludności z terenów współczesnej Białostocczyzny i Chełmszczyzny, z której wyjeżdża ponad trzysta tysięcy osób, guberni łomżyńskiej — osiemdziesiąt tysięcy, suwalskiej — pięćdziesiąt tysięcy. Byli to ludzie różnej narodowości — Polacy, Litwini, Tatarzy, Żydzi, a nawet zamieszkujący tamte tereny Niemcy. Widzimy rozmiary tragedii. Temat jednak był trudny. Autorka po rozmowach z historykami wspomina, że brak opracowań wynika z faktu, że materiały były rozproszone po terytorium Rosji. Poza tym jest to historia chłopów, temat wyjątkowo trudny do zbadania. Aneta Prymaka-Oniszk znajduje informacje przypadkowo — w lokalnych publikacjach, przedwojennych opracowaniach. Trzeba wspomnieć o źródłach historycznych, z jakich korzystała autorka książki. Oprócz relacji najbliższych i potomków uchodźców korzystała również z wydawnictwa okolicznościowego *Bieżanstwa 1915 hoda*, ale również z pamiętników, które znalazły się w tomie *Pamiętniki chłopów*, redagowanej w II RP przez Ludwika Krzywickiego.

Opowieść Anety Prymaki-Oniszk jest nie tylko próbą opisania „bieżeńskiej tożsamości" (s. 106), ale również doskonale oddaje troski i niedole, z jakimi spotkali się wówczas chłopi. Była to dla nich sytuacja odmienna. Wcześniej dla nich centrum świata była wieś, czasami bardziej odważny chłop decydował się na wyprawę do miasta. Życie było uporządkowane od narodzin do śmierci. W nowej sytuacji, w której się znaleźli, wszelkie stałe przekonania uległy czasowej zmianie. „I religijność, i moralność w warunkach bieżeństwa wciąż są poddawane próbom. Coś, co było uświęcone tradycją, przestaje być oczywiste" (s. 113). Dotyczyło to chociażby tradycyjnych ról społecznych. W warunkach uchodźczych kobiety już nie odpowiadały wyłącznie za organizowanie życia w domu, a mężczyzna za pracę w polu. Mimo to kobiety lepiej radziły sobie w trudnych warunkach niż mężczyźni, co kontrastuje z ogólnym obrazem kobiet lamentujących z powodu wybuchu wojny. Kobiety, pomimo szoku, przechodziły później do zajęć, by utrzymać rodzinę przy życiu. Mężczyźni, którzy stracili żonę i pozostawali sami z dziećmi, bardzo rzadko dawali sobie radę w nowych warunkach (s. 119-120). Trzeba zauważyć inną ważną rzecz — kulturę duchową. Ludność mimo wszystko trzymała się religijnych zakazów, co powodowało, że nadal nie do pomyślenia było jedzenie potraw mięsnych w piątek (s. 112-113). Jednak w przeciwieństwie do romantycznych wizji uchodźców, ludzie nie stali się wówczas lepsi. Nie stali się też gorsi. Jak pisze Autorka, „bieżeństwo nie uczyniło z ludzi aniołów. Nie przerobiło na superbohaterów, których zwykle chcielibyśmy widzieć w uczestnikach tragicznych wydarzeń. Postawiło ich za to w niezwykle trudnym położeniu. Ekstremalnym. Żyją w ciągłym napięciu. Często w żałobie po stracie

najbliższych. W świecie, którego nie znają. Czasem stają przed wyborami, gdzie każda z opcji jest zła" (s. 114).

Zwrócimy uwagę na bardzo ciekawą uwagę Anety Prymaki-Oniszk na temat źródeł narracyjnych. Na podstawie ich lektury Autorka *Bieżeństwa* dostrzegała bardzo istotną rzecz — rozróżniła narrację szlachecką od chłopskiej. Jak pisała, „z licznych zachowanych relacji wynika, że w drogę udaje się zdecydowana większość szlachty i ziemian. Nie będą oni jednak określać się jako bieżeńcy — uciekinierzy. W listach, pamiętnikach, wspomnieniach mówią o sobie raczej: wygnańcy, którzy jadą pod przymusem niczym na zsyłkę. Swój los wpisują w narrację o prześladowaniach ze strony rosyjskiego zaborcy. Za to o chłopach, zwłaszcza białoruskich czy ukraińskich, chętnie piszą jako o dobrowolnych uciekinierach" (s. 61). Autorka przywołuje tutaj słowa ziemianina Glinki, który wspomina, że po zakończonych działaniach wojennych będzie chciał odzyskać część strat poniesionych w wyniku działań wojennych. Z jego relacji wynika, że cierpienie warstwy ziemiańskiej było bardziej dotkliwie niż chłopów, ponieważ, jak pisał, „chłop, jakkolwiek zniszczony i wygnany, po wojnie szybko odtworzy swą gospodarkę. Aby tylko sobie chatę sklecił, co sam własnoręcznie potrafi" (s. 62). Roszczeniowa postawa ziemianina stawia tę warstwę społeczną w złym świetle, gdyż lekceważy obecne u chłopów białoruskich z tego regionu poczucie zagrożenia. Co jeszcze istotne to fakt, że narracje polskich ziemian również chłopów polskich włączają do „swojego" doświadczenia, co by wskazywało, że mimo zniesienia ucisku pańszczyźnianego nadal traktowali oni chłopów jako swoją własność (s. 62). Trzeba tutaj zauważyć, że wśród uchodźców postawa wobec „panów" była bojowa. Autorka przywołuje sytuacje, jakie miały miejsce, gdy uchodźcy poszukiwali jedzenia w okolicznych wsiach. „Bieżeńcy (...) starają się oszczędzać majątki chłopskie, bez litości za to biorą od panów" (s. 92). Takie sytuacje były wodą na młyn dla liberalnych dzienników, które oskarżały uciekającą przed wojną ludność o nieposzanowanie własności prywatnej. Jednak publicyści zapominali, w jakiej sytuacji wówczas te osoby się znajdowały, a władze państwa rosyjskiego wcześniej nie musiały zmagać się z takim kryzysem (s. 93). Trzeba jednak tutaj oddać, że mimo że „panowie" traktowali chłopów z pogardą, to jednak tych „polskich" traktowano lepiej. Panowie poczuwali się do roli elity, mieli kontakty polityczne, dzięki czemu Stanisławowi Grabskiemu udało się utworzyć Komitet Obywatelski Opieki nad Wygnańcami z Królestwa Polskiego i w jakiś sposób pomóc polskim chłopom (s. 106), czego nie doświadczyli chłopi prawosławni, wśród których rosła niechęć wobec swoich duszpasterzy (s. 99-105).

Zdjęcia to kolejne bardzo ciekawe źródła historyczne, które wykorzystuje Autorka. Wiele zdjęć doskonale komponuje się z reporterską narracją

Anety Prymki-Oniszk. Jednak zdjęcia te nie są jedynie po to, by czytelnikowi bardziej zobrazować opowiadane przez Autorkę wydarzenia. Reporterka w wielu momentach opowiada o zdjęciach uchodźców, którym nie udało się uciec i ukrywali się przed wojskami niemieckimi w lasach. Nazwała ich „pechowcami", którzy zostali sfotografowani przez niemieckich fotografów. Co ciekawe wiele tych zdjęć służyło później do przedstawienia *bieżeństwa* na pocztówkach okolicznościowych (s. 67-68).

Książka opisuje całą drogę oraz powroty bieżeńców, ich życie w II Rzeczypospolitej oraz współczesnych potomków. Wiele informacji osobistych znajduje Autorka u potomków bieżeńców, którzy znaleźli stertę starych dokumentów dziadków (s. 230-231). Trzeba jednak powiedzieć, że Autorka przesadnie nie epatuje czytelników losem ówczesnych uchodźców. Z reporterską ciekawością przygląda się ich zachowaniu w różnych sytuacjach i stara się ich zrozumieć, by lepiej poznać sytuację, z jaką przyszło się im zmierzyć.

Reasumując treść omówienia, przychodzi mi refleksja dotycząca historii ziem polskich w XIX wieku. Możemy bowiem dostrzec, że to czasy mickiewiczowskiego pielgrzymstwa, czyli emigracji głównie po powstaniach narodowych w 1830 i 1863 roku. Emigracja, szczególnie ta popowstaniowa, została w narodowej historiografii poddana romantycznej mityzacji, stworzonej na potrzeby narodowej martyrologii jeszcze w XIX stuleciu, jak i później. Jednak na ziemiach polskich spotykamy nie tylko migracje popowstaniowe. *Bieżeństwo* nie jest też jedyną wydobywaną z marginesów historii opowieścią o przymusowej emigracji. Podobnie rzecz się ma z emigracją polskich chłopów do Stanów Zjednoczonych czy Żydów na Zachód, czy chaosem związanym z przymusowymi przesiedleniami, wypędzeniami i ucieczkami w trakcie i po II wojnie światowej. Książka Anety Prymaki-Oniszk to bardzo dobry materiał do pogłębiania studiów na temat przymusowych emigracji podczas I wojny światowej.

Wojciech Siudek
(Toruń)

Dawid Błaszczak, *Kapitał społeczny w sieci współpracy transgranicznej Białej Podlaskiej i Brześcia*, Państwowa Szkoła Wyższa im. Papieża Jana Pawła II w Białej Podlaskiej, Biała Podlaska 2016, ss. 256.

Problematyka związana z kapitałem społecznym budzi coraz większe zainteresowanie badaczy. Kwestie relacji społecznych, sieci powiązań, zaufania, norm, są istotne zarówno z perspektywy indywidualnej, jak i zbiorowej. Umiejętność współdziałania prowadzi bowiem do zaspokojenia szeregu potrzeb i pomnażania zasobów. Zdecydowanie zwiększa również skuteczność podejmowanych inicjatyw. W sposób szczególny sprzyja kształtowaniu społeczeństwa obywatelskiego. Prowadzi również do przełamywania różnorodnych barier. Słusznie więc zauważa Dawid Błaszczak, że „obserwacje i doświadczenia ostatnich kilkunastu lat pokazują, że zwiększenie efektywności gospodarowania podmiotów (firm, banków, państw, regionów, miast i innych) nie może mieć miejsca bez zaufania, wartości, norm, sieci powiązań, kontaktów, przepływów informacji, osób, wiedzy, a zatem tego, co określa się mianem kapitału społecznego. (...) Wskutek tego prowadzi do redukcji kosztów, ułatwia pomnażanie korzyści, podejmowanie rozbudowanych, skomplikowanych działań, których nie udałoby się zrealizować indywidualnie, scala współpracujące podmioty, tworząc tym samym fundament do dalszych zadań, do kooperacji, czy priorytetowej w ostatnim czasie koopetycji" (s. 10).

Problematyka kapitału społecznego nabiera szczególnego znaczenia na pograniczach. Kształtowany jest tam specyficzny typ relacji. Mamy do czynienia wówczas z kontaktami, kooperacją, czy konkurencją zarówno w ramach państwa, na którego terenie znajduje się dane terytorium, jak też bliskiej w odległości geograficznej przestrzeni należącej do innego kraju. Do tego dochodzi szereg podobieństw lub różnic związanych z przynależnością narodową, stosowanym językiem, dominującym wyznaniem. Wzajemne kontakty prowadzą również do wytworzenia nowej jakości związanej z czerpaniem doświadczenia z różnych obszarów życia społecznego podlegających odmiennym tendencjom. To może być także specyficzne doświadczenie wielokulturowości. Zawsze jednak granica stanowi pewien determinant.

Bardzo trafnie Autor wybrał teren badawczy. Dwa miasta, Białą Podlaską i Brześć, łączą liczne wydarzenia historyczne. Przede wszystkim przez wiele wieków ośrodki te znajdowały się w jednym organizmie państwowym. Dotyczy to Rzeczpospolitej Obojga Narodów, okresu rozbiorów, kiedy to znalazły się w Imperium Rosyjskim (z wyjątkiem lat 1795-1815, kiedy

to Biała Podlaska została włączona do Austrii, a następnie funkcjonowała w Księstwie Warszawskim), po I wojnie światowej zaś były w granicach II Rzeczypospolitej. Zasadnicze zmiany nastąpiły w wyniku II wojny światowej, kiedy to Biała Podlaska pozostała w granicach Polski, a Brześć został włączony do Związku Socjalistycznych Republik Radzieckich, a w jego ramach przynależał do Białoruskiej Socjalistycznej Republiki Radzieckiej. Związana z tym była nie tylko istotna zmiana społeczno-polityczna, ale również ludnościowa. Wojna przyniosła duże straty demograficzne. Po jej zakończeniu znaczna część ludności polskiej wyjechała w nowe granice kraju. Na ich miejsce przyjeżdżali mieszkańcy innych regionów ZSRR. Niemniej pozostała świadomość wspólnych wielowiekowych więzów o różnorodnym charakterze. Przy czym władze radzieckie dążyły do izolacji swego terytorium. Ograniczano kontakty indywidualne, oficjalne zaś formalizowano w ramach „współzawodnictwa pracy socjalistycznej" i „internacjonalizmu". Polityka „pieriestrojki" zapoczątkowana w połowie lat osiemdziesiątych przez Michaiła Gorbaczowa doprowadziła najpierw do zniesienia szeregu ograniczeń, w tym dotyczących kontaktów ludności ponad granicami, a następnie rozpadu ZSRR. Wiązało się to z uzyskaniem niepodległości przez Republikę Białoruś i suwerennym kształtowaniem systemu społeczno-politycznego. Demokratyzacja, uproszczenie przekraczania granicy w obydwie strony, doprowadziło do odnowienia dawnych kontaktów i powstania zupełnie nowych sieci, które uzyskały charakter formalny jak też nieformalny.

Autor przeprowadził socjologiczną analizę kapitału społecznego. Dokonał tego na przykładzie dość specyficznego obszaru terenów przygranicznych. Musiał więc uwzględnić różnorodne konteksty społeczne, polityczne, kulturowe i gospodarcze. Ta niejednorodność wpływa istotnie na zakres budowania sieci kontaktów. Rozważania Autora mają wyraźnie charakter teoretyczno-empiryczny. Przede wszystkim oparł się na komputerowej analizie sieci społecznych. Ponadto przeprowadził analizę dokumentów, wykonał szereg wywiadów i dokonał kwerendy literatury przedmiotu. Jak stwierdza Autor, podstawowym celem było „ukazanie fragmentu (wycinka) interpretacji i operacjonalizacji społecznego kapitału oraz jego komponentów w postaci potencjalnych bądź rzeczywistych zasobów zgromadzonych dzięki sieciom kontaktów i powiązań (na poziomie współpracy transgranicznej). (...) Równie istotne znaczenie ma prezentacja kapitału społecznego w odniesieniu do badań nad ośrodkami miejskimi i społecznościami lokalnymi, zamieszkującymi obszar przygraniczny, będący poniekąd regionem peryferyjnym z zarazem zewnętrzną granicą Unii Europejskiej. Związane jest z tym poszukiwanie właściwej drogi rozwoju, czynników rozwojowych przyczyniających się do skutecznej rywalizacji

i konkurowania, jakie zaobserwować można między dzisiejszymi regionami” (s. 17). W literaturze, pomimo coraz większego zainteresowania badaczy, występuje wyraźny deficyt opracowań na ten temat. Dobrze więc, iż problematykę tę podjął Autor, który jako mieszkaniec badanego obszaru z autopsji zna specyfikę podejmowanych zagadnień.

